БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. Ў ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. ЯК ШТОМЕСЯЧНІК. З 1 САКАВІКА 1996 Г. ВЫХОДЗІЦЬ Ў МЕНСКУ

Сяржук Сокалаў

***

Васілю Быкаву

Падумаў я, што ўсё — мана.
Падумаў: мёртвым забалела
І маўзалейная труна
Аддасьць зямлі пустое цела.

І вернуцца ў жыцьцё праз боль
Мільёны мёртвых — я падумаў —
І раны ўдзячна прымуць соль
І будзе лад на месцы тлуму.

Я крыкнуў: До ўжо сьлёзы ліць!
Зірніце, людзі, колькі нас тут!
Ды толькі мёртвым не баліць.
Ідуць памерлыя у наступ.

Нясуць крывавыя сьцягі,
Жывых у царства сьмерці клічуць,
Ім не баліць... І ран ня лічуць
Камуністычныя багі.
ы
Сьпявай жа, муза, суд вяршы,
Збудзі жывых, якія ў стане
Праз жураўліны крык душы
Дажыць да новага сьвітаньня.

15-16 чэрвеня 1994 г., Нью-Ёрк

НАРОДНАЯ КНІГА

ВАСІЛЬ БЫКАЎ. СЬЦЯНА

Пасьля неаднаразовых прапановаў нашых чытачоў і з ласкавае згоды народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава выдавецтва «Наша Ніва» прыступае да выданьня новае кнігі прозы В.Быкава «Сьцяна». Як вядома, гэтае выданьне рыхтавалася да выхаду ў дзяржаўным выдавецтве, але сёньняшні палітычны рэжым спыніў гэтую працу. Мы далёкія ад думкі, што беларускае слова можа ў прынцыпе існаваць толькі за дзяржаўныя падачкі, і мяркуем, што паміж творамі народнага пісьменьніка, як, зрэшты, і іншых таленавітых літаратараў, з аднаго боку, і чытачом — з другога, ня мусяць паўставаць нераадольныя бар'еры чынавенскае прыхамаці. Кнігі лепшых беларускіх літаратараў будуць выходзіць у такім аб'ёме і датуль, колькі і дакуль у гэтых кніг будзе чытачоў. Гэтак нарадзілася ідэя стварыць прэцэдэнт Народнае Кнігі. Мы ня ставім на мэце знайсьці спонсараў або зрабіць прыгожы жэст дабрачыннасьці. Мы імкнемся, насуперак цынічнаму да нашае мовы й культуры рэжыму, сьцьвердзіць, што беларускія кнігі мусяць выходзіць за грошы і дзеля патрэбаў беларускага грамадзтва. Разам з тым, мы спадзяемся на кансалідацыйны эфэкт Народнае Кнігі, якая мусіць умацаваць нашае грамадзтва і дадаць яму сілы духу.

Нагадаем, што той, хто падпісваецца на кнігі «НН» да іх выхаду ў сьвет, аплочвае толькі сабекошт і кошт перасылкі, тады як гатовая кніга з усімі гандлёвымі нацэнкамі будзе каштаваць значна даражэй.

Кніга «Сьцяна» складаецца з празаічных твораў Васіля Быкава апошніх гадоў, яе аб'ём — 17 аркушаў. Мяркуецца, што яна выйдзе ў сьвет у канцы кастрычніка — пачатку лістапада сёлета.

Умовы падпіскі друкуюцца на старонцы 12.

Выдавецкая група БГФ «Наша Ніва»

НАША НІВА

№ 29-30 (91) 29 ВЕРАСЬНЯ 1997 г.

«Я не пачвара, я пісьменьнік...»

Эсэ на старонцы 3.

Экспэдыцыя «НН» у Полацак да сяброў СБП

На старонках 4-5.

Артыкул пра Міхася Раманюка

На старонцы 8.

Цудоўная фартуна шляхціца Валіцкага

Гістарычны артыкул на старонках 18-19.

Пра «маральнасьць» схаванага забойства

На старонцы 7.

Кароткая аповесьць пра сяброўства

Старонкі 20-21.

Восеньскія цэзуры

Яна прыйшла з доўгачаканымі дажджамі і прахалодаю. Стала лягчэй дыхаць у перапоўненых камэрах цэнтралаў. Жоўты лісток выпадкова заляцеў у прагулачны дворык «амэрыканкі».

Жоўтыя набойчыкі аўтаматычнай дробнакалібэркі прыгожа рассыпаліся на ільняным абрусе і выклікаюць павагу. Жоўты кавалак толу дае надзею. Днямі прыяжджае жанчына. Ідзі на Камароўку, купі ёй салодкага ў сотах. Ты бацька і муж ёй. Напоўні радасьцю яе верасьнёвае цела. Нашапчы родных словаў на вушка. Не забывай кахаючы: жоўтая раса помсты — ворагу! Мёд любові — тваёй беларускай жанчыне!

Восень. Усё адноснае, дваякае, амбівалентнае. Толькі Радзіма ў адзіночным ліку. Толькі яе ні памножыць, ні разьдзяліць.

Восень. Выясьняюцца гарызонты, праступаюць фігуры калябарантаў. Стаяньне на чатырох стала звычкай. Хвіга ў кішэні працёрла дзірку. Студэнты паехалі на бульбу. Горад амаладзіўся на некалькі дзён ды ізноў апэнсіянэрыўся.

Восень. Загарэлыя твары. Бела-чырвонае шэсьце туляецца задворкамі. Абрыдлыя прамовы ўчарашніх. Электарат шукае лідэра. Моладзь пайшла піць піва ў Траецкае.

Восень — творчая, натхняльная, тужліва-разьвітальная пара, пара пачаткаў новага. Пахне гародамі і жанчынай. Жанчыны ізноў таямнічыя, ізноў яны апранулі чорныя панчохі і цёплыя гетры. Так жаданыя вымцы схаваліся пад швэдрамі, гольфамі, плашчыкамі, куртачкамі. Ды ці табе ня даць, што схаванае ня ёсьць адсутным. Усё на месцы і толькі чакае моманту адкрыцьця і ўвазнаньня. Дрэмяць нашыя жаданьні, шораз мацней і мацней ускалыхваецца воля да спраўджаньня нашае мэты. І пагоня на Грунвальд не ашчаджае імпэту. І чысьціня бела-чырвоных колераў, як чысьціня крыві Парадзіхі, — сьлепіць варожыя зрокі...

Восень — пара аплікацыяў. Чорныя бабовыя струкі на зялёных сьцяблінах — як чорныя душкі акупантаў на нашых вітальных прасторах. Фіялетавыя качаны капусты, апанаваныя жарлівым вусенем, нагадваюць Галоўнага Вусеня з Галоўным Качаном у канюшыне, якая «является основной кормовой культурой в животноводстве»*.

Пералётныя птушкі адляцелі ў вырай. Тутэйшыя людзі застаюцца тут. Пахне здаровым гноем з хлявоў, бульбоўнікам, ядкой ячменнай саломай, садам... Толькі слова пісьменьнік у нас аддае грамадзкай прыбіральняй. Нядаўна ізноў шыбанула ў нос гэтым «водарам» — нейкая Т.Б. пусьціла сьлёзку ў абарону свайго карытца...

Тымчасам восеньскі халадок прымушае думаць пра вогнішча, вогнішча нагадвае табе, што ты мужчына...

Восень. Файна! Люба! У судах узрываюцца бомбы. Чаго яшчэ трэба, каб акупанты і калябарацыя палюбілі гэтую лістападаўскую пару?

Славамір Адамовіч

**З кніжкі «Герб и флаг Белорусской державы», стар. 57.*

КАНЕЦ СЭЗОНУ ФЭЕРВЭРКАЎ

Нікалі раней, здаецца мне, нашае неба гэтак часта не расквечвалася агнямі салютаў, як прамінулым летам. Над Менскам, над Пінскам, над Гомелем расквіталі пераможныя юбілейныя агні. Розьніца была толькі ў маштабах ды працягласьці тых вогнішчаў па-над нашымі галовамі. Унізе я розьніцы не заўважыў. Паўсюль была адна й тая ж замалёўка: фальклёрныя марафоны на стадыёнах зь нязьменнаю «Цвяты збірала», гістарычныя прамовы штатных кіраўнікоў зь «літоўскім гнётам» ды «татарскімі нашэсьцьвіямі», а пасьля — натоўпы людзей на перакрытых для транспарту вуліцах. Людзей, што, стаміўшыся ад бясспраўя, выйшлі на сьвята, як на працу, своечасова і ў адпаведных вопратках. Ня надта задумваючыся над тым — што яны сьвяткуюць, ня надта засмучаючыся тым, што піва й марожанае ператварылася ў праблему выстаяць, ня надта смуткуючы з тае нагоды, што ўсяго пабачыць ім не давялося. Адзінае, што агні ў нябёсах былі бачная адусюль. І людзі задзіралі галовы ўгору й прагна чакалі новых стрэлаў. Давяршалі гуляньні незаплянаваныя халодныя вятры, што патроху вымяталі няшчасны п'яны люд з адрапараваных вуліц...

Калі з рэпрадуктараў папаўзла мэлёдыя бэсэсэраўскага гімну, забіты да адказу Цэнтральны стадыён 855-гадовага горада-юбіляра, апраўляючы штаны й спадніцы, азіраючыся на суседзяў, ленавата ўстаў. Я застаўся сядзець. Я на імгненьне апынуўся ў яме са сьпінаў, каленяў ды незадаволеных поглядаў. Я нават запаліў дзеля большай дэманстрацыі сваёй раскаванасьці. Хоць насамрэч мне сапраўды не было патрэбы ўзьнімацца. А ім гэта было трэба, таму што трэба. Седзячы ў гэтай яме, я нарэшце зразумеў, у чым была й ёсьць наша слабасьць. Успрыняўшы ў 91-м зьмену дзяржаўных сымбаляў як зьмену дзяржавы, мы забыліся на гімн. На тое, што павінна зьмяняцца ў першую чаргу. Зьмяняцца без дазволаў і зацьверджаньняў, а на патрэбу душы. Калі б у свой час такая патрэба была, не было б сёньняшняй ямы. А пакуль над нашымі каленамі нашых сьвятаў «пануе цішыня», якая зрэдчас перапыняецца скандаваньнямі лёзунгаў на адрас чалавека, што хутка зусім перастане заўважаць нашыя сьвяты на адным і тым жа маршруце. Той час, які мы губляем у пошуках сапраўднага лідэра, павінен ісьці на развучваньне словаў сапраўднага гімну. Не дзеля заўтрашняга сьвята на нашай вуліцы...

Калі яны пасялі, каб далей сузіраць працэс сьвяткаваньня, я пакінуў стадыён. Я зусім ня меў кепскага настрою. Я нават гатовы быў зьлёгку пранікнуцца піэтэтам да галоўнага масавіказацейніка (каго, дарэчы, так чакалі на юбілейных урачыстасьцях, і хто сваім незьяўленьнем сарваў галоўны атракцыён). Вось каму сапраўды патрэбная гэтая хваля сьвятаў. На якія нельга скупіцца ніякімі сродкамі. Каб тыя фэерыэркі ўзгадваліся як мага часьцей і як мага даўжэй. Беларускае лета скончылася. Наперадзе расейская зіма...

Зьміцер Бартосік

Здымак Дзьвіса Нутаўтаса

СВАЯ ВЕРА

Здымак Алены Адамчык

Патрыярх Кіеўскі і Ўсёй Русі-Ўкраіны Філарэт і Мітрапаліт Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы Ізяслаў 9 верасьня ў Кіеве заключылі дамову «Аб прынцыпах узаемаадносінаў паміж Украінскаю й Беларускаю Праваслаўнымі Цэрквамі». Паводле дамовы ўкраінцы бяруцца самым актыўным чынам дапамагаць беларусам у справе аднаўленьня прыходаў БАПЦ у Беларусі.

БАПЦ утварылася ў 1924 г., была зьнішчаная камуністамі ў 1934-м, аднаўлялася ў 1942-44 г., але канчаткова адрадзілася ў 1948 годзе ўжо на Захадзе. Існуе ў розных краінах сьвету, анякуецца невялікай колькасьцю праваслаўных беларусаў-эмігрантаў. Але сёньня беларускае праваслаўе вяртаецца на Радзіму...

Першая Літоўская Мітраполія, якая, як мяркуюць, прызначалася для Полацкай і Тураўскай епархіяў, была створаная па просьбу вялікага князя Віценя праз ухваленьне Царгародзкага Патрыярха паміж 1316-1320 гадамі, але прайснавала нядоўга. Таму праваслаўнае жыцьцё было адзіным для жыхароў ВКЛ над юрысдыкцыяй Кіеўскай Мітраполіі. У 1416 годзе на Саборы Кіеўскае Мітраполіі былі сфармуляваныя й прынятыя прынцыпы, паводле якіх Кіеўская мітраполія фактычна ператваралася ў аўтакефальную царкву, то бок захоўвала духоўную, але не палітычную падначаленасьць Канстанцінопальскаму Патрыярху. Гэты акт быў зьдзейсьнены гэтак, як большасьць падобных лёсавызначальных для праваслаўных цэркваў сярэднявечча чынаў — насуперак Канстанцінопалю.

Незалежнасьць беларускага і ўкраінскага праваслаўя была зьнішчаная Андрусаўскім перамір'ем 1667 году, паводле якога праваслаўныя жыхары ВКЛ перайшлі пад юрысдыкцыю Масквы...

Сёньня Расейская Праваслаўная Царква ў Беларусі — апарат, які няўхільна набліжаецца да «заканчэньня тэрміну выкарыстаньня». Варта ў нядзелю наведаць бажніцы розных хрысьціянскіх канфэсіяў, і вы пераканаецеся, што большасьць моладзі — у каталікоў, і, асабліва, ў пэапратэстантаў. Народжаныя ў часы краху рэлігіі «сацыялізму», маладыя людзі зьвяртаюцца да канфэсійных «меншасьцяў» Беларусі ў пошуках Культуры, як каталікі, альбо беспасярэдніх (мінімум культу) зносінаў з Богам, як пэапратэстанты... Шукаюць тое, што ня можа даць РПЦ, шукаюць СВАЁ.

Ярчэй за ўсё тэндэнцыю расчараваньня ў РПЦ ілюструе канфэсійная мапа Берасьцейшчыны, краі, які найбольш прынцыпова адстойваў праваслаўе ў часы актыўнага акаталічваньня Заходняе Беларусі. На сёньняшні дзень на Берасьцейшчыне колькасьць пэапратэстанцкіх прыходаў перавысіла колькасьць праваслаўных. Увогуле, паводле прагнозаў, існуе верагоднасьць таго, што ў бліжэйшае дзесяцігодзьдзе ў Беларусі пэапратэстанты стануцца дамінуючай канфэсійнай плыняй...

Яшчэ адзін прыклад — фэномэн паўстаньня ўніяцкіх грамадаў у Беларусі. На пачатку 90-х у Менску «рантоўна» ўзьнікла ўніяцкая грамада, якая складалася больш чым зь дзьвюх соцень людзей, чый сярэдні ўзрост не перавышаў трыццаці гадоў. Насамрэч, грэка-каталіцтва, якое на працягу паўтара стагодзьдзя на зьнішчэньні йспавала ў краіне адно ў выглядзе «застылай музыкі» сапсаваных перабудовамі бажніцаў, адрадзілася ня больш рантоўна, чым ідэя незалежнай беларускай Дзяржавы. Маладыя беларусы абралі грэка-каталіцтва як БЕЛАРУСКУЮ царкву...

«Адзіная Дзяржава — адзіная Нацыя — адзіная Царква»... Адзіная магчымасьць пераадолець разьдзёртасьць беларусаў паміж рознымі канфэсіямі — стварыць унікальную царкву, накшталт Англіканства. Гэтая думка, якая ніколі не зьнікала ў беларускіх інтэлектуальных колах, успрымалася як жаданая неверагоднасьць. Сёньня ў Беларусі існуе тры прыходы царквы, ідэю якой можна было б акрэсьліць як Беларусіянства.

У Менску, Сёмкавай Гары (пад Менскам), і ў Лідзе больш за трыццаць тысячаў прыхаджанаў спавядаюць хрысьціянства, сфармуляванае айцом Пятром Гушчам. Царква завецца Беларускай Аўтакефальнай: праваслаўныя пастуляты, максымальнае спрашчэньне культу паводле пэапратэстанцкіх прынцыпаў, фармальныя элемэнты каталіцызму (Гушча падпісваецца «дэканам»), беларуская мова багаслужбы й рэлігійнага жыцьця ўвогуле. Да існых трох парафіяў неўзабаве далучацца новыя.

На сустрэчы Мітрапаліта Ізяслава з ініцыятыўнай групай па стварэньні прыходаў БАПЦ у Беларусі, якая адбылася адразу пасьля перамоваў з Патрыярхам УПЦ Філарэтам, найбольш абмяркоўвалася два пытаньні — якім чынам найлепш арганізаваць вяртаньне БАПЦ на Радзіму, аж да ўтварэньня ўласнага Патрыярхату, і як супыніць «наступ Гушчы»? Рэч у тым, што, выкарыстоўваючы для сваёй царквы назву «Праваслаўная Аўтакефальная», згодна з праваслаўнымі канонамі, Гушча не зьяўляецца рукапакладзеным, то бок кананічным сьвятаром.

Ці хвалюе гэтая акалічнасьць прыхаджанаў Гушчы? Не. Гэтаксама, як менскіх уніятаў — факт зьнішчэньня грэка-каталіцкай традыцыі, як не хвалюе «некананічнасьць» тарашкевіцы, як не хвалявала Багушэвіча «няіснасьць» беларускай мовы... Людзі ствараюць сваю НЕКАНАНІЧНУЮ царкву, у якой увасабляюць сваю «некананічную» веру.

... Беларуская Аўтакефальная Праваслаўная Царква вяртаецца на Радзіму. Вяртаецца туды, дзе яе прагнуць і чакаюць. Учора я спытаўся ў сябра, у якую веру ён хрысьціў дзіцёнка. Ён адказаў — у сваю.

Сяргей Квяткоўскі

ПОШТА

Добры дзень, шаноўная «Наша Ніва»!

Усе мары патрыёта канчаткова ўвасабляюцца ў тыповым вобразе: «Калі беларускую мову можна будзе чуць на вуліцах местаў». Інакш кажучы, мэта будзе дасягнута, калі беларуская мова стануцца звычайным сродкам зносінаў абываталяў. Але апошнім часам мне думаецца, што сапраўднаму беларускаму абываталю для поўнай беларускасьці мовы будзе мала. Яму будзе не стаць гісторыі — ды ня той, што з князямі, соймамі, бітвамі ды іншай палітычнай нудотай, — а з гісторыяй простых абывацельскіх рэчаў ды зьяваў. Вось, напрыклад, усе ведаюць пра паходжаньне бульбы, тытуню і сьвята Новы Год, але пра паходжаньне ў Расеі. І, жывучы ў Беларусі, шмат хто кажа: «Тытунь прыйшоў да нас, калі цар Пётр І загадаў» і г.д. Глупства нейкае. Для поўнай беларускасьці мала ведаць палітычную гісторыю Радзімы, размаўляць па-беларуску ды падтрымліваць патрыятычны рух. Трэба, каб беларускасьць рабілася болей абывацельскай зьявай, тымчасам як сёньня яна нашмат болей успрымаецца як зьява палітычная.

Возьмем такую зусім непалітычную, цалкам абывацельскую газэту «Гастраном». Ейная непалітычнасьць відавочная: на «шапцы» напісана «Продовольственная газета», а дэвіз такі: «Политики приходят и уходят, а кушать хочется всегда!» Газэта проста-такі ўвасабляе большасьць беларускага грамадзтва, бо заснаваная на расейскай ня толькі мове, але й культуры з гісторыяй. У адрозьненьне ад нас, патрыётаў, абываталі (чытай: расейскамоўныя) зусім нармальна чытаюць сказы ў газэце накшталт: «Арбуз — попал к нам от татар из низовья Волги, но уже в 15 в. его умели выращивать в Кремлёвских теплицах» (Адкуль «у нас» Крэмль? А калі яго няма ў нас, прычым тут ён?) Альбо пра правілы этыкету: «А как обстояли в этом плане дела у наших предков? Первое письменное упоминание о правилах этикета на Руси было зафиксировано только в 16 в. в литературном произведении «Домострой». І далей: «Следующий шаг в укреплении культурных и нравственных ценностей сделал Петр Великий... (Правила поведения в быту) были сформулированы в книге «Юности честное зерцало», изданной в 1717 году» (Хоць у Беларусі была свая «Навука прыстойнасьці брацкай», пра якую згадваў У.Арлоў у «Таямніцах полацкай гісторыі», а пашым царом Пётр ня быў, прынамсі, таму што не дажыў да часоў, калі «панай» дзяржавай сталася Расейская імпэрыя). І гэтак у кожным артыкуле, у кожным нумары. Ажно пачынаеш сумнявацца: ці то «мы» — расейцы, ці то газэта расейская. Такая ўжо сутнасьць беларускай абывацельскай большасьці — яна выхаваная на расейшчыне і фактычна паразытуе на тым, што стварылі суседзі. Але ж нам — беларусам, патрыётам падобныя «гісторыі» не нясуць аніякай карыснай інфармацыі. Мы, як патрыёты, ня мусім ня мець сваёй гісторыі рэчаў ды зьяваў і паразытаваць на чужой расейшчыне.

У кожнай дзяржаве (і ня толькі ў Расеі) праяўляецца клопат, каб прасьвятліць свой народ наконт рэчаў ды зьяваў штодзённасьці ў ягонай гісторыі. У іх усё напрацаванае, і вось гісторыі пра ўсякую ўсячыну можна прачытаць у тым жа «Гастраноме», у «Знамени юности» пад рубрыкай «Энциклопедия вещей», ці пачуць у «Радио-рокс» у рубрыцы «Воображала» (ці ёсьць яна яшчэ?) і шмат дзе яшчэ. А што маем мы? Амаль нічога! Здзіўляецеся: няўжо ніхто са сьвядомых беларусаў не капаўся ў гістарычных паперах, як не паленаваліся зрабіць гэта прадстаўнікі іншых народаў для сваіх землякоў. Патрыятызм не дазваляе патрыётам задавальняцца расейскай (палітычнай) гісторыяй у якасьці ведаў «пра нас». Таму яны і чытаюць падручнікі гісторыі ды патрыятычныя газэты, каб ведаць сапраўды «нашую» гісторыю. Патрыёты вывучаюць гісторыю, бо ня хочуць жыць, ня ведаючы нічога пра зямлю, на якой жывуць; каб мець уласны погляд (які мусіць быць у кожнага народа) на зьявы ў гісторыю ды сучаснасьці, на іншыя народы. Патрыёты ганарацца, што маюць уласную гісторыю, бо хочуць атаясамляць сябе ў гісторыі менавіта са сваімі продкамі — зь беларусамі, а не з расейцамі. Дык няўжо патрыёты будуць так сьвядома атаясамляць сябе ў палітычнай гісторыі зь беларусамі, а ў пабытовай — з расейцамі? Такое атаесамленьне мусіць абураць патрыётаў, бо яно — вынік ці то невуцтва, ці то непатрыятызму, і спрычыняваць іх да пошуку сваёй, беларускай гісторыі.

Праўда, тое-сёе зь беларускай гісторыі рэчаў ды зьяваў штодзённасьці можна знайсьці. Шмат гэтага ў згаданага Арлова — у «Таямніцах полацкай гісторыі», у газэтных артыкулах. Тое-сёе — у «Перуновым цяпельцы» Станіслава Цярохіна. Некалькі асобных артыкулаў іншых аўтараў... І, само сабою зразумела, артыкулы з адмысловай рубрыкі «Гісторыя штодзённасьці», якая раней была ў «НН». Што зь ёю сталася, ня ведаю, але ідэя была вельмі карысная, і мой ліст — толькі яе працяг.

Трэба аднавіць (калі лічыць прэцэдэнт стварэньня гісторыі штодзённасьці створаным у выг-

«Я НЕ ПАЧВАРА, Я ПІСЬМЕНЬНІК...»

Былы лідэр басьнійскіх сэрбаў Радаван Караджыч дае інтэрвію нямецкаму журналісту. Абвінавачанага ў ваенных злачынствах прэзыдэнта чакае міжнародны суд у Гаазе. Застаецца толькі яго захапіць. Чаму не захапілі дагэтуль? «Ня думаю, каб мяне там сапраўды хацелі бачыць, — адказвае Караджыч. — Бо разумеюць, што я буду выступаць ня ў якасьці абвінавачанага, а ў якасьці абвінаваўцы». Маўляў, Караджыч пакажа ўсяму сьвету дакумэнты, паводле якіх масавыя забойствы ўчынялі ня сэрбы, а мусульмане.

Караджыч вываротлівы, склізкі суразмоўца. Самім стылем гутаркі ён надзвычай падобны да ППРБ. Але вось нарэшце фраза, якая канчаткова спыняе маю ўвагу: «Людзі, якія нічога пра мяне ня ведаюць, паводзяць сябе так, быццам я нейкая пачвара. Я не пачвара, я пісьменьнік».

Пісьменьнік — кожны, хто запісвае свае думкі, шукаючы сатысфакцыі і самаапраўданьня. Вынікі розныя — у залежнасьці ад таго, хто што зрабіў і чаго ад сябе патрабуе. Тым часам вялікія злачынцы знаходзяць для самаапраўданьня найбольш моцныя і трапныя словы. «Я не пачвара, я пісьменьнік».

Безадносна да асобы Караджыча, у ягоных словах мне бачыцца магчымая разьвязка таго ўнутранага канфлікту, які перасьледуе беларускіх пісьменькаў, завіслых паміж палітыкай і культурай.

Але спачатку я паспрабую пераказаць зьмест гэтага ўнутранага канфлікту.

Вось прыязджаюць да вас замежныя карэспандэнты. Сутнасьць іхных пытаньняў зводзіцца да наступнага: «Раскажыце, які пачварны дыктатар Лукашэнка і чаму яго падтрымлівае народ». Вы красамоўствуеце, а яны аж прыцмокваюць ад задавальненьня. Недзе ў глыбіні душы вы разумееце, што сталіся ўдзельнікам гульні, дзе кожны адпрацоўвае свае грошы або імідж. Мы ўсе, незалежныя журналісты, паступова ператвараем ганьбаваньне Лукашэнкі для заходніх масмэдыяў і фондаў у даходны артыкул уласных бюджэтаў. Мы ходзім на мітынгі і ствараем «карцінку», якая мусіць абысьці тэлевізіі сьвету. Я думаю, ці адпавядае гэта ўсё такому прызабытаму прынцыпу як — нашы нацыянальныя інтарэсы? Бог зь ім, з Лукашэнкам, але ж мы прадстаўляем Беларусь. І ганьбаваньне ЯГО ўсё часьцей ператвараецца ў прыніжэньне ЯЕ й яе народа. Тым больш для замежнага тэлегледача гэта зазвычай адно й тое. Як, скажам, для большасьці нашае публікі Радаван Караджыч асацыюецца з усімі басьнійскімі сэрбамі і з самою Сэрбіяй.

Мы заклікаем Захад стварыць нам інфармацыйную блякаду, не даваць крэдытаў, не прымаць нас у міжнародныя арганізацыі і неяк хварабліва цешымся, калі ў выніку нашых захадаў амэрыканскі прэс-сакратар разразіцца гнеўным сьпічом на адрас Беларусі.

Магчыма, усё так і мусіць быць, і Захад сапраўды нам дапаможа. Але ёсьць ва ўсім гэтым вельмі тонкая мяжа, якую мы не разрозьніваем яшчэ нашым зрокам. Мяжа паміж прагматычным уласным выжываньнем і прывіднай будучыняй краіны, паміж палітыкай і культурай.

... Мы стаім у Вільні ў пікеце з пратэстамі супраць Лукашэнкі. Міма праяжджаюць картэжы кіраўнікоў краінаў Эўропы, у тым ліку і ППРБ. Вакол Літва і літоўцы, а таксама немцы, фіны, датчане. Усім па вялікім рахунку нашыя праблемы цікавыя толькі як пікантнасьць. Уявіце сабе такую ж сытуацыю ў дэмакратычным Менску: кучку літоўцаў з плякатамі супраць Бразаўскаса, і вам стануць зразумелыя мае пачуцьці. Няпроста нам было б зь імі салідарызавацца і падзяліць іхны гнеў.

Але вось да нашага віленскага пікету падыходзіць чысьценькі пажылы чалавек. Прадстаўляецца ўкраінскім праваабаронцам. Малайцы, хлопцы, — кажа ён. — Слухайце анэкдот. Ляцяць у самалёце Клінтан, Шырак і Кучма. Тут самалёт падае і разьбіваецца, усе гінуць. Пытаньне: для якой краіны такая катастрофа будзе найвялікшай нацыянальнай трагедыяй. Адказ: для Беларусі. Чаму? Таму што ў самалёце не было Лукашэнкі.

Сьмяюцца чамусьці ня хочацца.

Наступная здымае пікет экіпа фінскас тэлевізіі. Пытаньне карэспандэнта: як вы, беларусы Літвы, плянуеце зьвяргаць Лукашэнку. (Напэўна яны лічаць, што нам можна задаваць любыя, самыя абсурдныя пытаньні.) Я хацеў адказаць: з дапамогай Фінляндыі. Але стрымаўся. І паўтарыў заклінаньне: «Я не пачвара, я пісьменьнік».

... Калісьці мы марылі пра тое, што напішам кнігі, якія будуць перакладзеныя на дваццаць моваў і прынясуць славу нашай Беларусі. А сёньня мы настолькі палоненыя вобразам ППРБ, што адзін мой знаёмы літаратар, сядаючы пісаць апавяданьне пра Скарыну, ужо ў другім абзацы выводзіць прозьвішча Лукашэнкі. Іншы паэт, мераючы крокамі працоўны пакой, нібы зьвер у клетцы, паўтарае: «Ну не магу, не магу, не магу... Як толькі падумаю пра яго — не магу». Нібыта ўся рэчаіснасьць сфакусавалася ў гэтым прозьвішчы. Наіўна казаць, што нехта нас прымусіў да такога самазьбядненьня. Магчыма, проста выслаўляцца ўбоствам рэжыму і электарату нашмат лягчэй і матэрыяльна выгадней, чым напісаць кнігу, якая заваюе розумы і сэрцы таго ж электарату.

Калега прыгадаў, як у часы найбольшага карабахскага канфлікту ён спытаўся ў знаёмых азэрбайджанскіх інтэлігентаў, маўляў, як яны ставяцца да армянаў. Адказ быў такі: іх проста не павінна быць.

У нас жа ўся падобная энэргія сканцэнтравалася на адной асобе — тым, хто сканцэнтраваў у сваіх руках усю ўладу. Два гады таму быў напісаны верш «Убей президента». За гэты час я сто разоў чуў у менскіх кулюарах манілаўскія пляны — як гэта зрабіць. А сёньня ўжо мае сябры, тры літоўцы і два літоўскія жыды, шчыра прагнучы нечым дапамагчы мне — беларускаму нацыяналісту, у адкрытай віленскай кавярні за куфлем піва з імпэтам паляўнічых разьвіваюць гэты фантастычны плян. Удзельнічаць ня хочацца. Для беларусаў я яшчэ магу растлумачыць такое жаданьне падсьвядомай патрэбаю забіць саўка, прычым забіць у сабе. А для чужаземца тут акрамя спартовага азарту нічога няма.

Дарэчы, наша інтэлігенцыя ахватней забівае ў сабе пісьменьніка, а не пачвару, абіраючы тое, што прасьцей.

... Няма ніякага сумневу ва ўбостве рэжыму, як і ў тым, што гэта НАШ рэжым. Калі б мы ўсе разам ужылі ўсе свае магчымасьці і даказалі, што гэта сапраўды маскоўскія чэкісты выдалі кожнаму, хто галасаваў за Лукашэнку, па бутэльцы піва, тады народны ўлюбёнец з такой самай хуткасьцю, як узьляцеў, абрынуўся б у нябыт. Але мы нічога не даказалі. Таму гэта наш рэжым. Антыбеларускі, хамскі, рэтраградны. ППРБ — зусім не заморскі дыктатар, а самы сапраўдны дырэктар беларускага саўгасу — звышпазнавальны.

Як казалі некалі камсамольцы, адмаўляеш — прапануй. На шалях вагаў нашай палітычнай незадаволенасьці з аднаго боку рэсаветызацыя, узурпацыя ўлады, мафіёзна-зэкаўскія дачыненьні — тое, што характарызуе кіраўнічы рэжым, з другога боку —няздатнасьць сабрацца ў моцную палітычную сілу, выпрацаваць папулярную нацыянальную ідэалёгію, вылучыць сапраўдных лідэраў — тое, што характарызуе апазыцыю. Ці ведаем мы альтэрнатыву — хоць аднаго палітыка, які б нас «амаль» задаволіў? Прызнаюся, я ня ведаю. У старажытнасьці ў такіх выпадках апазыцыя змагалася за трон, каб прывесьці на яго якога-небудзь заморскага валадара. Для Беларусі гэта й сёньня выглядае паратункам. Але, на жаль, зьмяніўся сьвет вакол нас і пануюць зусім іншыя прававыя стандарты.

Сваёй жа альтэрнатывы ў нас няма. Як няма і высокага неба ідэалу. Зацёртыя словы «дыктатура» і «незалежнасьць» важаць ужо прыблізна аднолькава, г.зн. нічога ня важаць. Пляны пабудовы будучае Беларусі адкладзеныя да моманту вызваленьня ад Лукашэнкі, якога проста не павінна быць.

Гэтак паступова я даводжу сваю незадаволенасьць амаль да прызнаньня эвалюцыйнае абгрунтаванасьці ўсяго, што адбываецца ў Беларусі, дзе пануе немаральны і антыэстэтычны рэжым. Урэшце, за савецкім часам мы жылі і працавалі ў нашмат больш несвабодных і залежных умовах. Калі ўсё гэта так, то мяне асабіста не задавальняе толькі адно — гэта адсутнасьць жывога культурнага і, у прыватнасьці, літаратурнага працэсу. Я раптам успамінаю, што я не пачвара, я пісьменьнік. І тут абазначаецца мой унутраны раскол. Як палітызаваны незалежнік, я сёньня магу разьлічваць пераважна на замежную дапамогу — працоўнае месца, грамадзкую думку, уплыў міжнародных арганізацыяў і ўрадаў іншых краін. А як пісьменьніку, мне ніхто чужы на маёй творчай тэрыторыі непатрэбны. Гэта мая мова, мая краіна і мой народ, улічваючы ўсіх ягоных прадстаўнікоў — добрых і дрэнных, дыктатараў і герояў, «замбіраваных» і «прадзьвінутых». І толькі мне належыць права найлепшым чынам апісаць гэты народ. Я сюды нікога не пушчу, ніякага фіна, які б падказаў сюжэт, ніякага ўкраінца, які назаве мне галоўнага героя.

Культура стварае неба нацыянальнае арыентацыі, падказвае шлях нашае вечнасьці, які мусіць быць грунтам для бягучае палітыкі. А ў нас ужо даўно нічога ня пішацца такога, што завалодвала б душамі людзей, давала ім глыбокія ўнутраныя арыентыры. Так замыкаецца кола.

Інтэлігенцыя знаходзіць творчую сатысфакцыю ў якім-небудзь чарговым артыкуле ў Хандэльсблат, а не ва ўласных творах. Так паступова зьмяняецца ляндшафт культуры, адсунутай на другое месца. Валадарамі розумаў становяцца тыя, хто больш удала раскажа пра дыктатара і замбіраваны народ, а літаратары драбнеюць, не знаходзячы выйсьця. Усіх разьмяшчаюць на гарызанталі так званага постмадэрнізму, што дазваляе канчаткова пераблытаць усё з усім і фармуляваць, фармуляваць, фармуляваць, памнажаючы занудзтва.

Даведзены ўсім гэтым да шаленства чалавек ідзе па вуліцы і паўтарае як заклінаньне: я не пачвара, я пісьменьнік. Я не пачвара, я пісьменьнік. Я не пачвара, я пісьменьнік...

Сьвет становіцца крыху больш сьветлым.ы

Сяргей Паўлоўскі

ПОШТА

лядзе колішняй аднайменнай рубрыкі) ці пачаць стварэньне гісторыі штодзённасьці. Я ня маю досьведу працы з крыніцамі, пошуку матэрыялаў, але думаю, для беларускіх патрыятычных адмыслоўцаў гэта будзе ня больш складана, чым гэта было для расейскіх ці іншых.

Трэба, каб быў назьбіраны матэрыял ці не пра ўсе бакі абыватальскага жыцьця, каб беларусы (у першую чаргу сьвядомыя) ведалі пра паходжаньне тытуню, Новага Году, кавуна ды бульбы, але на сваёй зямлі, у Беларусі, каб яны ня блыталі Радзіму. Можна гэтыя зьвесткі разьмяшчаць у «НН», але зусім неабавязкова абмяжоўвацца вузкім колам адраджэнцаў. Зьвесткі трэба разьмяшчаць у газэтах проста патрыётаў («Свабода», «Пагоня»), проста беларускамоўных («Звязда», «Чырвоная Зьмена»), проста беларусаў (любыя расейскамоўныя газэты). Ня думаю, што ў зьвестках пра рэчы штодзённасьці рэдактары знойдуць палітычную афарбоўку і таму не прапусьцяць іх у друк; але іхны патрыятычны ўплыў на масы відавочны. Што да беларускамоўных, ці, прынамсі, патрыятычных газэтаў, то іх чытачы ўспрымуць на гура, таму і рэдактары надрукуюць іх з радасьцю.

Урэшце, можна зрабіць, як гэта сталася ў вас добрай традыцыяй, «новы праект»: ну, скажам, даведнік ці энцыкляпэдыю рэчаў. Думаю, такі даведнік вельмі прыдасца патрыётам, якія імкнуцца да беларускасьці ва ўсім. Да таго ж ён будзе добрай крыніцай для перадрукоўкі ў тыя ж газэты ды часопісы.

Я спадзяюся, мая прапанова ня здасца несур'ёзнай, і заклікаю ўсіх, хто здольны да адпаведнай працы, зрабіць унёсак у справу Адраджэньня гістарычнай памяці беларусаў — у выглядзе гісторыі штодзённасьці.

Дзякуй

Віталь Станішэўскі

Дзень добры, «Наша Ніва»!

Пішу вам з адзінай мэтай — пахваліць. Жыцьцё мяне навучыла: сказаць добрае слова трэба сьпяшацца. Вось і кажу: вы зараз — адзіная беларуская газэта, якую чакаеш як збавеньня ад павакольнай дурноты. Была раней «Свабода», але ў гэтую крэпасьць быў запушчаны траянскі конь білінгвізму, і зараз на вачах яна здае адну старонку за другой. Розум усьведамляе, што гэта мо й апраўдана тактычна, а душа — не, адхіснулася ўжо. Дзякуй выпадку, што загадзя натрапіла на «НН». Перахваліць вас не баюся, бо, мяркую, на другія шалі пэрыядычна кладуцца зусім іншыя эмоцыі (і дзеяньні!) уладаў і каляўладных псэўдаграмадзкіх стварэньняў. Калі пачынае трэсьці ад аднаго голасу ў радыё, становіцца фізычна дрэнна ад суседзкіх размоваў пра палітыку, калі ня чуеш нават на вёсцы свайго слова, а натыкаесься на зацэмэнтаванасьць непрабівальную, калі сам пачынаеш сябе паводзіць як Штырліц — трэба час ад часу лячыцца. Адзін са сродкаў якраз — «Наша Ніва». Праўда, гэта лекі не адзіныя. Вельмі добра яшчэ дзейнічае прагулянка сярэдначы зь вядзерцам клею й пачкам улётак ці плякатаў — і пасьля 2-3 дні (пакуль не зьдзяруць) іх выгляд на слупах і прыпынках. А добры надпіс незмывальнай фарбай — наогул рэанімацыйны мэтад. Менавіта дзеяньнямі падтрымліваецца самаіснаваньне. Але толькі існаваньня мала, патрэбны спосаб, шлях, працэс асэнсаваньня сябе і сьвету. Назіраючы прыкметы руху ў зваротным напрамку, проста заставацца ў сваім часе —ужо вымагае значных высілкаў. Ваша — ды не, наша! — газэта дае каардынаты гэтага часу і «прывязку на мясцовасьці» адносна іншага сьвету. І калі (што найверагодней) мы хутка прасьлізнем паўз настальгічна-багатыя (адносна!) 70-я і трывала загразьнем у 37-м — той, хто здольны думаць самастойна, будзе змушаны знайсьці свой мэтад псыхалягічнага выжываньня. Тое, што коціцца на нас, баіцца акрытага сьвету, баіцца іроніі, больш за ўсё баіцца дзеяньня — значыць, у гэтым нашае выратаваньне. А наадварот, яму даспадобы пэсымізм і грэблівае стаўленьне да палітыкі, пазыцыя «а што гэта дасьць?» і «усе яны аднолькавыя» — бо гэта ня толькі не перашкаджае ІХ дзеяньню, але й пазбаўляе ініцыятывы, зьвязвае таго, хто побач. Сьцьвярджаць нармальнае ў ненармальным сьвеце, даваць эталён нармальнасьці — гэта, на маю думку, пераважае ў ідэі газэты. Хто ж вінен, што планка нармалёнасьці здаецца нам завысокай, і спараджае папрокі ў элітарнасьці!

Рабіць усё простым — адзін з мэтадаў падаўленьня асобы. Паказвайце й надалей, што сьвет складаны й неадназначны. Каб не згубіцца ў ім, ёсьць адзін спосаб — цьвёрда ведаць, хто ты і адкуль, і адначасна бачыць і прызнаваць непадобнасьць іншых, ведаць іхныя законы і дарогі. Цікавая і вечная (паводле працягласьці існаваньня) задача. Яе выкананьне — гарантыя доўгага жыцьця газэты ў сэнсе запатрабаванасьці. Каб жа толькі ад гэтага залежала вашае існаваньне! Як яно далей будзе — марна варажыць, але ў любым выпадку спакойнага жыцьця не чакаецца. Можа й шчасьце ў тым! Ведаю адно! На дадзены момант існаваньне «НН» вельмі дапамагае мне адчуваць сябе сабою. Мы адной крыві — гэта такое прыемнае адчуваньне.

З павагаю

Сьвятлана Верас,
Бабруйск

Досьвед жыцьцёвых сілаў

Экспэдыцыя «НН» і Архіву Найноўшае Гісторыі да Саюзу Беларускіх Патрыётаў

МАТЫВАЦЫІ

Варта аднойчы зьмяніць свой звычайны графік, устаць так рана, як раней не ўставаў, суткі знаходзіцца ў дарозе, аб'яжджаючы Паўночную Беларусь — каб спазнаць новыя эмацыйныя адчуваньні, якія ў сёньняшняй Беларусі выглядаюць архаічнымі, каб зразумець іншае, з пазыцыяў досьведу, бачаньне нашага жыцьця.

Нашая здымачная група.

На досьвітку 6 верасьня кіна-экспэдыцыя «Нашай Нівы» й Архіву Найноўшае Гісторыі выяжджала зь Менску. Меркавалася адзьняць кадры для фільма пра сучасную Беларусь, дзе сюжэт пра Саюз Беларускіх Патрыётаў быў бы рэмінісцэнцыяй непарыўнасьці беларускага жыцьця. Адначасова хацелася падрыхтавацца да нашага будучага фільма пра СБП, зрабіць першыя відэанарыхтоўкі. Пасьля таго, як выдавецтва «Наша Ніва» выпусьціла кнігу «Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў» тэма пасьляваеннага антысавецкага Супраціву стала для нас блізкаю й мы маем намер надалей праводзіць дасьледчае й інфармацыйнае яе засваеньне.

Наш «Арго» — старэнькі мікрааўтобус Ford, выбіраўся зь Менску, і мы да канца яшчэ ня ведалі, як складзецца наш маршрут. Напярэдадні рэжысэр Віктар Корзун праз тэлефон дамовіўся са спрадарствам Фурсаў з Паставаў пра магчымасьць прыезду й здымак. Мы сустрэлі поўнае паразуменьне й нам было прапанаванае нават большае — спадарства Фурсаў самі дамовяцца зь іншымі сябрамі СБП, што вярнуліся пасьля Сібіраў у Беларусь, і яны паспрабуюць сабрацца разам, каб дапамагчы відэагруне. Фактычна, нашыя сьціплыя здымкі ператварыліся ва дзею — у сустрэчу сяброў СБП, першую такога роду паводле колькасьці ўдзельнікаў і мэтаў гісторыка-архіўнае фіксацыі сьведчаньняў.

Алег Табола й Алесь Амельянавіч каля ганку былой пастаўскай педагагічнай вучэльні.

ПАРАЦЫЯ

У салёне знаходзіліся літаратар Уладзімер Арлоў, які шмат зрабіў для рэабілітацыі сяброў СБП, рэжысэр Віктар Корзун, журналіст Севярын Квяткоўскі, відэаапэратар Сяргей, наш заўсёдны кіроўца Ўладзімер ды аўтар гэтых радкоў. І вось па шляху мы заяжджалі ў розныя беларускія гарады й мястэчкі, робячы здымкі ды забіраючы новых пасажыраў. Сп. Алег Табола далучыўся да нас яшчэ ў Менску. Далей мы рушылі ў Вялейку, дзе нас напаткала першая нечаканасьць — ліст ад спадарства Фурсаў яшчэ не дайшоў да сп. Алеся Амельяновіча й ён нічога ня ведаў пра наш прыезд і нашыя намеры. Тым ня менш, сп. Алесю спатрэбілася 20 хвілінаў, каб сабрацца ды выбрацца з намі ў дарогу.



На ўсе сябры СБП і былыя студэнты пастаўскай педагагічнай вучэльні пазналі адразу ж будынак, цяпер патынкаваны.

У Паставах у сваім гасьцінным доме нас ужо зачакаліся Антон Фурс і Алеся Фурс (Умпіровіч), а таксама іхны сябра Яўген Сідаровіч. Паставы былі адным з цэнтраў СБП і тут шмат мясьцінаў, зьвязаных зь дзейнасьцю сяброў гэтай арганізацыі — будынак былой педагагічнай вучэльні, дзе і ўзьнікла пастаўская група СБП, плябанія пастаўскага касьцёлу, сутарэньні якой гэбэшнікі ператварылі ў вязьніцу для беларускіх юнакоў і дзяўчат. Мы наведалі пастаўскія могілкі, дзе пахаваныя Віктар Стахоўскі і Ўладзя Лысёнак. Нашыя відэакамэра й дыктафоны зафіксавалі аповеды пра савецкую рэчаіснасьць — як, калі ў 1978 годзе памёр сп. Віктар і Фурсы з Караганды даслалі тэлеграму спачуваньня з тэкстам па-беларуску, дык гэткае «здарэньне» стала падставаю для «разьбірацельства» мясцовага КГБ, што стварыла сваякам выгнанцаў чарговыя праблемы; як ня можна было замовіць тут жалобную стужку на вянок з тэкстам па-беларуску, «шрыфты знайшліся толькі ў Літве»... Пра яшчэ адзін фройдаўскі сюжэт мы даведаліся каля хаты Фурсаў. Адзін зь іх цяперашніх суседзяў раней служыў ахоўнікам у гэбэ й ягоная сям'я трэціравала сваіх новых суседзяў пасьля іх вяртаньня на Радзіму — называючы фашыстамі, недабіткамі. Пад час аднаго са сваіх чарговых прыпадкаў, пасьля выпіўкі яны ўсчынілі сапраўдны скандал. Прыехала міліцыя.

Антон Фурс у сутарэньнях пастаўскай плябаніі, якая 50 гадоў таму была ператвораная ў вязьніцу для яго й ягоных сяброў.

ЗЯЛЁНЫЯ ЛЕКЦЫІ

Ня вер! Ня бойся!

Славамір Адамовіч

А пошнімі днямі я адчуваю ў сабе дэвальвацыю словаў. Пішу, прамаўляю, і прэч! прэч!... Не хачу словаў! Мала мне словаў! Дзеяньняў патрабую!...

Дзейнічаць!...

Пасьля турмы, пасьля таго, што ўжо зрабіў і далей робіць з нашымі людзьмі гэты рэжым, што не дае спакою? Помста! Справядлівая помста і сьвятая нянавісьць! Пасьля турмы, пасьля годна пройдзеных этапаў, выйшаўшы з турэмнай «зоны» ў зону акупацыі, ты ўжо апэруеш іншымі катэгорыямі, другімі маштабамі. Турма — вялікая цана, заплаціўшы якую, ты справядліва хочаш атрымаць якасны прадукт: верных сяброў і таварышаў, людзей прыгожых і мужных; высокіх учынкаў і чысьціню помыслаў; ясныя палітычныя мэты, зразумелую стратэгію, плённую тактыку... Што ж да маленькіх чалавечых прыемнасьцяю кшталту кухля піва ў Траецкім зь сябрамі, то гэта, вядома, прыемна. Але як з тымі беларускімі юнакамі, што чаляцца на жодзінскай «малалетцы»?... Ці доўга ты будзеш цешыцца сваім півам? Бадай, вельмі хутка паставіш перад сабой пытаньне: што рабіць? І дасі адзіна правільны адказ: дзейнічаць!

Дзейнічаць сёньня — гэта значыць, быць гатовым да рызыкі, ісьці на рызыку, рызыкаваць.

Дзейнічаць — значыць, рабіць тое, што можа толькі сьмелы, свабодны духам чалавек, патрыёт Бацькаўшчыны, нацыяналіст.

Дзейнічаць — значыць, быць гатовым і да «зоны». І не яна нас, а мы яе мусім узяць. І ня іхнай, а нашай павінна быць яна.

Супраціў рэжыму магчымы і за кратамі. Мы зробім турму такой, памятаючы і добра асэнсоўваючы неадменнае турэмнае правіла: ня вер! ня бойся! не прасі!

НЕ ДАВЯРАЙ у турме ні сукамэрніку, ні кантралёру, ні афіцэру-опэру, ні работніку санчасткі, ні нават сабе ў хвіліны роспачы і адчаю. Будзь упэўнены, што на волі пра цябе не забыліся, не пакінулі. Якраз таму і пазбаўляюць інфармацыі (газэтаў, радыё, тэлевізара, сустрэчаў), што спадзяюцца разбурыць тваю веру ў сяброў на волі.

Ня бойся таго, што яшчэ не адбылося і не абавязкова павінна адбыцца. Старайся быць унутрана сабраным, але не «на ўзводзе», паводзь сябе як мага спакайней, не трапячыся, тады ты будзеш рабіць меней памылак. Турма ня любіць трапетуноў. Турма ўвогуле ня ўмее любіць. Як і яе ня любіць ніхто. Турма, дружа, гэта і ёсьць пекла на зямлі. Памятай пра гэта, калі крочыш у радах дэманстрантаў... Ня бойся, але, разам з тым, будзь гатовы да самага горшага. Сукамэрнікі такую гатоўнасьць адчуваюць. Ужо ў першыя дні і тыдні знаходжаньня ў камэры варта вырашыць, што ты можаш сьцярпець, а што не. Асабіста я быў гатовы перарэзаць глотку любому, хто паспрабаваў бы спасягнуць на маё жыцьцё, здароўе ці мужчынскую годнасьць. Гатоўнасьць — гэта ўжо пачатак справы. Зрабі выбар — і будзе лягчэй. Аднак ня трэба лезьці ў бутэльку з-за кожнай дробязі. Памятай, што вораг кідае за краты, спадзеючыся пазбавіць цябе волі да супраціву, дэмаралізаваць, падбіць псыхалягічна, а то й фізычна. У турме перад табой стаяць тры галоўныя задачы: захаваць жацьцё, захаваць здароўе, захаваць чалавечую годнасьць і ня ссучыцца. Якія б крымінальныя артыкулы на цябе ні вешалі, памятай, што ты палітычны і здольны на большае, чым звычайны крымінальнік. Ты не баісься бандытаў у форме, не баісься карцэраў, «рэзінкі» ды іншых зьдзекаў з боку адміністрацыі. Уступаючы ў канфлікт з аховай, ты заваёўваеш аўтарытэт сярод сукамэрнікаў. Пільнуйся, аднак, таго, каб твае сутычкі з турэмшчыкамі не зашкодзілі сядзельцам камэры. Ніколі не падкрэсьлівай іншым сядзельцам, што ты не такі, як яны. Пра твой статус палітычнага яны ведаюць і ў паводзінах сваіх робяць адпаведную карэкцыю. Ніколі не хваліся перад іншымі сваімі ведамі, не давай падставаў для зайздрасьці. У камэры ты роўны з астатнімі. І толькі камэра можа падняць цябе, згодна здабытага аўтарытэту.

Не прасі! Гэта ня так і складана, ня трэба толькі паддавацца мімалётным жаданьням. Памятай, што папрасіўшы адну цыгарэту, аддасі дзьве, пазычыўшы скарынку хлеба, можаш аддаць бохан. Вучыся цярпець і абыходзіцца яшчэ меншым, чым патрабуе турма.

Не абяцай! Тым больш, калі ня просяць. Не імкніся трымаць вялікі кешар (торбу з рэчамі), мець лішняе. Лішняе аддай сукамэрніку. Сачы за асабістай гігіенай незалежна ад той пастановы, якая дзейнічае ў камэры. Гігіена — гэта тваё здароўе, пра што ты мусіў ведаць і на свабодзе.

Не гуляй ні ў якія гульні, нават у шашкі ці шахматы. Не гуляеш — не прайграеш. Пра карты ўвогуле забудзь. Лепш займіся вырабам якой-небудзь драбязы: асадкі, каляндарыкі, «марачкі» (малюнкі на кавалках прасьціны)... Калі дазваляе сытуацыя ў камэры і нельга

«Цяпер я ведаю, каго тут трэба затрымаць!» — сказаў міліцыянт і зашпіліў кайданкі на руках былога ахоўніка.

Мы ж прычынілі дзьверы аўтобусіка ды скіраваліся гэтым разам ужо ў Глыбокае, дзе сустрэліся з Альбэртам Бацяноўскім. Гады няволі падарвалі здароўе гэтага чалавека, і сам бы ён ніколі ня выбраўся ў іншы горад на сустрэчу з паплечнікамі. А яго й нас чакалі ў Полацку.

На кватэры спадарства Бялевічаў ужо былі Васіль Мядзелец — кіраўнік Глыбоцкай групы СБП, Аляксандар Юршэвіч, які і прапанаваў у 1945 годзе стварыць арганізацыю на ўзор таварыства філяматаў-філярэтаў. Тут жа я пазнаёміўся са сп. Германам Кірылавым, які мэтанакіравана зьбіраў зьвесткі, успаміны, апрацоўваў іх, каб у выніку паўстала кніга «Гарт». Рукапіс гэтай кнігі два гады ляжаў у часопісе «Полымя», пакуль не патрапіў у «Нашу Ніву». У выніку, у 1997 годзе зьявіліся публікацыі: «Прысягнулі Беларусі. Кніга споведзяў» у «Полымі» і кніга «Гарт». Стаўшы ў дзяцінстве сьведкам арышту аднаго зь сябраў СБП Янкі Рымдзёнка, спадар Герман не пазбавіўся гэтае памяці й выканаў свой грамадзянскі й журналісцкі абавязак, стварыўшы кнігу пра СБП.

Полацкая сустрэча сталася адным з самых моцных уражаньняў нашае экспэдыцыі. Я магу прывесьці ў доказ адзін факт — удзельнік пастаўскай групы СБП Аляксандар Амельяновіч упершыню ў жыцьці менавіта тут пабачыў некаторых сяброў з Глыбоцкай групы СБП. Бо Глыбоцкая й Пастаўская групы ўтварыліся й дзейнічалі самастойна, кантакт паміж імі наладзіўся толькі на ўзроўні кіраўніцтва, вытрымліваліся некаторыя правілы канспірацыі. Далей быў разгром гэбэ, ГУЛАГ, праблемы адаптацыі ўжо на волі.

Мы селі за адзін стол — сябры СБП і экспэдыцыя «Нашай Нівы». Нашая размова не была простаю застольнаю гутаркай, бо ўзгадваліся факты, удакладняліся дэталі, разгараліся дыскусіі. Як цяпер разумеем, матэрыялу толькі па СБП можна сабраць яшчэ на два «Гарты». А гэта толькі адна падпольная арганізацыя. Між тым, у другой палове 40-х і на пачатку 50-х такія арганізацыі існавалі па ўсёй Беларусі. Фэномэн СБП у тым, што ягоныя сябры, захаваўшы паміж сабой шчыльныя сувязі, усьвядомілі грамадзкую важнасьць свайго досьведу, пагадзіліся й здолелі наладзіць пашырэньне інфармацыі пра яго — пра досьвед супраціву й пра досьвед трыманьня. Гэты чыньнік усьведамленьня працягвае гісторыю іх арганізацыі й сёньня.



Каля магілы Віктара Сташэўскага.

Гучалі падзякі Ўладзімеру Арлову, які, прыехаўшы да сяброў СБП першы, заахвоціў іх падаваць дакумэнты на рэабілітацыю. Рэч ў тым, што КГБ проста прамаўчаў на просьбу пра рэабілітацыю арганізацыі. І тады ўжо Арлоў даводзіў сябрам СБП, каб яны падавалі дакумэнты пэрсанальна. Трэба ўзгадаць, што гэта былі 1992-1993 гады, пэрыяд, паводле беларускай храналёгіі, Другой рэспублікі. І — рэдкі выпадак, КГБ за подпісам намесьніка старшыні Генадзя Лавіцкага даслала нават прабачэньне.

Традыцыйнаю была нашая паездка да магілаў паплечнікаў сяброў СБП. На полацкіх могілках «Лясныя» пахаваны Алесь Дзікі. Ён хацеў, каб на ягонай магіле было напісана «Хай сьняцца сны аб Беларусі».

Герман Кірылаў падвёў мяне яшчэ да адной магілы. Сп. Герман ведаў чалавека, пахаванага тут — ён нічым асаблівым не вылучаўся, працаваў у прамысловасьці, дасягнуў там пэўных камандных пасадаў. Але калі памёр, папрасіў, каб эпітафія на ягонай магіле была па-беларуску.

На полацкіх могілках гэта адзіныя надмагільлі, падпісаныя па-беларуску.

ДЫСКУСІІ

Наша сустрэча дала ня толькі новыя факты, але й справакавала новыя развагі. Спп. Алеся Фурс заўважыла, што яна ні пра што не шкадуе, не шкадуе пра свой выбар. Адзінае, што выклікае жаль, дык гэта тое, што яны пасьпелі мала чаго зрабіць. Ёй запярэчыў Васіль Мядзелец, колішні кіраўнік Глыбоцкай групы — зрабілі тое, што маглі зрабіць у тых умовах. Старэйшыя генэрацыі маўчалі, а сябры СБП спрабавалі сваю энэргію й узрост супрацьпаставіць безвыходнасьці.



Полацак. Могілкі «Лясныя». Каля магілы Аляксандра Дзікага. Зьлева направа стаяць: Антон Фурс, Аляксандар Юршэвіч, Леў Бялевіч, Алеся Фурс, Васіль Мядзелец, Марыя Бялевіч, Алег Табола, Аляксандар Амельяновіч, Яўген Сідаровіч, Альбэрт Бацяноўскі.

Сапраўды, СБП знаходзілася ў пэрыядзе свайго арганізацыйнага станаўленьня. Досыць рана туды быў укаранёны правакатар. Да асьветніцкай дзейнасьці, якую ўлянавалі праводзіць, СБП па-просту не пасьпела падысьці. Сёньня ж сябры СБП апынуліся ў цэнтры ўвагі незалежнага беларускага грамадзтва — шматлікія публікацыі, увага мэдыяў. Такая сытуацыя недзе й справакавала падобныя дыскусіі.

Між тым, самі ўдзельнікі арганізацыі павінны разумець, што бязь іхнага СБП і падобных ім людзей і арганізацыяў гісторыя Беларусі сапраўды ператвараецца ў фатальны маналіт, што толькі бязь іх спраўджаецца савецкая гістарыяграфія. Калі маўчаць сябры рухаў Супраціву пачынаюць казаць савецкія школьныя падручнікі.

Для нас, беларускіх гуманітарыяў і журналістаў, сустрэча з сябрамі СБП — гэта пошук непарыўнасьці. Адраджаецца ўнікальнае для цяперашняй Беларусі пачуцьцё піэтэту. У той час, калі многія лідэры пакідаюць гэты край, мы сутыкаемся зь людзьмі, якія ўсё жыцьцё імкнуліся вярнуцца сюды. І тая патэтыка, якую можна сустрэць на старонках «Гарту», мае аўтэнтычны статус. Бо яна вынікае зь вясковага кодэксу гонару.

Сябры СБП сёньня ўжо не маладыя людзі. Да таго ж яны прайшлі ГУЛАГ, які зьнішчыў мільёны жыцьцяў. Тым ня менш, усе гэтыя людзі выглядаюць і цяпер вельмі трывалымі і прыгожымі. Варта паразважаць над іх жыцьцёвымі сіламі.

Алег Дзярновіч
здымкі аўтара

НЕ ПРАСІ!

спаць, бо не твая пара, — чытай. Чытай усё, тым болей, што выбару ў цябе няма. Нават у самай пустой кніжцы ты знойдзеш для сябе нешта цікавае.

Навучыся добра СТАЯЦЬ НА ДАРОГАХ, г.зн. падтрымліваць жыцьцядзейнасьць турэмнай пошты. Умець ЦЯГАЦЬ ДАРОГІ — сьвяты абавязак кожнага ў камэры. Ад таго, як працуе турэмная пошта, можа залежаць тваё жыцьцё, ня кажучы ўжо пра тэрмін адсідкі. Праз СЫСТЭМУ ДАРОГ (міжкамэрная сувязь) турма ведае ўсё пра ўсіх, а таксама перадае інфармацыю з волі і на волю.

Калі табе ўчора споўнілася 18, а сёньня цябе арыштавалі, то ведай, што пасадзіць цябе павінны ў агульную дарослую камэру, а не на «малалетку». Калі ж, наадварот, на другі дзень пасьля таго, як цябе закрылі на «малалетку» (камэра для непаўналетніх), ты адзначыў дзень свайго паўналецьця, то не чакай, а сам патрабуй пераводу ў дарослую «хату». Адзін з турэмных законаў: дарослы павінен сядзець у камэры для дарослых, а не хавацца на «малалетцы» ў якасьці выхавальніка. Калі адміністрацыя не сьпяшаецца пераводзіць цябе на агульны рэжым — гэта ўжо падстава для пратэсту з твойго боку. У такім разе лепш пайсьці на карцэр (штрафны ізалятар).

Адна з самых брутальных правакацыяў — гэта калі цябе кідаюць у камэру для так званых апушчаных. Кожнага новенькага ў такой камэры пад страхам жорсткага пакараньня сядзельцы павінны папярэдзіць пра статус іхнае «хаты». І новенькі на працягу першай жа гадзіны павінен ВЫЛАМАЦЦА з такой камэры, каб самому ня трапіць у разрад ізгояў. І тут ужо ты павінен ісьці на самыя скрайнія меры, каб захаваць сваю годнасьць, аж да ўскрыцьця венаў. Звычайна гэта спрацоўвае і з «абіжанкі» (камэра для «абіжаных», «апушчаных») цябе выпускаюць, накіроўваючы пасьля карцэру ў «нармальную хату».

Пра сухую галадоўку. Прадумай сьпярша ўсе «за» й «супраць» перад пачаткам акцыі. Праінфармуй сукамэрнікаў і турму па турэмнай пошце, зь якой мэтай ты пачынаеш галадаць, а таксама пастарайся даць знаць на волю. Твая сухая галадоўка мае сэнс толькі ў выпадку, калі пра яе будуць ведаць па-за камэрай. Цябе адміністрацыя будзе адгаворваць, прыйдуць «маскі-шоў» (міліцыянты ў масках), магчыма, выведуць у санчастку, пачнуць імітаваць прымусовае кармленьне. Ня вер і стой на сваім. Сілком накарміць нельга, гэта блеф, ды і выглядала б яно надта ж дзіка й жорстка. Сухая галадоўка — эфэктыўны сродак барацьбы, але не тады, калі ў цябе хворы страўнік, ныркі альбо печань. На сухую галадоўку рашайся альбо не, калі ўсе іншыя сродкі ўжо выкарыстаныя. Самае галоўнае — пра акцыю павінна ведаць турма і воля.

Ускрыцьцё венаў рук. Для гэтага трэба мець вострую заточку і, вядома, волю. Такі сродак выкарыстоўваюць у экстраных выпадках, калі твайму здароўю ў камэры пагражае небясьпека, альбо калі бачыш, што мяняты могуць зьбіць цябе. Лепей шнар на руцэ, чым адбітыя ныркі й печань.

Вопытныя зэкі, каб трапіць, напрыклад, на бальнічку (турэмная ці гарадзкая бальніца), глытаюць «шырку» — мэталёвыя прадметы, якія можна дастаць толькі апэратыўным шляхам.

Ускрываюць таксама і жывот. Самая небясьпечная акцыя на самавыжываньне, паколькі можна закрануць кішкі, а гэта хутчэй за ўсё сьмерць. Жывот рашаюцца рэзаць звычайна рэцыдывісты, каму сьвецяць вялікія тэрміны, альбо «вышак» (сьмяротная кара).

І «шырка», і «харакіры» — акты вялікай волі, але яны патрабуюць дэталёвых ведаў. Трэба дакладна ведаць, што і як праглынуць, дзе і як паласнуць. Трэба ведаць і тое, што ні «кума» (начальнік апэратыўна-рэжымнай часткі), ні кантралёра-наглядчыка, ні іншых работнікаў адміністрацыі не спужаеш, калі пра твае дзеяньні асабліва ніхто ня ведае. Супраціў павінен быць інфармацыйна забясьпечаны.

Заезд на турму — не вандроўка па гістарычных мясьцінах Беларусі. І ў таптаньні «зоны» няма ніякай рамантыкі. Проста, калі, ня дай Бог, ты аднойчы трапіш туды, пастарайся выйсьці мужным і мужчынам. Гэта трэба дзеля нашай барацьбы. «Зону» прайшлі нашыя прадзеды, дзеды, бацькі. Мы павінны стаць апошнім пакаленьнем, якое пройдзе свае турэмныя этапы за любоў да Бацькаўшчыны.

На турме ніхто ні ў чым ня можа быць упэўнены: ні «злодзей у законе», ні «беспрадзельшчык», ні «малалетка», ні «шасьцёрка». Упэўнены мусіш быць толькі ты — у тым, што твая адсідка мае сэнс у нашым агульным супраціве акупанту, што рана-позна вораг заплоціць за твае пакуты. Рана-позна ўся гэтая скурвеная калябаранцкая шпана: «ціхары», гэб'ё, судзьдзі, пракуроры, — за свае злачынствы будзе трымаць адказ па самай высокай мерцы.

Памятай: «век волі не відаць», калі мы не здабудзем свабоду сабе і Бацькаўшчыне.

«Мы не баімся арыштанцкай робы, мы за Радзіму робім гэты крок».

З Богам!

Эўрапейскі Інфармацыйны Цэнтар

Паводле дамоўленасьці з Радаю Эўропы і ў супрацоўніцтве зь ёю «Наша Ніва» распачынае праект Эўрапейскага Інфармацыйнага Цэнтру. Мэта нашага праекту — пашырэньне ў Беларусі эўрапейскай інфармацыі: пра эўрапейскія інстытуцыі й ініцыятывы; пра эўрапейскія стандарты, найперш у галіне правоў чалавека; пра ўзаемадачыненьні Беларусі з эўрапейскімі структурамі. Дзеля гэтага на першым этапе праекту «Наша Ніва» апублікуе асноўныя эўрапейскія Канвэнцыі ў галіне правоў чалавека, а таксама камэнтары да іх беларускіх юрыстаў і спэцыялістаў у галіне правоў чалавека, зробіць параўнаўчы аналіз эўрапейскага права зь беларускімі законамі й практыкаю. «НН» будзе зьвяртаць асаблівую ўвагу на дакумэнты Рады Эўропы, што тычацца Беларусі.

У нашай краіне тэма Эўропы, і Рады Эўропы ў прыватнасьці, ёсьць актуальнаю і ўвесь час дыскутуецца. Рэжым рэалізуе стратэгію самаізаляцыі ад эўрапейскіх стандартаў правоў чалавека, але, імкнучыся захоўваць рэнамэ, абвінавачвае Раду Эўропы ў падвойных стандартах. Беларускае грамадзтва, і апазыцыя ў прыватнасьці, стала апэлюе да Рады Эўропы ў пошуках маральнае й палітычнае падтрымкі, а таксама ўважаючы за сваю галоўную мэту рэінтэграцыю Беларусі ў Эўропу.

Афіцыйныя Цэнтры Інфармацыі й Дакумэнтацыі Рады Эўропы ўтвараюцца ў краінах-удзельніцах і пры садзеяньні ўрадаў. У сярэднеэўрапейскіх краінах такія афіцыйныя інфармацыйныя прадстаўніцтвы часам ствараюцца пры ўнівэрсытэцкіх асяродках — як пры Эўрапейскім Інфармацыйным Цэнтры Карлава ўнівэрсытэту (Прага) ці Цэнтры Эўропы Варшаўскага ўнівэрсытэту. Наш Эўрапейскі Інфармацыйны Цэнтар паўстае як грамадзкая інстытуцыя. Мы перакананыя, што ва ўмовах, калі ўрад Беларусі праводзіць антыэўрапейскую палітыку, незалежнае беларускае грамадзтва мусіць само рыхтаваць сваю краіну да інтэграцыі з эўрапейскімі структурамі — праз інфармаваньне й дыялёг.

Рада Эўропы — гэта:

адна са найстарэйшых міжурадавых арганізацыяў у Эўропе, якая была заснаваная ў 1949 годзе ў Страсбургу. Тады Рады Эўропы заснавалі 10 краінаў. Цяпер у яе ўваходзяць 40 дзяржаваў[1], а яшчэ 5[2] падалі свае заяўкі на ўступленьне ў яе. Рада Эўропы кіруецца прынцыпамі плюралістычнай дэмакратыі, павагаю правоў чалавека й вяршэнства права. Ва ўсіх сфэрах сваёй дзейнасьці рада



Эўропы актыўна супрацоўнічае зь няўрадавымі арганізацыямі, дзейнасьць якіх яна лічыць найважнейшым складнікам дэмакратычнага працэсу.

Структура арганізацыі адпавядае дэмакратычным інстытутам краінаўудзельніцаў: у яе ўваходзяць Камітэт міністраў, які складаецца зь міністраў замежных справаў усіх краінаўудзельніцаў, і Парлямэнцкая Асамблея, у склад якой уваходзяць дэлегацыі парлямэнтарыяў, якія прызначаюцца парлямэнтамі кожнай краіны. Гэтыя два органы абслугоўвае Сакратарыят Рады Эўропы, што працуе пад кіраўніцтвам Генэральнага сакратара, якога абірае Асамблея. Камітэт міністраў прымае палітычныя рашэньні. Парлямэнцкая Асамблея абмяркоўвае найважнейшыя пытаньні й дае рэкамэндацыі Камітэту міністраў.

Камітэт міністраў праводзіць свае паседжаньні ў Страсбургу ня менэй за два разы на год. На гэтых паседжаньнях прымаюцца праграма дзейнасьці й бюджэт Рады Эўропы. Большасьць рашэньняў патрабуе кваліфікаванае большасьці — дзьвюх трацінаў галасоў. Старшыня Камітэту міністраў зьмяняецца кожныя шэсьць месяцаў.

Старшыня Парлямэнцкай Асамблеі абірасцца на тры гады. Цяпер гэтую пасаду займае спн. Лені Фішэр, прадстаўніца Нямеччыны, вядомая сваёй асабістай цьвёрдай пазыцыяй у справе выкананьня правоў чалавека ў Беларусі.

Закончанасьць структурам Рады Эўропы надае Кангрэс мясцовых і рэгіянальных органаў улады Эўропы. Гэта паўпарлямэнцкі орган, які складаецца з нацыянальных дэлегацыяў прадстаўнікоў мясцовых і рэгіянальных уладаў, якія абраныя дэмакратычным шляхам. Мэта Кангрэсу — паспрыяць дэмакратычна абраным прадстаўнікам мясцовых і рэгіянальных уладаў зьвесьці свой досьвед і выказаць свае меркаваньні наконт эўрапейскага супрацоўніцтва.

ПРЫНЦЫПЫ РАДЫ ЭЎРОПЫ

I. Плюралістычная дэмакратыя

Паводле Статуту Рады Эўропы свабода асобы, палітычная свабода і вяршэнства права ляжаць у грунце «любой сапраўднай дэмакратыі». Гэта азначае, што з разумным інтэрвалам, на аснове ўсеагульнага й тайнага галасаваньня павінны праводзіцца плюралістычныя выбары ў парлямэнт, які павінен карыстацца шырокімі паўнамоцтвамі й мець у сваім складзе прадстаўнікоў розных палітычных партыяў. У сваю чаргу, гэтыя партыі павінны мець права свабодна арганізоўвацца й выказваць свае меркаваньні.

Зыходзячы менавіта з гэтых прынцыпаў і стандартаў Парлямэнцкая Асамблея й Камітэт міністраў разглядаюць заяўкі на ўступленьне ў Раду Эўропы. Зыходзячы менавіта з факту адсутнасьці парлямэнцкае дэмакратыі, Беларусь была пазбаўленая статусу спэцыяльна запрошанай краіны.

II. Абарона правоў чалавека й асноўных свабодаў

Гэтыя правы й свабоды замацаваныя ў двух галоўных дакумэнтах Рады Эўропы — Эўрапейскай канвэнцыі аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў ад 4 лістапада 1950 году й Эўрапейскай сацыяльнай хартыі ад 18 кастрычніка 1961 году.

Гэтыя дзьве дамовы вызначаюць правы, якія павінны гарантавацца кожнаму чалавеку, што знаходзіцца пад юрысдыкцыяй дзяржавыўдзельніцы. Яны таксама ўсталёўваюць калектыўныя працэдуры нагляду ды гарантыяў на эўрапейскім узроўні.

Нядаўна гэтыя дакумэнты былі дапоўненыя Эўрапейскай канвэнцыяй аб прадухіленьні катаваньняў ды бесчалавечных альбо прыніжаючых годнасьць відаў абыходжаньня, якая была адкрытая да падпісаньня 26 лістапада 1987 году й пачала дзейнічаць 1 лютага 1989 году.

У дадатак да гэтых прававых дакумэнтаў міністры замежных справаў і Парлямэнцкая Асамблея распрацоўваюць многія іншыя пагадненьні ды робяць рэкамэндацыі па пытаньнях правоў чалавека.

III. Вяршэнства права

Дакумэнты Рады Эўропы ўсталёўваюць шэраг важных прынцыпаў прававой дзяржавы: прынцып законнасьці, права на справядлівы судовы разбор, доступ да судоў, гарантыі справядлівага й адкрытага судовага разбору, бесстароннасьць судзьдзяў ды сувымернасьць і адпаведнасьць пакараньня ўчыненаму. Гэтымі прынцыпамі павінны кіравацца ўрады ды іншыя органы ўлады, а таксама судовыя й заканадаўчыя органы.

Падрыхтаваў Алег Дзярновіч

У наступным нумары «НН» будзе надрукаваная Эўрапейская канвэнцыя аб абароне правоў чалавека й асноўных свабодаў.

[1]Аб'яднанае Каралеўства, Альбанія, Андора, Аўстрыя, Бэльгія, Баўгарыя, былая югаслаўская рэспубліка Македонія, Вуторшчына, Гішпанія, Грэцыя, Данія, Ірляндыя, Ісьляндыя, Італія, Кіпр, Латвія, Літва, Ліхтэнштайн, Люксэмбург, Малдова, Мальта, Нарвэгія, Нідэрляньды, Нямеччына, Польшча, Партугалія, Расейская Фэдэрацыя, Румынія, Сан-Марына, Славакія, Славэнія, Турцыя, Украіна, Фінляндыя, Францыя, Харватыя, Чэхія, Швайцарыя, Швэцыя, Эстонія.

[2]Азэрбайджан, Арменія, Беларусь (статус спэцыяльна запрошанага суспэндаваны 13.1.1997), Босьнія й Герцагавіна, Грузія.

Працяг тэмы на старонцы 10.

Ідэя Балтыйска-Чарнаморскага Саюзу сыходзіла зь Менску

Падзеі 1997 году зноў актуалізавалі ідэю супрацоўніцтва краінаў нашага рэгіёну. Сёньня варта нагадаць, што першая афіцыйная сустрэча ў рамках Балта-Чарнаморскага рэгіёну на ўзроўні парлямэнтарыяў адбылася з ініцыятывы парлямэнцкай апазыцыі на плятформе БНФ у Вярхоўным Савеце Беларусі 12 скліканьня 23-24 лістапада 1990 году.

Перад спатканьнем у Менску была праведзеная вялікая падрыхтоўчая праца, бо Менск, які тады атрымаў назоў «беларускай Вандэі», быў ня самым лепшым месцам для такіх сустрэчаў. Акрамя дэпутацкіх дэлегацыяў Літвы, Латвіі ды Ўкраіны меркавалася, што будзе й эстонскае прадстаўніцтва. Але ў апошні момант эстонцы прыехаць ня здолелі. Пасьля доўгіх перамоваў зь Вячаславам Кебічам мы атрымалі права правесьці спатканьне ў будынку Савету Міністраў БССР і арганізаваць яго на належным дыпляматычным узроўні.

У 1990-91 гадах на межах Беларусі зь Літвой і Латвіяй пэўныя сілы штучна стваралі напружанасьць, спрабуючы ўцягнуць Беларусь у памежныя канфлікты са сваімі балтыйскімі суседзямі. Галоўны вынік лістападаўскай сустрэчы — гэта асуджэньне такіх канфліктаў ды супольная заява пра непарушнасьць межаў і адсутнасьць тэрытарыяльных прэтэнзіяў адзін да аднаго.

Сёньня «Наша Ніва» ўпершыню друкуе ўсе выніковыя дакумэнты менскага балтыйска-чарнаморскага спатканьня. Некаторыя з гэтых дакумэнтаў, скіраваныя на гуманітарнае супрацоўніцтва, і цяпер не згубілі сваёй актуальнасьці. За год да развалу СССР удзельнікі менскай сустрэчы прадказалі яго распад і прапанавалі канкрэтныя шляхі да незалежнасьці сваіх краінаў. Заяўляючы пра імпэрскую сутнасьць СССР, удзельнікі спатканьня адначасова накіравалі тэлеграму сэсіі Вярхоўнага Савету Расеі, дзе віталі ўмацаваньне яе сувэрэнітэту. Гэтым самым быў нанесены ўдар па міту аб антырасейскай накіраванасьці дэмакратычных сілаў краінаў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну.

Невыпадкова, што ў дзяржаўных СМІ БССР адразу пасьля менскага спатканьня была разьвязаная кампанія па яе дыскрэдытацыі, але поўныя тэксты ўсіх матэрыялаў, прынятых у Менску, нідзе не былі надрукаваныя.

Выніковыя матэрыялы таго спатканьня, прынятыя амаль сем гадоў назад, не згубілі сваёй актуальнасьці яшчэ й таму, што, нягледзечы на ўваход Беларусі ды Ўкраіны ў СНГ, нягледзячы на ўзьнікненьне саюзу Беларусі і Расеі, эканамічныя й культурныя сувязі на абшарах Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну, які доўгі час уваходзіў у адну дзяржаву, бяруць сваё.

Тэрыторыя Беларусі, што знаходзіцца якраз на балтыйска-чарнаморскім водападзеле, мела тады ды мае, асабліва сёньня, выключную геапалітычную значнасьць.

Алег Трусаў

Працяг тэмы на старонцы 10.

5 верасьня ў Калькуце (індыйскі штат Заходняя Бэнгалія) памерла маці Тэрэза. Скончыўся зямны шлях знакатай каталіцкай манахіні ў белым сары з блакітным сукроем. Сотні тысячаў людзей розных веравызнаньняў прыйшлі разьвітацца зь ёю ў Місію Міласэрнасьці (так называецца заснаваная ёю ў 1950 г. кангрэгацыя, 4000 місіянэраў якой працуюць па ўсім сьвеце дзеля найбяднейшых і гаротных).

Агнэс Гонжа Баяжыў нарадзілася 27 жніўня 1910 г. у альбанскай сям'і ў горадзе Скоп'е (сталіца Македоніі). 15-гадовая дзяўчына адгукнулася на заклік Бэнгальскай Місіі, якая дзейнічала ў абацтве Лярэта паблізу Дубліна, і з 1929 г. пачала місіянэрскую працу ў Калькуце. Ейная самаахвярная дзейнасьць у краіне і горадзе, дзе цана чалавечага жыцьця блізкая нулю, на фоне злачынстваў і цынізму нашага стагодзьдзя, успрымаецца як узор хрысьціянскага гуманізму. Яе ўзнагародзілі Прэміяй Міру Папы Яна XXIII (1971) і Нобэлеўскай Прэміяй Міру (1979), але галоўнай узнагародай для яе была сустрэча ў Альбаніі з родным народам, які вяртаўся да Веры пасьля падзеньня камуністычнага рэжыму.

Мы друкуем фрагмэнт зь ейнай кнігі «Любоў Хрыстовая», якая выйшла ў сьвет на пачатку 70-х гадоў.

Маці Тэрэза Калькуцкая

Любоў Хрыстовая

Госпадзе, дай мне праніклівасьць веры, і мая праца ніколі ня будзе манатоннай для мяне.

Ніхто ня можа пазбавіць мяне маёй веры. Калі дзеля таго, каб распаўсюджваць любоў Хрыстовую сярод бедных і пакінутых, не было іншай альтэрнатывы як застацца ў гэтай краіне, я засталася — але я не магу адмовіцца ад маёй веры. Я гатовая аддаць маё жыцьцё, але не маю веру.

Мы разумеем: тое, што мы робім, — гэта кропля ў акіяне. Але калі б ня гэтая кропля ў акіне, то была б толькі згуба. Калі б не было нашых школаў у кварталах беднаты, — гэта малыя, пачатковыя школы, дзе мы вучым дзяцей любіць навуку і як жыць у чысьціні, — калі б не было гэтых малых школаў, то тысячы дзяцей, якія маюць ад іх карысьць, былі б пакінутыя на вуліцы.

Тое самае з нашым Домам для перадсьмяротных. Калі б мы ня мелі гэтага дому, то тыя, каго мы прыносім сюды, паміралі б на вуліцы. Я думаю, варта клопату мець гэты дом, хоць мы можам абслужыць адносна нямногіх, каб яны маглі памерці годна і ў міры з Богам.

Вера — дар Божы. Безь яе не было б жыцьця. Нашая справа, —каб даваць плён, каб служыць толькі Богу, быць вартым, —павінна грунтавацца на веры.

Хрыстос сказаў: «Я быў галодны, Я быў голы, Я быў хворы, Я быў бяздомны, а вы прыйшлі мне на дапамогу». Уся нашая справа грунтуецца на веры паводле гэтых словаў.

Калі няма веры, гэта таму, што надта шмат себялюбства, надта шмат зацікаўленасьці ў асабістай карысьці. Каб вера была сапраўднай, трэба быць шчодрым і любіць. Любоў і вера разам: яны дапаўняюць адно адно.

Нашыя малітвы аб тым, каб Хрыстос аддаў Сваё сьвятло і жыцьцё кожнаму з нас, а праз нас сьвету бедных. Мы спадзяемся, што беднякі, якімі б ні былі іхныя вераваньні, убачаць нас і памкнуцца да Хрыста і захочуць, каб мы прыйшлі да іх, увайшлі ў іхнае жыцьцё. Перад Богам мы ўсе беднякі.

Маладыя — будаўнікі заўтрашняга дня. Сёньня моладзь у пошуку бескарысьлівасьці, і калі знаходзіць яе, то гатовая захапіцца ёю.

У Гарлеме адна маладая жанчына з багатай сям'і прыехала да нас на таксі і сказала мне: «Я аддала ўсё бедным і прыйшла, каб ісьці за Хрыстом».

Часам Хрыстос атрымлівае незвычайныя знакі ўвагі. Аднойчы ўвечары ў Лёндане мне патэлефанавала паліцыя: «Маці Тэрэза, тут на вуліцы адна вельмі п'яная жанчына кліча вас». Мы выйшлі да яе і на зваротным шляху яна кажа мне: «Маці Тэрэза, Хрыстос абярнуў ваду ў віно, каб мы мелі што піць». А яна была вельмі, вельмі п'яная!

Гэта важна для кожнай асобы. Калі нехта думае і верыць, што ягоны або ейны шлях ёсьць адзіным шляхам да Бога, калі яны ня ведаюць іншага шляху, не сумняваюцца і не адчуваюць неабходнасьці шукаць іншага, значыць гэта ёсьць іхны шлях збавеньня, шлях, якім Бог прыходзіць у іхнае жыцьцё. Але з моманту, калі душа атрымлівае ласку пазнаньня Бога, яна павінна пачаць пошук. А калі яна не шукае, то збочвае з праўднага шляху. Але Бог дае ўсім душам, створаным ім, шанец сустрэць Яго і прыняць Яго або адрынуць Яго.

Так, хрысьціяне зьяўляюцца сьвятлом для іншых. Калі мы —хрысьціяне, мы павінны сутокміцца Хрысту. Я вельмі глыбока веру ў гэта. Аднойчы Гандзі сказаў, што калі б хрысьціяне жылі цалкам хрысьціянскім жыцьцём, то ў Індыі не засталося б індусаў. Людзі чакаюць ад нас, каб мы жылі цалкам хрысьціянскім жыцьцём.

Бог мае Свае ўласныя спосабы і шляхі ўзьдзеяньня на сэрцы людзей, і мы ня ведаем, наколькі яны наблізіліся да Яго. Але ў іхных учынках мы заўжды маем сьведчаньне іхных адносінаў да Яго, адгукаюцца яны Яму або не. Мусульманін, індус або хрысьціянін, якім чынам вы жывеце — гэта і ёсьць мера вашай прыналежнасьці да Бога. Мы ня можам абвінавачваць або судзіць, або казаць словы, што могуць параніць. Магчыма, чалавек ніколі ня чуў пра хрысьціянства; калі так, мы ня ведаем, якім чынам Бог зьяўляецца ў ягонай душы і як Ён кіруе душой, што служыць Ягонай справе. Якім правам тады мы можам абвінавачваць каго-небудзь?

Пераклаў з англельскай Валеры Буйвал

Пра «маральнасьць» схаванага забойства

Публічныя пакараньні злачынцаў у Чачэніі ў верасьні расейскія мас-мэдыя выкарысталі як нагоду для чарговай прапагандысцкай акцыі супраць краіны, якая змагаецца за сваю незалежнасьць ад Расеі. Паглядзіце, маўляў, якія дзікуны чачэнцы і адчуйце пры гэтым, наколькі цывілізаваная Расея, — пішуць «Известия». —А ўявіце, калі ім даць незалежнасьць, то якое сярэднявечча яны там разьвядуць. І яшчэ — як цяпер на нас будзе глядзець Эўропа? І потым — як яны пасьмелі забіць людзей не паводле расейскіх законаў?

Сьледам за расейскімі ўсхадзіліся і афіцыёзныя СМІ РБ: «Практычна немагчыма паверыць у тое, што адбылося пазаўчора ў цэнтры Грознага, на плошчы Дружбы народаў (!) — піша адна аглядальніца. — Публічнае пакараньне — зьява па сваёй сутнасьці страшная». І далей: «Пра якую цывілізаваную дзяржаву можна весьці размову, калі правасудзьдзе чыніцца з дапамогай сярэднявечных мэтадаў?» І нарэшце: «Сёньняшні сьвет жорсткі. І я ведаю, што яшчэ дастаткова многія людзі да самой ідэі публічнага пакараньня ставяцца хутчэй з ухвалай, чым з асуджэньнем. Маўляў, каб іншым непавабна было... Але жорсткасьць заўсёды спараджае жорсткасьць. А калі жорсткасьць узводзіцца яшчэ і ў ранг дзяржаўнай палітыкі — якая будучыня чакае такую краіну, якіх дзяцей яна выхавае?»

Шуміха відавочна прапагандысцкая, бо сама падзея ніяк ня цягне на высновы палітычнага і геапалітычнага ўзроўню. Тэма абмеркаваньня можа быць толькі этычная. І вось тут не чачэнцы, а менавіта расейскія ды нашы журналісты зьдзіўляюць сваёй недасьведчанасьцю і цынізмам.

Сьмяротная кара — гэта не пакараньне, бо якія ўрокі мёртваму? Гэта нават ня помста, бо хто каму помсьціць? Гэта банальная палітычная падпорка ўладаў, якія нічым іншым ня могуць сьцьвердзіць свой аўтарытэт.

Даўно даведзена, што сьмяротная кара не ўплывае ані на статыстыку злачынстваў, ані — што зразумела — на тых злачынцаў, якіх забіваюць. У так званых цывілізаваных краінах сьмяротную кару, як правіла, адмяняюць. І матывуюць гэта тым, што жыцьцё ня можа забраць той, хто ня здольны яго даць. Або тым, што ніякі суд не выключае магчымасьці памылак. Што да нашых умоваў, то этычная гутарка можа весьціся пра стан розумаў у грамадзтве, а не пра спосаб забойства злодзея: публічны ці таемны, расстрэл або забіваньне камянямі. Бо чым «открытая демонстрация государственной жестокости» лепшая, чым «закрытая» — рытарычнае пытаньне.

Калі злачынцу расстрэльвае прапаршчык-кантралёр у адной з камэраў менскай турмы, то ў гэтым дзеяньні ані на каліва ня больш маральнасьці, чым ва ўчынку ката, які адсякае вам галаву на рынкавым пляцы. Наадварот, менавіта патаемнае забойства французкі філёзаф і пісьменьнік Альбэр Камю лічыў больш амаральным. І вось чаму.

Рана ці позна ўвесь сьвет прыйдзе да адмены сьмяротнае кары. У гэтым не сумняваецца нават беларускі электарат, які нядаўна масава прагаласаваў за захаваньне расстрэльных артыкулаў у Крымінальным Кодэксе. Але самі людзі звычайна тлумачаць, што гэта яны сёньня за сьмяротную кару, калі ў краіне разгул злачыннасьці, а ў будучыні яны безумоўна супраць.

Дык вось Камю заклікаў учыняць сьмяротнае пакараньне менавіта публічна, каб людзі, якія зьбіраюцца на плошчы; на свае вочы бачылі тое, за што або супраць чаго яны будуць галасаваць на чарговым рэфэрэндуме. Калі дзяржава, забіваючы злодзея, учыняе справядлівы акт, — пісаў Камю, — то няхай яна робіць гэта публічна, няхай кат будзе папулярнай у народзе асобай, сымбалем справядлівасьці і непазьбежнасьці пакараньня.

Дарэчы, у нас у Беларусі злачынцаў забіваюць ціха і ў поўнай невядомасьці. Зрэдку статыстыка трапляе ў прэсу. Колькасьць пакараных трымаецца ў памерах ста чалавек за год. Пры гэтым адзначаецца, што прэзыдэнт яшчэ не памілаваў ніводнага злодзея.

Беларусы — не чачэнцы. Яны старанна хаваюць свае няправедныя ўчынкі. Няма сумневу, што калі б расстрэлы праводзіліся ў Менску на цэнтральнай плошчы, то прыхільнікі сьмяротнае кары засталіся б у нас у меншасьці. Гэта, бадай, адзіная выснова, якую з чачэнскага выпадку можна зрабіць нам.

Сяргей Паўлоўскі

РАМАНЮК

На сваё вясельле ён уласнымі рукамі пашыў строй сваёй нявесьце. Ён мог зрабіць амаль усё: намаляваць натурморт, напісаць кнігу, зрабіць фатаграфію, узараць зямлю, скраіць апратку...

Пабачыўшы сьвет у вёсцы Кавалі на Брагіншчыне, Міхась Раманюк гадаваўся ў сэрцы краю, на Койданаўшчыне. Гэтак у ім самім увасобілася Беларусь. У адрозьненьне ад большасьці нашых мастацтвазнаўцаў, якія атрымлівалі сваю навуку ў Расеі, альбо Ўкраіне, Раманюк стаў навукоўцам тут, на Радзіме. Трыццаць гадоў беларускіх дарог... Менавіта столькі спатрэбілася Міхасю Раманюку, каб стаць тым чалавекам, якім яго ведаюць у сьвеце. Па сканчэньні тэхнікуму, дзе ён быў ці не адзіным хлопцам-шаўцом, Раманюк паступае ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. З тае пары пачаўся шлях...

Бадай, не засталося ў Беларускай зямлі такіх кутоў, куды б ня трапіў ягоны руплівы позірк. Адметная дэталь вясковае архітэктуры або вопраткі або краявіду, прылада працы зараз жа фатаграфавалася і замалёвалася, нячутае раней слова або прымаўка занатоўвалася. Усё, што спыняла на сабе ўвагу — фіксавалася. Гэтак вёска за вёскай, за годам год ён «прачасаў» усю Беларусь. Дзёньнік падарожніка складае многія дзясяткі тамоў. Фатаздымкі, занатоўкі, красьлюнкі, вопісы ўтварылі той грунт, на якім паўстала гісторыя народнага строю. Дзякуючы жывой палявой працы Раманюк стварыў глябальную сыстэму клясыфікацыі нацыянальнага ўбору, творча і навукова асэнсаваў рэгіянальныя і лякальныя асаблівасьці вопраткі. Картатэка Міхася Раманюка налічвае звыш 100.000 адзінак унікальнага матэрыялу, сабранага ўласнымі рукамі. Гэтыя рэчы ў руках навукоўца раскрылі вялізарны сьвет беларускае эстэтыкі, яе сэмантыку, якая сёньня ўжо патрабуе спэцыяльнае расшыфроўкі. Ён толькі падступіў да гэтых шыфраў...

Упершыню ў гісторыі беларускае этнаграфіі і мастацтвазнаўства менавіта Міхась Раманюк ажыцьцявіў навуковае раянаваньне нацыянальнага строю на падставе традыцыйных комплексаў адзеньня розных рэгіёнаў краіны.

Раманюк, як навуковец і мастак, стаў аўтарам безьлічы артыкулаў, многіх буклетаў і кніг па этнаграфіі й гісторыі мастацтва, якія выходзілі ў Беларусі і ў Польшчы, Расеі, Францыі. Найбольш вядомыя зь іх: «Беларускае народнае адзеньне», «Costume nationales Bielarusse», «Народны касьцюм Чачэрска і ваколіцаў», «Песьні і строі Піншчыны», сэрыя буклетаў-постэраў «Беларускі нацыянальны касьцюм». Гэтыя выданьні яшчэ пры ягоным жыцьці сталі клясыкай...

Асобная старонка ў творчасьці Раманюка — артыкулы й ілюстрацыі да беларускіх энцыкляпэдыяў. Празь ягоныя словы, у сьціслых энцыкляпэдычных дэфініцыях мы сёньня можам дазнацца амаль пра ўсё, што тычыцца беларускага ткацтва й адзеньня. Ён увёў ва ўжытак многія навуковыя тэрміны, якія найперш былі пачутыя ім на беларускіх дарогах.

На падставе шматгадовае практыкі ён стварыў нарматыўныя графічныя рэканструкцыі рэгіянальных строяў. Гэткімі, якімі ён іх прадставіў, яны й застануцца, бо ён быў апошнім з навукоўцаў, хто бачыў народную вопратку ва ўжытку. На ягонай роднай Брагіншчыне, як і ў іншых чарнобыльскіх раёнах, сёньня наогул мала што засталося. Раскіданыя гнёзды... Прадчуваючы гэта, ён зьбіраў ацалелае, фатаграфаваў, занатоўваў, ратаваў беларускасьць для Беларусі.

Графічныя працы Міхася Раманюка, якія прадстаўляюць цэлы сусьвет народнага мастацтва, эскізы тэатральных, народных, сцэнічных касьцюмаў зьберагаюцца сёньня ў зборах Нацыянальнага мастацкага музэю Беларусі, Музэю дэкаратыўнага мастацтва Расеі, Нацыянальнага музэю гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Беларусі, у іншых музэях Менску, Магілёва, Віцебску, Брэста, у калекцыях ЗША, Канады, Італіі, Нідэрляндаў, Францыі. Адзін з апошніх ягоных праектаў — вялікія акварэлі ўсіх беларускіх строяў, пакуль яшчэ мала хто бачыў. Некаторыя малюнкі з гэтай сэрыі зьявіліся на паштовых марках — адна зь ягоных мараў, якая ўрэчавілася: каб усе беларусы трымалі ў руках сьведчаньне свае тоеснасьці...

Яшчэ адзін праект, які ён не пасьпеў зьдзейсьніць: гісторыя беларускай фатаграфіі. Калекцыя Раманюка налічвала дзясяткі тысячаў паштовак, здымкаў і нэгатываў з усёй Беларусі ад пачатку стагодзьдзя. Разам зь яго ўласнымі здымкамі — суцэльная непарыўная панарама... Нават тое, што Раманюк здымаў сам у 60-70-я гады, ужо не існуе. Ён распавядаў пра гэта з болем, з адчаем, але ніколі не расчароўваўся ў тым, што рабіў. Ён прагнуў паказаць скарбы — этнаграфічныя калекцыі, свае малюнкі, здымкі, але здолеў зрабіць гэта толькі чатыры разы: два разы ў Беларусі й два разы ў Францыі. Першая выстава ў Менску адбылася ў 1981-м, а другая, у Нацыянальным мастацкім музэі, аж праз трынаццаць гадоў, дзякуючы падтрымцы... паўднёвакарэйскае фірмы. Калі да прыезду Яна Паўла II у Вільню спатрэбіўся беларускі строй для дзяўчыны, што мусіла вітаць Папу па-беларуску, Міхась Раманюк адразу ж пагадзіўся даць унікальныя рэчы са свае калекцыі. Гэты строй з Магілёўшчыны на віленскай дзяўчыне пабачылі мільёны людзей...

Рэдагаваў часопіс «Мастацтва Беларусі», ствараў касьцюмы хору Цітовіча, кансультаваў «Беларусьфільм», узначальваў кафедру гісторыі й тэорыі мастацтва ў Акадэміі мастацтва... Для каго іншага гэтага й хапіла б. Але Міхась Раманюк змагаўся за Беларусь. Змагаўся кожны дзень, усё жыцьцё. І тады, калі пра гэта можна было гаварыць паўшэптам на кватэрах ды па майстэрнях, і тады, калі пара было крычаць. Яго можна было пабачыць ледзь не на кожным мітынгу, поруч са сваімі вучнямі. Летась, падчас менскае вясны, на мітынгу ў абарону Канстытуцыі, ён стаяў са сьцягам каля помніка Багдановічу. Невысокі чалавек у барэце трымаў у руках вялізарны бел-чырвона-белы штандар з годнасьцю, вітаючы тую вясну...

Ён застанецца апошнім клясычным этнографам у Беларусі. Такі збор твораў народнае культуры, які ён пачаў зьбіраць з 60-х, не зьбярэ ўжо ніхто — аўтэнтычная матэрыяльная культура беларусаў сышла ў нябыт, палегла ў музэйныя сховы, альбо расьцярушылася ў часы пераменаў... Беларуская клясычная этнаграфія, народжаная ў пачатку XIX стагодзьдзя, якая базавалася на палявых візуальных досьледах, на вывучэньні сувязяў паміж духоўнай, рэлігійнай і матэрыяльнай культурамі беларусаў, на паралельным аналізе з суседнімі народамі, была зацёртая ў 30-50-я гады нашага часу. Толькі ў 60-я зьявіліся першыя працы з гісторыі беларускай этнаграфіі Бандарчыка, Піліпенкі, Фядосіка. І з гэтага ж часу пачаў сваю навуковую дзейнасьць Раманюк, які адрадзіў традыцыйнае разуменьне этнаграфіі: выяўляць тое, што сьведчыць пра талент народа, а не пра ягонае «жабрацтва» да бальшавіцкага «раю». Істотна і тое, што Раманюк зьбіраў таксама сьведчаньні «рэлігійных перажыткаў». Іншыя этнографы абіралі больш «прахадную» тэматыку: гаспадарчую дзейнасьць ці «новыя традыцыі», абапіраючыся на марксісцка-ленінскую тэорыю. Ён гэтага здолеў унікнуць. Рукапіс ягонае кнігі пра пахавальны абрад беларусаў, мэмарыяльную народную сэмантыку, са здымкамі соцень крыжоў, гэтак і застаўся ненадрукаваным. Як і альбом маляваных дываноў. Як і альбом маляваных куфраў. Як і вялікі стос ужо пажоўклых дзёньнікаў...

Ён застанецца першым кіраўніком першае вышэйшае школы мастацтвазнаўства ў Беларусі. Доўгія гады атрымаць такую адукацыю ў нас было немагчыма. Усё новыя і новыя кадры «каваліся» на Ўсходзе. Толькі напрадвесьні перабудовы стала магчымым стварыць сваю школу. І яе стварэньне ачоліў Раманюк. Спачатку гэта быў, першы ў Беларусі, ягоны курс лекцыяў з гісторыі беларускага мастацтва. Яшчэ адна выспачка беларушчыны. Талент і абаяльнасьць выкладчыка гартавалі патрыётаў. Дзе б ён ні чытаў свае лекцыі, у Менску ці ў Вільні, ніхто ня мог не зьдзіўляцца ягонай пасіянарнасьці, красамоўству ўлюбёнага ў свой народ чалавека. Толькі зь незалежнасьцю адбыўся першы набор на стацыянарнае навучаньне. Гэтым летам Міхась Раманюк вітаў першых выпускнікоў свае школы. Гэтым летам яго ня стала.

Сяргей Харэўскі

Бібліяграфія Міхася Раманюка

I. ВУЧЭБНА-МЭТАДЫЧНЫЯ ПРАЦЫ

1. Беларускае народнае адзеньне. Камплект паштовак. Разам з Ул.Савічам. – Менск: Беларусь, 1981
2. Калінкавіцкі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1989
3. Ляхавіцкі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1989
4. Гісторыя матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі. Праграма для спэцыяльнасьцяў: мастацкае праектаваньне вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасьці; дэкаратыўна-прыкладное мастацтва; дызайн; інтэр'ер і абсталяваньне; праектаваньне выставаў і рэклямы. – Менск: БелАМ, 1991
5. Пінска-Івацэвіцкі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1992
6. Маларыцкі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1992
7. Ваўкавыска-Камянецкі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1992
8. Кобрынскі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1992
9. Турава-Мазырскі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1992
10. Неглюбскі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». –Менск: Полымя, 1992
11. Капыльска-Клецкі строй. Сэрыя «Беларускі нацыянальны касьцюм». – Менск: Полымя, 1992
12. Беларускі народны касьцюм. Праграма для спэцыялізацыяў: мадэляваньне касьцюма; мастацкае афармленьне тэкстыльных вырабаў. – Менск: БелАМ, 1993
13. Народны касьцюм Чачэрска і ваколіц. – Менск: Бел. ін-т праблем культуры, 1994
14. Гісторыя спэцыяльнасьці (Беларускі народны тэкстыль). Праграма для спэцыяльнасьці: мастацкае праектаваньне вырабаў тэкстыльнай і лёгкай прамысловасьці. – Менск: БелАМ, 1995

Працяг на старонцы 15

інфармацыйнае забеспячэнне
Belorusian Public Relations Association

ІНФАРМАТАР

БЯСПЛАТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Матэматыка. Падрыхтоўка ў ВНУ. Дацэнт ВНУ. Тэл.: (017) 226-78-19

Польская, чэская і славацкая мовы. Тэл.: 248-79-94, Алена

Віншуем Зьміцера Сямашку і Дыяну Сухараву зь Менску з днём Вясельля. Жадаем моцнага здароўя, шмат дзетак і вялікага каханьня. Татулька

Аднолькава небясьпечна й звар'яцеламу даць у рукі меч, і несумленнаму ўладу. Піфагор

«NRM»! «Крама»! Давайце новыя альбомы!!! Мы чакаем!!! Жыве беларускі рок!! Жыве Беларусь!! Вашыя Хванаты

У Сьв. Петра-Паўлаўскім саборы (на Нямізе) кожную сераду а 17 гадзіне а. Георгій Латушка ладзіць набажэнствы ПА-БЕЛАРУСКУ. Праваслаўнае брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў

Zaprašajem liėvinaŭ pravaradykalnaha, manarchičnaha kirunku. Liėviny, nadyšoŭ čas hurtavacca! Adrodzim VKL! Nie — pscŭdaadradžėnniu. Aleś Čorny

З нагоды выхаду 20-га нумару газэты «Тыднёвік Магілёўскі» віншуе сваіх чытачоў. Ужо бліжэй да Вольнай Беларусі! Рэдакцыя

Прадаюцца кацяняты элітарнай коткі Тэклі. Зьвяртацца да Касі Камоцкай. Тэл.: 266-31-16

Шукаем кантактаў зь беларускамоўнымі сем'ямі, якія маюць дзяцей дашкольнага веку. Уладзімер і Алена. Тэл.: 246-55-59

Запрашаем у беларускамоўнае асяродзьдзе, дзе Вы спраўдзіце патрэбу ў духоўных стасунках. Даведкі штосерады з 17.00 да 18.00. Тэл.: 265-74-12

Ствараем бібліятэку для беларускамоўных. З падзякай прымем кнігі, газэты, часопісы. (Як чытачам Вам яшчэ й карысьць). Тэл.: 240-78-01, Віталь, з 15.00 да 21.00

Дзяўчыну, якая прынесла касэты з запісамі Данчыка, прашу патэлефанаваць. Тэл. у Гомелі: 48-85-42

Кірыліца ці лацінка? Выбірайце, прачытаўшы: «Наша Слова» (1995, №50 (+51 с.8), «Наша Ніва» №6 (36), «Свабодные новости — плюс» (1996, №5, с. 12 («Амстэрдамец Ільля Капіевіч»)

Прадаю тэксты гурта «Камэлот» з акордамі. Кошт 10.000 руб. 220085. Менск а/с 5. Віталь, Тэл.: 49-08-88, 31-04-08

Малады беларускамоўны некамэрцыйны гурт «Інтэльмэдыя» шукае бас-гітарыста. Тэл.: 48-47-42. Руслан

Прадаю запісы Gods Tower, Plastic Hardcoe, Sarcastis Green і іншыя ангельскамоўныя беларускія гурты. 220085 Менск, а/с 5. Тэл.: 31-04-08 і 49-08-88, Віталь Супрановіч

Беларускі нацыяналіст (37 гадоў) пазнаёміцца з жанчынай для сур'ёзных адносінаў, пажадана з в/а і безь дзяцей. 220023, Менск-23, а/с 13

Мне 20 гадоў. Шукаю сяброў. Менск-73, а/с 11, Максім

Шчыра віншую лепшага сябра Пецю з 17-годзьдзем. Жадаю здароўя, посьпехаў, радасьці і шчасьця. Насьцік

Шчыра віншую лепшага сябра Пецю з 17-годзьдзем. Жадаю здароўя, посьпехаў, радасьці і шчасьця. Насьця зь Нікіфарава

Шчыра віншую лепшага сябра Пецю з 17-годзьдзем. Жадаю здароўя, посьпехаў, радасьці і шчасьця. Насьця зь Нікіфарава

Шчыра віншую лепшага сябра Пецю з 17-годзьдзем. Жадаю здароўя, посьпехаў, радасьці і шчасьця. Анастасія International

Шчыра віншую лепшага сябра Пецю з 17-годзьдзем. Жадаю здароўя, посьпехаў, радасьці і шчасьця. Настулька

Прадаю кнігі «Менская вясна-96», «Аршанская шляхта», «Віцебскі сшытак» №1, №2, «Біблія. Кніга роду» і інш. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 49-08-88, 31-04-08. Віталь

Спадару Балахонаву з Гомеля патэлефанаваць Віталю наконт кніжак: 52-04-33

Прадам пафарбовачную машыну высокага ціску, 380V «Вагнэр», Швэйцарыя, б/в, ЗІП, 236-58-89, Сяргей

Прадаецца дом з участкам на ўскрайку Віцебска. Тамара, Сяргей. Тэл: (021) 2372580

Паслугі ксэракапіяваньня, выгадна. Тэл.: 253-92-26

Праца дома, $150 у дзень. 2 капэрты з зв/а + купон б/а. 220073, Менск, а/с 26

Прадам падручнік ірляндзкае мовы (польскі). Тэл.: 255-82-38

Вышлю затанна ёгаўскую нетрадыцыйную мэтодыку «Супэрцела». Разьвіцьцё сілы мышцаў без трэнажораў, «хіміі» і вялікіх стратаў часу. Ад вас капэрта са зв/а + купон. 225710 Пінск-16, а/с 19

Праца дома, апрацоўка буклетаў. $15 у дзень. Капэрта з зв/а + купон б/а. 220073, Менск, а/с 26

БМВ-316, карбюратар, 1,8 л, сьвежая гума, люк, эл/люстэркі, купэ, магнітола, размытненая, ТА да 1999 г. прадаю за 1650 у.а. Тэл.: 14-74-21

БМВ-316, 1,8 л, бэнзын, гума, люк, эл/люстэркі, купэ, магнітола, прадаю за $1650. Тэл.: 14-74-21, 30-29-48

Рэклямна-інфармацыйная праца дома, 150 т. руб. у дзень. Капэрта з зв/а + купон б/а. 220082, Менск, а/с 53

Ксэракапіяваньне, А-4, 500 руб. Тэл.: 253-92-26

КУПОН

Бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча

Адрас, тэлефон

НАША НІВА

Запоўніце гэты купон і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220123, Менск, а/с 71

БЕЛАРУСКІ ПАТРЫЯТЫЧНЫ СЬПЕЎНІК



«Наша Ніва» супольна з камэрным мужчынскім хорам «Унія» працягвае стварэньне сучаснага Беларускага патрыятычнага сьпеўніка. Апрацаваныя намі тэксты і ноты песень будуць друкавацца на старонках газэты, а вынікам праекту стане кніга «Беларускі патрыятычны сьпеўнік» і аднайменная аўдыёкасэта або CD у выкананьні хору «Унія». Распачалі новы праект мы зь беларускага нацыянальнага гімну «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Наступнаю была гістарычная песьня «Бітва пад Воршай». Сёньня — маршоўка «У гушчарах».

У ГУШЧАРАХ

Словы Н.Арсеньневай
Музыка М.Куліковіча

У гушчарах, затканых імглою,
Шэрым змрокам, на золку зару
Ахвяруем табе мы сабою
Кожны дзень, кожны час, Беларусь.

І няма ў сэрцы жалю ды страху,
Мы адвагай юнацкай гарым,
Не чужыя варожыя сілы,
Толькі ты нас вядзеш да зары.

Хмараў дым над абшарамі тае,
Вецер дыхае мятай, быльлём.
Беларусь, Беларусь залатая,
За цябе, за цябе мы ідзём!

ДОМ ЛІТАРАТАРА

8 КАСТРЫЧНІКА СЕРАДА
«Заўсёды і ўсюды ў сэрцы маім малітва адна — Айчына». Вечарына, прысьвечаная 80-ым угодкам нараджэньня народнага паэта Пімена Панчанкі
18.00
Вялікая заля
15 КАСТРЫЧНІКА СЕРАДА
Сэкцыя паэзіі
15.00
Канфэрэнц-заля
17 КАСТРЫЧНІКА ПЯТНІЦА
«Канвэер». Спэктакаль паводле пьесы Міхася Карпечанкі ў пастаноўцы народнага тэатру
18.00
Вялікая заля
21 КАСТРЫЧНІКА АЎТОРАК
Сэкцыя прозы
15.00 Канфэрэнц-заля
22 КАСТРЫЧНІКА СЕРАДА
«Няскораная чалавечнасьць». Вечарына памяці, прысьвечаная 70-годзьдзю Алеся Адамовіча
18.00
Вялікая заля
23 КАСТРЫЧНІКА ЧАЦЬВЕР
Сэкцыя перакладу
15.00
Канфэрэнц-заля
29 КАСТРЫЧНІКА СЕРАДА
«Мы — маладая рунь». Часопісу маладых літаратараў «Першацвет» — 5 гадоў
18.00
Вялікая заля
30 КАСТРЫЧНІКА ЧАЦЬВЕР
Сэкцыя літаратуры для дзяцей і юнацтва
15.00
Канфэрэнц-заля
САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!
г. Менск, вул. Фрунзе, 5
Тэл.: 236-09-09 Уваход вольны

ДАКУМЭНТЫ ТБМ

ПРЭС-РЭЛІЗ

25 жніўня 1997 году каля кінатэатра «Кіеў» з 17 да 19 гадзінаў Таварыствам Беларускай Мовы імя Ф.Скарыны быў праведзены пікет з мэтай пратэсту супраць закрыцьця беларускамоўных клясаў і школ. Мэта пікету была выкліканая абвальным закрыцьцём беларускамоўных клясаў, пераводам школ са статутам беларускамоўных на расейскую мову навучаньня. Так, у Менску няма ні адной беларускай школы, а з 130 школ са статутам беларускамоўнай засталося толькі 17. Такая ж сытуацыя і ў краіне.

У пікеце брала ўдзел каля 50 чалавек. Заяўку на правядзеньне пікету падпісалі намесьнікі старшыні ТБМ А.Трусаў і Л.Дзіцэвіч.

Акцыя выклікала вялікую цікаваць у жыхароў Цэнтральнага раёну, сабрала грамаду людзей розьнага веку, якія абмяркоўвалі адукацыйныя, сацыяльныя, бытавыя праблемы, вялі дыялёгі з удзельнікамі пікету.

Найбольшую ўвагу людзей прыцягнулі плякаты наступнага зьместу: «Камусьці вельмі зручна, калі народ нямы», «Зьнявага да мовы — зьнявага да народа», «Беларуская школа — незалежнасьць», «Толькі вораг аллёўвае беларускую мову», «Не адбірайце будучыню ў нашых дзяцей».

Парадак падчас пікету забясьпечвалі супрацоўнікі гарадзкой міліцыі.

Прэс-служба сакратарыяту Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны

ВУЧОБА Ў ВІЛЬНІ

Віленскі пэдагагічны ўнівэрсытэт на конкурсных падставах набірае студэнтаў на 1 курс факультэта славістыкі на спэцыяльнасьці:

беларуская мова, літаратура і гісторыя культуры;
беларуская і расейская мовы і літаратуры;
беларуская і польская мовы і літаратуры.

Навучаньне платнае.
Форма навучаньня: дзённая (4 г.), завочная (5 г.).
Прыём дакумэнтаў з 25.09.1997 да 01.11.1997.

1. Атэстат (арыгінал) альбо дыплём вышэйшае школы (выпіска).
2. Мэдычная даведка.
3. 4 фотакарткі (3х4)
4. Пашпарт.
5. Выпіска з працоўнае кніжкі (калі ёсьць).

Уступны іспыт — тэсты па беларускай мове.
Па даведкі, калі ласка, зьвяртацца на адрас:

Катэдра беларусістыкі ВПУ
Studentų, 39-527, Vilnius 2034, Lietuva
Тэл. у Вільні: 8-0122-725801, факс:
8-0122-26-03-17. Тэл. у Менску: 8-017-259-85-63.

Дакумэнты да Балтыйска-

Пачатак тэмы на старонцы 6.

№1

ЗАЯВА

дэлегацыяў дэпутацкіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі і Украіны

Прадстаўнікі Вярхоўнага Савету Літвы, фракцыі Народнага Фронту Латвіі ў Вярхоўным Савеце Латвіі, Апазыцыяў у Вярхоўным Савеце Украіны і Вярхоўным Савеце Беларусі 23-24 лістапада 1990 г. у горадзе Менску разгледзелі пэрспэктывы палітычнага, эканамічнага й гуманітарнага супрацоўніцтва паміж Балтыйскімі краінамі, Беларусяй і Украінай, а таксама магчымасьці доўгачасовага ўзаемадзеяньня й каардынацыі сумесных намаганьняў у дасягненьні незалежнасьці гэтых краінаў.

Адзначаючы беспэрспэктыўнасьць далейшага існаваньня СССР і жыцьцёвую неабходнасьць палітычнай стабільнасьці ў Балтыйска-Чарнаморскім рэгіёне ва ўмовах распаду імпэрскай структуры, дэлегацыі заяўляюць пра мэтазгоднасьць садружнасьці дзяржаваў гэтага рэгіёну на аснове прызнаньня сувэрэнітэту кожнай зь іх.

Дэлегацыі прыступілі да кансультацыяў па наступных пытаньнях:

1. Вызначэньне магчымасьці міждзяржаўных пагадненьняў аб палітычным, эканамічным і гуманітарным супрацоўніцтве гэтых дзяржаваў, а таксама аб умовах выводу савецкіх войскаў з Балтыйска-Чарморскага рэгіёну й стварэньня нацыянальных узброеных сілаў.

2. Магчымасьць утварэньня рабочых міжпарлямэнцкіх структураў дзеля садзеяньня міждзяржаўным перамовам ды абмену інфармацыяй.

Дэлегацыі дамовіліся ўнесьці прапанову ў Вярхоўныя Саветы сваіх рэспублік аб стварэньні кансультатыўных камісіяў і працягу шматбаковых кантактаў па праблемах садружнасьці і ўзаемаадносінаў дзяржаваў Балтыйска-Чарнаморскага рагіёну.

Дэлегацыі прынялі рэзалюцыі аб эканамічным супрацоўніцтве, аб гуманітарным супрацоўніцтве, аб падыходах да будаўніцтва нацыянальных узброеных сілаў дзяржаваў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну.

Ад дэлегацыі фракцыі Народнага фронту Латвіі ў Вярхоўным Савеце Латвійскай Рэспублікі
Міхаіл Сьцепічаў
Ад дэлегацыі Вярхоўнага Савету Літоўскай Рэспублікі
Віргіліюс Чапайціс
Ад дэлегацыі Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларускай ССР
Зянон Пазьняк
Ад дэлегацыі Апазыцыі (Народнай Рады) у Вярхоўным Савеце Украінскай ССР
Ляўко Лук'яненка

г. Менск
24 лістапада 1990 г.

№2

РЭЗАЛЮЦЫЯ

дэлегацыяў дэпутацкіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі і Украіны аб эканамічным супрацоўніцтве

Дэлегацыі прыйшлі да адзінага пункту гледжаньня, што пры ўмацаваньні незалежнасьці дзяржаваў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну мэтазгодна разьвіваць адзіны рынак гэтых краінаў.

Дзеля гэтай мэты дэлегацыі вырашылі:

I. Рэкамэндаваць Вярхоўным Саветам сваіх рэспублік:

прызнаць неабходным паважаць тэрытарыяльную цэласнасьць Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну;

прызнаць права ўласнасьці рэспублік на ўсю маёмасьць, якая знаходзіцца на іх тэрыторыі;

стварыць паўнамоцныя прадстаўніцтвы й інфармацыйныя цэнтры ў сталіцах бакоў, якія дамаўляюцца.

II. Рэкамэндаваць Урадам рэспублік, якія дамаўляюцца:

забясьпечыць умовы дзеля захаваньня й пашырэньня прамых гаспадарчых сувязяў паміж гаспадарчымі суб'ектамі рэспублік;

вызначыць галіны сумеснай гаспадарчай дзейнасьці й садзейнічаць яе разьвіцьцю;

прыняць меры да стварэньня агульных супрацьблякадных і страхавых фондаў;

праводзіць узгодненую палітыку разьдзелу залатога запасу й алмазнага фонду СССР.

Ад дэлегацыі франкцыі Народнага фронта Латвіі ў Вярхоўным Савеце Латвійскай Рэспублікі
Міхаіл Сьцепічаў
Ад дэлегацыі Вярхоўнага Савету Літоўскай Рэспублікі
Віргіліюс Чапайціс
Ад дэлегацыі Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларускай ССР
Зянон Пазьняк
Ад дэлегацыі Апазыцыі (Народнай Рады) у Вярхоўным Савеце Украінскай ССР
Ляўко Лук'яненка

г. Менск
24 лістапада 1990 г.

№3

РЭЗАЛЮЦЫЯ

дэлегацыяў дэпутацкіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі, Украіны пра стварэньне нацыянальных узброеных сілаў

1. Дэлегацыі, захоўваючы прыярытэт міжнароднага права, прызнаючы прынцыпы Хельсінскіх пагадненьняў, выступаючы за захаваньне стабільнасьці ў Балтыйска-Чарнаморскім рэгіёне, падтрымліваюць імкненьні краінаў рэгіёну стаць дзяржавамі, якія ня будуць мець зброі масавага зьнішчэньня.

2. Дэлегацыі лічаць неабходным стварэньне нацыянальных узброеных сілаў, выказваюцца за кансультацыі і каардынацыю дзеяньняў у працэсе іх утварэньня, за сяброўскія адносіны паміж імі.

3. Дэлегацыі, выступаючы за правядзеньне перамоваў з урадам СССР па пытаньнях часовага знаходжаньня й статусу Ўзброеных Сілаў СССР на тэрыторыі краінаў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну, заяўляюць аб недазваляльнасьці праяўленьня з боку ўзброеных сілаў СССР палітычнай актыўнасьці і ўмяшальніцтва ў якой-небудзь форме ва ўнутраныя справы сувэрэнных дзяржаваў.

4. Дэлегацыі рэкамэндуюць сваім урадам каардынаваць дзеяньні дзеля забесьпячэньня вайсковай і альтэрнатыўнай службы грамадзян, аказваць узаемнае садзеяньне ў пытаньнях выкананьня правоў чалавека ў адносінах да вайскоўцаў і садзейнічаць вяртаньню іх для праходжаньня службы ў межах свіх дзяржаваў.

5. Дэлегацыі прапаноўваюць сваім урадам прадпрымаць намаганьні дзеля ўрэгуляваньня праблемаў добраахвотнага вяртаньня вайскоўцаў, якія знаходзяцца ў запасе і ў адстаўцы (зь сем'ямі), на тэрыторыі тых рэспублік, зь якіх яны набіраліся.

Ад дэлегацыі фракцыі Народнага Фронту Латвіі ў Вярхоўным Савеце Латвійскай Рэспублікі
Міхаіл Сьцепічаў
Ад дэлегацыі Вярхоўнага Савету Літоўскай Рэспублікі
Віргіліюс Чапайціс
Ад дэлегацыі Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларускай ССР
Зянон Пазьняк
Ад дэлегацыі Апазыцыі ў Вярхоўным Савеце Украінскай ССР
Ляўко Лук'яненка

г. Менск
24 лістапада 1990 г.

№4

РЭЗАЛЮЦЫЯ

дэлегацыяў дэпутацкіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі, Украіны аб гуманітарным супрацоўніцтве

ЭЎРАПЕЙСКІ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТАР

Асноўныя кантрольныя мэханізмы

Пачатак тэмы на старонцы 6.

ЭЎРАПЕЙСКАЯ КАНВЭНЦЫЯ АБ АБАРОНЕ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА І АСНОЎНЫХ СВАБОДАЎ

Эўрапейская канвэнцыя аб абароне правоў чалавека і асноўных свабодаў была заключаная ў 1950 годзе ў Рыме; для 15 урадаў, якія падісалі яе ў той час, яна ўвасабляла сабой «першыя крокі на шляху калектыўнага ажыцьцяўленьня некаторых з правоў, сфармуляваных ва Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека. За больш чым сорак гадоў, якія прайшлі ад часу яе ўступленьня ў сілу (1953 год), яна ператварылася ў сьпелы дакумэнт аб правах чалавека, магчыма, самы радыкальны і эфэктыўны з тых, што сёньня дзейнічаюць. Безумоўна, сваёй эфэктыўнасьцю яна ў значнай меры абавязаная палітычнай волі дзяржаваўудзельнікаў і іхнай агульнай сыстэме каштоўнасьцяў. Дзяржавы, якія ратыфікавалі Канвэнцыю, гэтым самым дабраахвотна прызналі абавязковую юрысдыкцыю Эўрапейскага суда па правах чалавека (арт. 46), а таксама на падачу індывідуальных пэтыцыяў (арт. 25).

Сама Канвэнцыя ўяўляе сабой міжнародную дамову, згодна якой дзяржавы — сябры Рады Эўропы абавязаліся гарантаваць некаторыя асновапаложныя правы чалавека ўсім асобам, якія знаходзяцца пад іхнай юрысдыкцыяй. Яе важнасьць абумоўленая ня толькі шыратой замацаваных за ёй правоў, але й мэханізмамі абароны, створанымі ў Страсбургу для расьсьледаваньня магчымых парушэньняў і для забесьпячэньня выкананьня абавязкаў, прадугледжаных Канвэнцыяй. Вядзецца сталы кантроль за ажыцьцяўленьнем Канвэнцыі з мэтай пашырыць абарону, якая ёй забясьпечваецца, як шляхам пашырэньня шэрагу гарантаваных правоў, так і шляхам удасканаленьня дзейных працэдураў.

Аднак ані сама Канвэнцыя, ані прадугледжаныя ёй мэханізмы не прызначаныя для падмены нацыянальных сыстэмаў абароны правоў чалавека. Іхная мэта — даць міжнародную гарантыю ў дадатак да права на кампэнсацыю страты, якая дзейнічае ў пэўных дзяржавах. У большасьці краінах - удзельніцах Рады Эўропы нормы Канвэнцыі сталі ўнутрыдзяржаўным правам, дзякуючы чаму любая асоба можа падаць у нацыянальны суд або іншы орган іск ці апэляцыю, заснаваныя беспасярэдна на яе палажэньнях.

Мэханізм міжнароднай абароны можа працаваць у двух рэжымах. Першы дазваляе любой дзяржаве-ўдзельніцы падаваць скаргу ў Эўрапейскую камісію па правах чалавека, калі яна лічыць, што іншая дзяржава-ўдзельніца не выконвае сваіх абавязкаў па Канвэнцыі. Другі, больш вядомы рэжым, дазваляе любой асобе зьвяртацца беспасярэдна ў гэту Камісію са скаргай на любую дзяржаву-ўдзельніцу, якая зрабіла асобую заяву аб прызнаньні кампэтэнцыі Камісіі ў пэўным пытаньні.

У адпаведнасьці з Канвэнцыяй, існуюць тры органы, якія здольныя паўплываць на вынік разгляду скаргі пэўнай асобы ці дзяржавыўдзельніцы:

— Эўрапейская камісія па правах чалавека;
— Эўрапейскі суд па правах чалавека;
— Камітэт міністраў Рады Эўропы.

ЭЎРАПЕЙСКАЯ КАМІСІЯ ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Эўрапейская камісія па правах чалавека адказвае за расьсьледаваньне ўсіх паведамленьняў аб магчымым парушэньні той ці іншай дзяржавай - удзельніцай Канвэнцыі, якія паступаюць: а) ад іншай дзяржавы-ўдзельніцы ці б) ад любой асобы (фізычнай або юрыдычнай), неўрадовай арганізацыі або групы асобаў, якія сьцьвярджаюць, што яны сталіся ахвярамі парушэньня; у другім выпадку гэта магчыма пры ўмове, што дзяржава, на якую пададзеная скарга, прызнала кампэтэнцыю Камісіі разглядаць пэтыцыі. З 1955 году, калі Камісія пачала сваю работу, яна зарэгістравала больш за 25 тысячаў заяваў, пераважная большасьць якіх было пададзеная асобамі і групамі.

Камісія складаецца з колькасьці сябраў, роўнай колькасьці дзяржаваў, якія дамаўляюцца. Яе сябры выбіраюцца Камітэтам міністраў Рады Эўропы. Будучы сябрамі Камісіі, якія выконваюць судовыя функцыі, яны поўнасьцю незалежныя і не прэзэнтуюць дзяржаву, яд якой былі выбранымі.

Працэдура работы Камісіі складаецца з двух этапаў. На першым этапе разглядаецца пытаньне аб прымальнасьці пэтыцыі. У Канвэнцыі зафіксаваны шэраг падставаў для прызнаньня пэтыцыі непрымальнай, і, толькі пераканаўшыся ў адсутнасьці такіх падставаў, Камісія можа прыступіць да разгляду скаргі па сутнасьці. Рашэньне аб непрымальнасьці пэтыцыі могуць прымаць камітэты ў складзе трох сяброў Камісіі, калі такое рашэньне зьяўляецца адзінагалосным і можа быць прынятым без далейшага разгляду справы. Прыкладна 90 працэнтаў рэгістраваных скаргаў адхіляюцца як непрымальныя. Рашэньні па пытаньні аб прымальнасьці зьяўляюцца канчатковымі.



Чарнаморскага Саюзу

Дэлегацыі лічаць неабходным садзеяньне разьвіццю культураў народаў балтыйскіх краінаў, Украіны й Беларусі. Дзеля рэалізацыі гэтага мэтазгодна ўзаемнае стварэньне культурных прадстаўніцтваў ва ўсіх нашых дзяржавах і актывізацыя сумесных дзеяньняў па адраджэньню гісторыка-культурнай самасьвядомасьці нашых народаў, а таксама:

стварэньне сумеснага навукова-папулярнага выданьня й сумеснай газэты на дзяржаўных мовах краінаў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну;

адкрыцьцё пры ўнівэрсытэтах аддзяленьняў па вывучэньню моваў, гісторыі і культуры балтыйскіх краінаў, Беларусі і Ўкраіны;

сумеснае забесьпячэньне падрыхтоўкі пэдагагічных кадраў для нацыянальных мяншыняў, якія прадстаўляюць нашыя народы;

фармаваньне аб'яднанай рабочай групы навукоўцаў-гісторыкаў для напісаньня гісторыі дзяржаваў Балтыйска-Чарнаморскага рэгіёну.

Ад дэлегацыі фракцыі Народнага Фронту Латвіі ў Вярхоўным Савеце Латвійскай Рэспублікі
Міхаіл Сьцепічаў
Ад дэлегацыі Вярхоўнага Савета Літоўскай Рэспублікі
Віргіліюс Чапайціс
Ад дэлегацыі Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларускай ССР
Зянон Пазьняк
Ад дэлегацыі Апазыцыі ў Вярхоўным Савеце Ўкраінскай ССР
Ляўко Лук'яненка

г. Менск
24 лістапада 1990 г.

№5
ЗВАРОТ
да Вярхоўнага Савету Ўкраінскай ССР

Дэлегацыі дэпутатскіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі і Ўкраіны на сумесным паседжаньні 23-24 лістапада 1990 г. у г. Менску канстатавалі ўскладненьне палітычнай сытуацыі, прычынай чаго зьяўляецца наступ прыхільнікаў захаваньня імпэрыі на дэмакратычныя сілы ў краінах Балтыйска-Чанаморскага рэгіёну.

У шэрагу акцыяў, накіраваных супраць народных прадстаўнікоў, якія актыўна выступаюць за дэмакратычныя пераўтварэньні й дэмантаж імпэрскай структуры СССР, факт найгрубейшага парушэньня правоў чалавека



і прынцыпаў дэмакратыі ў Вярхоўным Савеце Ўкраіны. Там безь якога-небудзь папярэдняга дэпутацкага дасьледаваньня паводле рашэньня кансэрватыўнай большасьці быў пазбаўлены дэпутацкага імунітэту й арыштаваны ў будынку парлямэнту 17 лістапада 1990 г. былы вязень сумленьня народны дэпутат УССР Сьцяпан Хмара.

Тое, што адбылося, на наш погляд, датычыцца ня толькі ўкраінскага парлямэнту, таму што сьведчаць пра існаваньне рэальнай пагрозы расправы з дэмакратычнымі сіламі і ў іншых рэспубліках.

Дэлегаты дэпутацкіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі і Ўкраіны выказваюць занепакоенасьць тым, што адбылося, і зьвяртаюцца да Вярхоўнага Савету Ўкраіны з настойлівай прапановаю перагледзець сваё рашэньне адносна прававой дыскрымінацыі народнага дэпутата УССР Сьцяпана Хмары ды забясьпечыць ягонае неадкладнае вызваленьне, незалежнае й адкрытае разгледжаньне справы адпаведна з Хельсінскімі пагадненьнямі, Дэклярацыяй правоў чалавека і Дэкларацыяй аб дзяржаўным сувэрэнітэце Ўкраіны.

Ад дэлегацыі фракцыі Народнага Фронту Латвіі ў Вярхоўным Савеце Латвійскай Рэспублікі
Міхаіл Сьцепічаў
Ад дэлегацыі Вярхоўнага Савету Літоўскай Рэспублікі
Віргіліюс Чапайціс
Ад дэлегацыі Апазыцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Беларускай ССР
Зянон Пазьняк
Ад дэлегацыі Апазыцыі ў Вярхоўным Савеце Ўкраінскай ССР
Ляўко Лук'яненка

г. Менск

№6
ТЭЛЕГРАМА
сэсіі Вярхоўнага Савету РСФСР

Паважаныя калегі!

Мы, удзельнікі сустрэчы дэпутацкіх групаў Вярхоўных Саветаў Латвіі, Літвы, Беларусі і Ўкраіны, якія сабраліся ў Менску з мэтаю абмеркаваньня пэрспэктывы пашырэньня палітычнага, эканамічнага й культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі, вітаем плённую працу Вярхоўнага Савету па ўмацаваньню сувэрэнітэту Расеі.

Упэўненыя, што выхад зь цяжкага сацыяльна-эканамічнага крызысу, у якім апынуліся нашыя народы, магчымы толькі пры ўмове ліквідацыі імпэрскіх структураў СССР, стварэньня незалежных дзяржаваў, іх добразычлівага супрацоўніцтва і ўзаемнай падтрымкі.

г. Менск, 24 лістапада 1990 г.

Дакумэнты перакладзеныя з расейскай мовы.

Рады Эўропы ў сфэры правоў чалавека

На другім этапе, пасьля таго як пэтыцыя прызнаная прымальнай альбо на пленарным паседжаньні Камісіі, альбо ў рамках Палаты, Камісія выконвае дваякую функцыю. Перш за ўсё яна выступае для бакоў у якасьці мэханізму забесьпячэньня прыязнага ўрэгуляваньня пытаньня на аснове павагі да правоў чалавека; разгляд больш як 10 працэнтаў справаў, прызнаных прымальнымі, прывяло да прыязнага ўрэгуляваньня, якое нярэдка прадугледжвала выплату грашовай кампэнсацыі ахвяры, а іншым разам — да зьмены заканадаўства ў зацікаўленай дзяржаве. Калі не ўдаецца дасягнуць урэгуляваньня, то Камісія складае даклад, у якім прыводзяцца факты і меркаваньне Камісіі аб тым, ці сьведчаць гэтыя факты аб парушэньні Канвэнцыі.

Колькасьць скаргаў, якія накіроўваюцца ў Камісію, за апошнія гады рэзка ўзрасло, сьледзтвам чаго накапілася значная колькасьць неразгледжаных скаргаў і, адпаведна, узьнікалі іншым разам недапушчальныя затрымкі іх разгляду. Больш за тое, патрэба ў паслугах Камісіі, верагодна, яшчэ больш узрасьце, бо скаргі пачынаюць паступаць з новых і будучых дзяржаваў, якія дамаўляюцца.

Адным з важнейшых адрозьненьняў сыстэмы, створанай згодна Канвэнцыі, зьяўляецца яе даступнасьць любому, хто жадае падаць скаргу. Падача пэтыцыі ў Камісію не зьвязанае ні зь якімі выдаткамі; юрыдычнага прадстаўніцтва не патрабуецца. Тым ня менш лепш, каб заяўнікі карысталіся дапамогай адваката.

Хаця ў адпаведнасьці з Канвэнцыяй Камісія разглядае шырокае кола скаргаў, у апошнія гады большасьць разгледжаных ёю пэтыцыяў закраналі права на справядлівае судовае разьбіральніцтва (арт. 6 Канвэнцыі); шмат якія зь іх тычыліся працягласьці судовага разьбіральніцтва. Аднак разглядаліся таксама важныя справы паводле арт. 5 Канвэнцыі — аб законнасьці затрыманьня і аб праве на разьбіральніцтва, ў хадзе якіх суд безадкладна вырашае пытаньне аб законнасьці затрыманьня. Іншыя важныя справы тычыліся свабоды выяўленьня свайго меркаваньня (арт. 10 Канвэнцыі) і права на павагу асабістага і сямейнага жыцьця (арт. 8 Канвэнцыі). Быў таксама разгледжаны шэраг справаў, зьвязаных са сьцьвярджаньнямі аб ужыцьці катаваньняў і бесчалавечных адносінах (арт. 3 Канвэнцыі).

ЭЎРАПЕЙСКІ СУД ПА ПРАВАХ ЧАЛАВЕКА

Эўрапейскі суд па правах чалавека мае штабкватэру ў Страсбургу. Ён не зьяўляецца пастаянным судом, і, як правіла, засядае штомесяц напрацягу тыдня.

Суд складаецца з колькасьці судзьдзяў, роўнай колькасьці дзяржаваў — сябраў Рады Эўропы, і ня можа мець у сваім складзе больш за аднаго грамадзяніна адной і той жа дзяржавы-сябра. Судзьдзі выбіраюцца на дзевяцігадовы тэрмін Парлямэнцкай Асамблеяй са сьпісаў, што маюць па тры кандыдаты, якія прадстаўляюцца дзяржавамі. Напрацягу тэрміна сваіх паўнамоцтваў яны не павінны займаць пасадаў, несумяшчальных зь незалежнасьцю, бесстароннасьцю і патрабаваньнямі гэтае пасады.

Суд можа разглядаць справы толькі ў дачыненьні да дзяржаваў, якія прызналі ягоную абавязковую юрысдыкцыю або пагадзіліся на перадачу пэўнай справы ў Суд. Справы могуць перадаваць у Суд Камісія або дзяржава-ўдзельніца.

На сёньняшні дзень на разгляд Суда было вынесена каля 510 справаў, якія тычыліся шырокага кола пытаньняў, уключаючы наступныя:

— ужыцьцё цялесных пакараньняў (у школах або паводле судовага рашэньня);

— розныя формы ўтрыманьня пад вартай (асоб, якія церпяць на псыхічныя захворваньні, якія падазраюцца ў тэрарызьме, бадзягаў);

— правы зьняволеных;

— права звароту ў суд па цывільных і крымінальных справах;

— працягласьць судовага разьбіральніцтва;

— розныя працэсуальныя аспэкты крымінальнага правасудзьдзя;

— спрэчкі па пытаньнях сацыяльнага забесьпячэньня (страхаваньне здароўя, прамысловыя аварыі);

— прававы статус незаконнанароджаных дзяцей і іхных бацькоў;

— доступ бацькоў да дзяцей, якімі апякуецца дзяржава;

— законы аб дзейнасьці гомасэксуалістаў;

— прававы стан транссэксуалаў;

— захады, зьвязаныя з эміграцыяй, дэпартацыяй і выдачай;

— праслухоўваньне тэлефонных размоваў і пэрлюстрацыя карэспандэнцыі;

— свабода выяўленьня свайго меркаваньня, уключаючы свабоду прэсы і свабоду мастацкай творчасьці;

— свабода ўдзелу ў дзейнасьці прафсаюзаў;

— права ўласнасьці (кантроль за арэндай платай, экспрапрыяцыя, нацыяналізацыя).

Колькасьць справаў, якія перадаюцца ў Суд, рэзка расьце: у 1970 годзе ў Суд паступіла адна справа, у 1980 годзе — 8, а ў 1994 — 59. Такое павелічэньне колькасьці справаў можна патлумачыць перш за ўсё тым, што цяпер усе дзяржавы, якія дамаўляюцца, прызнаюць права падачы індывідуальных пэтыцыяў у Камісію і абавязковую юрысдыкцыю Суда. Апроч таго, сёньня адвакаты лепш інфармаваныя аб магчымасьцях, якія маюцца ў рамках Страсбурскай сыстэмы, і, урэшце, друк і аўдыёвізуальныя сродкі масавай інфармацыі набываюць усё большы інтарэс да справаў,якія вырашаюцца Судом.

КАМІТЭТ МІНІСТРАЎ РАДЫ ЭЎРОПЫ

Калі справа не перадаецца ў Суд, то Камітэт міністраў Рады Эўропы (большасьцю ў дзьве трэці галасоў) вырашае, ці мела месца парушэньне Канвэнцыі. Выявіўшы парушэньне, Камітэт міністраў можа далей пастанавіць, што дзяржава павінна даць ахвяры «справядлівае задавальненьне», г. зн. кампэнсацыю за шкоду, памер якой вызначаецца ў кансультацыі з камісіяй. Як і рашэньні Суда, рашэньні Камітэта міністраў зьяўляюцца канчатковымі, і дзяржавы-сябры абавязуюцца лічыць іх за абавязковыя.

Другая важная функцыя, ускладзеная на Камітэт міністраў, ёсьць нагляд за выкананьнем рашэньняў Эўрапейскага суда па правах чалавека. Упэўніўшыся ў тым, што зацікаўленая дзяржава зрабіла захады да задавальненьня іска, якія могуць уключаць у сябе выплату кампэнсацыі або зьмена унутрыдзяржаўнага права, Камітэт міністраў прымае рэзалюцыю аб прыпыненьні справы.

Нагляд Камітэта міністраў за выкананьнем рашэньняў Суда уваходзяць у лік галоўных пазытыўных адрозьненьняў, якія тлумачаць эфэктыўнасьць Эўрапейскай канвэнцыі па правах чалавека. Тая акалічнасьць, што дзяржавы-сябры згаджаюцца выканаць рашэньні Суда, у прыватнасьці празь зьмену заканадаўства з мэтай пазьбегнуць парушэньняў у будучыні, робіць істотны ўнёсак у стварэньне таго, што можна назваць эўрапейскім грамадзкім парадкам у сфэры правоў чалавека.

Падрыхтаваў Паўлюк Канавальчык

ПАДПІСКА

Васіль Быкаў
Сьцяна

Каб падпісацца на новую кнігу прозы Васіля Быкава «Сьцяна», трэба 68.000 (кошт выданьня) + 20.000 (паштовыя выдаткі) пералічыць на рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г.Менска, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

КНІГІ – ПОШТАЙ

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г.Менска, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

№	Аўтар і назва	кошт	кошт перасылкі
1	Гарт. З успамінаў пра Саюз Беларускіх Патрыётаў.	58.000	16.000
2	А.Лукашук. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.	28.000	12.000
3	А.Цьвікевіч. «Западноруссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў 19 і пачатку 20 в.	40.000	16.000
4	І.Абдзіраловіч. Адвечным шляхам. Дасьледзіны беларускага сьветапогляду.	10.000	10.000
5	Е.Ширяев. Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах.	40.000	12.000
6	М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія.	25.000	16.000
7	У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхалягічнага пункту гледжаньня.	12.000	10.000
8	Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты. Уводзіны ў псыхалінгвістыку.	10.000	12.000
9	Што такое параўнальнае літаратуразнаўства.	25.000	12.000
10	Б.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію.	10.000	12.000
11	Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі.	20.000	12.000
12	Ж.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён.	15.000	16.000
13	Ф.Брэтон. Выбух камунікацыі.	20.000	12.000
14	Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне.	30.000	12.000
15	Ш.Дэбаш. Уводзіны ў палітыку.	30000	16.000
16	К.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё.	25.000	10.000
17	Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч1: Мікраэканоміка. Дапаможнік для студэнтаў.	45.000	20.000
18	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №1(96)	30.000	12.000
19	Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры) №2(97)	40.000	20.000
20	Крыўя. №1, 1994	45.000	12.000
21	Крыўя. №1, 1996	55.000	12.000
22	В.Кіпель. Беларусы ў ЗША.	15.000	16.000
23	М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі.	20.000	10.000
24	Т.Сапач. Восень.	10.000	6.000
25	А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме.	30.000	16.000
26	А.Глёбус. Скрыжаваньне.	10.000	6.000
27	Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі.	15.000	12.000
28	Беларускі вайсковы строй і зброя.	20.000	6.000
29	Беларускі рок-н-рол.	10.000	6.000
30	П.Бэрк. Рэнэсанс.	25.000	12.000
31	Ю.Штайнэр. Эўралейскія дэмакратыі.	25.000	20.000
32	Ё.Тэрборн. Эўропа сёньня і заўтра(1945-2000).	32.000	16.000
33	А.Дэні. Гісторыя эканамічнай думкі.	70.000	24.000
34	Я.Найдзюк. Беларусь учора і сёньня.	30.000	12.000
35	В.Гапоненка. Іван Яркоўскі. У пошуках гармоніі сусьвету.	10.000	6.000
36	А.Ятусевіч. Слоўнік зоапаразіталагічных тэрмінаў.	20.000	10.000
37	Ніл Гілевіч. Любоў прасьветлая.	35.000	12.000
38	С.Станкевіч. Русіфікацыя беларускае мовы ў БССР і супраціў русіфікацыйнаму працэсу.	10.000	6.000
39	Г.Сяржаніна. Беларуская навуковая тэрміналёгія. Біялёгія.	10.000	10.000
40	Ніл Гілевіч. Талісман.	15.000	10.000
41	Я.Станкевіч. Маленькі МАСКОЎСКА-БЕЛАРУСКІ слоўнічак.	10.000	6.000
42	Л.Мірачыцкі. Сьветлым ценем Адама Міцкевіча.	10.000	6.000
43	Рэформа беларускага правапісу 1933 года.	6.000	6.000
44	Тэрміналягічны СЛОЎНІК па вышэйшай матэматыцы для ВНУ.	20.000	10.000
45	И.Хозеров. Белорусское и смоленское зодчество 10-13 вв.	30.000	12.000
46	Ул.Арлоў. Адкуль наш род.	85.000	12.000
47	Я.Запруднік. Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях.	55.000	16.000
48	Новы Запавет.	65.000	16.000
	ДЗІЦЯЧАЯ КНІГА		
1	Кася ў школцы.	9.000	14.000
2	Шарль Пэро. Чарадзейныя казкі.	20.000	26.000
3	Лагодны Цмок.	15.000	21.000
4	Гарасьо Кірога. Казкі трапічнага лесу.	15.000	21.000
5	Графіня дэ Сэгюр. Зачараваная хатка.	20.000	26.000
6	Марві Яла. Дзівосная Ноч.	15.000	21.000

Аляксандар Лукашук
«За кіпучай чэкісцкай работай»

Сцэны з жыцьця катаў

Новы кніжны праект «НН» — вынік шматгадовага архіўнага пошуку, на падставе дакумэнтаў дасьледуюцца ўнутранае жыцьцё НКВД і норавы чэкістаў-курапатчыкаў, мэханізмы цэнзуры і драма сучаснага маральнага выбару, адкрываюцца невядомыя старонкі нацыянальнай трагедыі.

Кніга «За кіпучай чэкісцкай работай» стане чарговым ілюстраваным выданьнем пад грыфам Архіву Найноўшае Гісторыі сьледам за ўжо вядомымі нашаму чытачу «Менскай вясной – 96», «Гартам» і «Філістовічам». Мяркуецца, што новая кніга ўбачыць сьвет у кастрычніку.

Папярэдняя падпіска (сабекошт + кошт перасылкі) складае 44.000 + 15.000 БРБ.

Каб замовіць кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: БГФ «Наша Ніва» р/р 3015201930039 «Гарант» філія АКБ «Поіск» г.Менска, Код 987.

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары «Для пісьмовага паведамленьня» указаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і, калі ёсьць, тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Тэлефон для кантакту (8-017)-2-31-04-08 у працоўны час.

КАСЭТЫ – ПОШТАЙ

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 32.000 + 7.000 БРБ)

Ален. Нармалёк (1995)
Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
Вольга Акуліч.Трохкутнік
Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
Беларускія народныя казкі
Музычныя казкі (1996)
Бонда. Найлепшыя песьні
Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым
Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
Новае неба. Сон у трамваі (1994)
Новае неба. Go home (1995)
Новае неба. Мая краіна (1996)
Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
Крама. Камэндант (1995)
Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
NRM. LaLaLaLa (1995.)
NRM. Одзірыдзіздзіна (1996)
Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5) т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990) т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993) т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991) т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994) т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Тарнадо. Флэт (1992-1994)
Рок па вакацыях-96 (НРМ. Уліс. Флэт. Тарнада. Крама. Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. НРМ. Палац. 1996)
Беларускі джаз т.1. Рэнэсанс т.2. Ігар Сафонаў т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
Беларуская гітарная музыка (1996)
Беларуская сымфанічная музыка (1996)
Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная» т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры) т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазія па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха) т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
Андрэй Мельнікаў. Песьні вызнаньня (1991-1993)
Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
Уліс. Чужаніца (1991)
Уліс. Танцы на даху (1993)
Уліс. Life-96
Уліс. Блуканьне (1996)
Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
Палац (1995)
Песьні беларускіх бардаў (1992)
Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндам. Уліс. Мроя. Крама, 1994)
Маладзёжныя хрысьціянскія сьлевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
Уладзімер Клімовіч. Дзесяць вятроў (1997)
Камэлот. У краіне талераў. (1995)
Эдуард Акулін. Мая Крывія. (1996)
Неруш (1997)
Ігар Палівода. «Максім» (1997
Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996
KRIWI - праект фольк-мадэрн студыі «Палац»
Купалінка - Kupalinka. Folk-group.
Ліцьвіны. Голуб на чарэшні.
Песьнярок. Песьні «Песьняроў» у выкананьні «Крамы», NRM, «Троіцы», «Тарнада», «Пані Хіды», «Ляпис Трубецкого», «Нейродюбеля», Валіка Грышко.
Белы сон (Беласток, 1997)
Харошкі. Полацкі сшытак, традыцыйная музыка (1997)
Жыгімонт Ваза. Стан Галоцынацыі
Марыя Скуратовіч. Табе, Хрысьце!
Песьнярок. CD (170.000)

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч

НОВЫ ПРАЕКТ

Беларускі Гуманітарны Фонд "Наша Ніва" стварае Архіў беларускай рок-музыкі, які бачыць сваёй галоўнай мэтай збор матэрыялаў і дасьледаваньне сучаснай незалежнай музычнай традыцыі ў Беларусі.

Архіў зьбірае: старыя, рарытэтныя, аўдыёвідэаматэрыялы, друкаваную прадукцыю (газэты, часопісы, афішы, плякаты і да т.п.).

Зацікаўленым асобам просьба зьвяртацца на адрас: Беларусь, 220085, Менск, а/с 5. "Архіў беларускай рок-музыкі", або праз тэлефон: (017) 231-04-08 (Сяргей Сахараў).

БЕЛАРУСКІЯ МУЗЫЧНЫЯ НАВІНКІ:

З.Б.С.:
Андрэй Мельнікаў. Здані: Ты і я (Двайны альбом).
Студыя Recorded:
1) Gods Tower. The Eerie. 2) Gods Tower. Canticles. 3) Plastic Hardcore. Ultra. 4) Chemical Warfare. Demolition Tape. 5) Euthanazia. Pathological Madness. 6) Katharsis. Decomposition. 7) Headcleaner. Hash. Hash. Resistance.

СТАРЫЯ НУМАРЫ "НН"

На складзе «Нашай Нівы» маюцца нумары газэты за 1991-1996 гады. Даведкі па тэлефону 231-04-08 (Віталь Супрановіч).

ЛІТОЎСКАЯ МЭТРЫКА

Выйшла з друку чарговая кніга Мэтрыкі – том 11 (Кніга запісаў). Папярэдне выходзілі тамы 5, 6, 7, 8, 10. Просьба ахвотным дасылаць свае заяўкі пісьмова на адрас: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч. Калі Вы маеце тэлефон, пазначце яго.

Даведкі праз тэл.: 249-08-88 да 10 гадзінаў раніцы; 231-04-08 у працоўны час.

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Бацькаўшчына: Зб. гіст. літ.: Для сярэд. і ст. шк. узросту / Уклад., прадм., пасьлясл. С.Панізьніка; Маст. У.Якунін. – Менск: Юнацтва, 1997. – 286 с., іл. – Наклад 3.000 ас. ISBN 985-05-0130-8

Міхась Баярын. Шалёны вертаградар: Канон (Вянок на магілу Ёзэфу Кнэхту). – Менск: Эўрофорум, 1997. – 90 с.

Максім Гарэцкі. Віленскія камунары: Раман-кроніка: Камароўская кроніка: Аповесьць: Для ст. шк. узросту / Прадм. М.Мушынскага. – Менск: Мастацкая літаратура, 1997. – 542 с. – Наклад 12.500 ас. ISBN 985-02-03-98-6

Кантакты і дыялёгі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралягічны бюлетэнь. – Менск: Беларусь, 1997. № 7-8 (19-20). – 64 с. – Наклад 499 ас.

Янка Купала. Поўны збор твораў. У 9 т. Т. 3: Вершы, пераклады 1911-1914. –Менск: Мастацкая літаратура, 1997. – 342 с., іл. – Наклад 6.000 ас. ISBN 5-240-01463-0 (Т. 3)

Лідзкі летапісец: Краязнаўчы, гісторыка-літаратурны часопіс. – 1997, № 1, верасень. – 32 с. – Наклад 499 ас.

Малы кансьпіратар (Кароткі дапаможнік сябрам Антыфашыстоўскага Народнага Супраціву ад польскіх патрыётаў).

Г.Я.Рылюк. Истоки географических названий Беларуси (с основами общей топонимики). – Менск: Веды, 1997. – 176 с., іл. – Наклад 1.500 ас. ISBN 985-6390-14-1

Сіняя птушка: Казкі: Для сярэд. шк. узросту / Уклад. Л.Цітова; Маст. А.Лось. – Менск: Вышэйшая школа, 1997. – 299 с., іл. – Наклад 11.000 ас. (Школьная бібліятэка). ISBN 985-06-0284-8

Суднік Станіслаў, Чыслаў Сяржук. Расейска-беларускі вайсковы слоўнік. –Менск: БелФранс, 1997. – 250 с. – Наклад 1.300 ас. ISBN 985-6425-02-6

Чацьвёртая ўлада: Бюлетэнь Беларускай асацыяцыі журналістаў. – 1997, № 6, жнівень. – 24 с. – Наклад 499 ас.

Leszek Zasztowt. Kresy 1832 – 1864. Szkolnictwo na ziemiach litewskich i ruskich dawnej Rzeczypospolitej. – Warszawa: Wydawnictwo Instytutu Historii Nauki PAN, 1997. – 376 s. ISBN 83-86062-36-3

ЛІСТЫ ЁЗЭФУ КНЭХТУ

Міхась Баярын, Шалёны вертаградар (вянок на магілу Ёзэфа Кнэхта), Бібліятэка «Фрагмэнты», ЭўроФорум, Менск, 1997

Беларуская паэзія канца стагодзьдзя пачынаецца (ці сканчаецца?) разьвітаньнем зь Ёзэфам Кнэхтам. Язэп Слуга (менавіта так перакладаецца імя гэроя «Шкляных пэрлінаў») заўсёды быў прыхаваным пратаганістам беларускай традыцыі як традыцыі служэньня й супраціву; першая кніга вершаў Міхася Баярына не імкнецца паставіць кропку (гэта ня справа паэзіі) ў гэтай гісторыі, а хутчэй выявіць яе галоўныя тэмы й прыдумаць прыстойны канец, г.зн такі канец, пры якім чытач (адраджэнец, партызан, сябра Рады БНР) не шкадуе пра пачатак і не сумуе ў сярэдзіне. Вянок на магілу Ёзэфа Кнэхта выглядае цалкам адпаведным такой задуме: гучнае Джойсава non serviam крыху зьмякчаецца тут анталягічным пэсымізмам канца стагодзьдзя, а мадэрная энэргетыка верша убраная ў баракальныя шаты постмадэрнага тэксту.

Лексыкон навакольля страчвае слова «час». На пытаньне «вы дзе?» атрымаеш адказ «мы тут» і ня ўбачыш нас. Мы ў краіне, куды пасьля лета хаваецца восень.

Назва зборніка задае яшчэ адзін кантэкст: Сімяон Полацкі, прыклад абсалютнага, даведзенага да абсурду й шаленства serviam, вечны антаганіст беларускага адраджэньня, зь якім тут ніхто не зьбіраецца разьвітвацца з той простай прычыны, што ніхто й не вітаўся. Гэта яму, напэўна, прысьвечаны верш:

П'яны мужчына выходзіць з хаты, калі гэта, вядома, завецца хатай, Каб пагуляць з сабакам. Дзесяць гадзінаў для Гадзіньніка. Мкненьне крыніц сьвятла да нуля Спыняе німб ліхтара. І скіпаў ката Узрастае упарта як курс рубля, І сьціхае раптоўна. Мужык падыходзіць да Аржавых кантэйнэраў у глыбіні двара, І дастае рука-Мі сьмецьце, штосьці жарэ адразу, штосьці бярэ з сабой У рызманную торбу, куфэрак сноў...

Зрэшты, кніга Міхася Баярына не абмяжоўваецца назвай. Ягонае паэтычнае мысьленьне – а мы можам карэшце ўжыць гэтае словазлучэньне ў дачыненьні да найноўшай беларускай паэзіі – спрабуе закрануць усе рэгістры, усе дыяпазоны. Ніхто яшчэ не блукаў столькі па Менскіх вулках:

Калі прыціхае вецер, А магчыма, проста зьнікае нешта, Паміж гонкім праходам дрэў вырастае мур Я заходжу ў дворык і дыхаю Мэтафізыкай страчаных вуліц...

Альбо такое:

Калі ты сьпіш, глыбокі рытм тваіх уздыхаў Мой слых міжволі супрацьпастаўляе За вокнамі спатканьням хаатычным З бляшаным дахам ночнага дажджа...

.....

У чым сэнс прыходу Шостага патрыярха з Захаду? – запытаўся я ў аўтара. Вянкі плывуць і зьнікаюць, – адказаў ён.

Францішак Эн.

Выданьнем кнігі Міхася Баярына «Шалёны вератаградар» ЭўроФорум распачаў новую выдавецкую сэрыю Бібліятэка «Фрагмэнты». Сэрыя задуманая як «глыток аптымізму» ў цёмныя часы...

Ужо падрыхтаваныя да выданьня кнігі Славаміра Адамовіча «Сьліраль Бруна», Валеркі Булгакава «Праўда і крыўда», Ігара Бабкова «Герой вайны за празрыстасьць», культуралягічныя эсэі Валянціна Акудовіча, проза Андрэя Дынька «Росквіт магчымасьцяў». У плянах – мастацтвазнаўчыя(?) эсэі Адама Глёбуса, літаратуразнаўчыя(?) тэксты Юрася Барысевіча, пераклады Зьбігнева Гэрбэрта, Мілана Кундэры, Данілы Кіша, Шэмаса Хіні, Жоржа Батая, Робэрта Музіля й інш.

Што далей? «Эўрофорум» чакае Вашых прапановаў...

ГРАМАФОН.

Ананім

ДАРАГАЯ «НН»!

Мае землякі прасілі мяне перадаць гэты ліст слыннаму філёлагу й мовазнаўцу Менчуку Мачанку. Ды я саромлюся. Можа, вы гэта зробіце? Тады ён зразумее, як ён нам патрэбны. Дарэчы, гэты ліст сп. Мачанка можа лічыць запрашэннем у — фальварак Дварчаны, верасень, кастрычнік.

***

Па карчох і па лаўжох,
Па гадзючыных кублох
Мы хаваемся з вайны —
Беларусы-сакуны.
Ні ўжэднікі скарбовы,
ні інспэктар участковы,
ні рассейцы-маскалі
нашай сховы не знайшлі.
Нат лясьнічы-людалоў
нас дасюль не апароў.
(Што ж датычна фальклярыстаў —
тых адлрэчваем начыста.
Натаўчэм па барадзе —
нех ня ходзе абы-дзе.)
Толькі ты, наш сэрца-друг,
наш Мачанка, наш Мянчук,
знойдзеш нас сярод лясоў.
Дык чакайма. Будзь здароў.

Віктар Асіпенка-Ліцьвінаў

***

Моцна вецер жадае
вырваць з коранем
самотнае маўклівае дрэва
асяродкам якое ў чыстым полі,
моцныя буры й віхуры
выкарчоўваюць цэлыя дзялянкі ў лесе.
Хвароба жадае скасіць чалавека,
язык у роце жадае
выкінуць хворы зуб,
хвалі імклівае ракі
зносяць усе нежывыя аскепкі
ў акіян жывых мар,
мацнейшы прапускае бярозавік
з добрых бяроз...
І вось, нарэшце, кволая трава
ўздыме, здавецца, шэры бэтон,
а за ім... крочыць чалавек,
ён шыбуе супраць жыцьця...

Źmitruś Babroviec

***

Brydkija słovy, brydkija šmieški,
Brydkija kryki nad placam latuć.
Brydkija pieśni, brydkija viersy...
Brydkija pašču žyvoje hryzuć.

Ja lezu na dach.
Ja skoču ŭniz;
Na vystyły bruk
Kryvavy hrud;
Na kamienny dyvan,
Pad žździcklivy švist...
Bo ja nie taki, bo ja varjat!

Brydkija himny skazonaje viery
Mazoląć mnie vušy, šaleju ažno!..
Brydkija jenki kryvavaje cheŭry
Pierada mnoju mahutnaj ściaroj.

Tupuju ścianu
Nia zrušyć ilbom.
A piesni maje daremny huk.
Navošta šviatło, navošta luboŭ...
Dy voś ja laču
Na vystyły bruk...

Brydkija voĉy ŭlasnaj kachanki
Ja ŭžo nia maju bolej mocy tryvać.
Brydkija «tatki», brydkija «mamki»,
Brydkija «sproby narod ratavać».

Laču ja uniz
Na vystyły bruk;
A tvary lulziej
zastyli naŭkol.
A ŭ niebie piaje
Sapraŭdny žaŭruk,
Dy z ablokaŭ hladzić,
Šviaty Aniol,
Moj Švietły Aniol...

Яўген Гучок

***

І хто ўсё ж болей грэшны з нас:
Ці я, ці Мураўёў,
Ці цар, ці Бог?

***

Я вінаваты ў тым,
Што гніць пачаў перашкаджаць
Рабаўнікам і іх ахвярам.

***

Памілавацца, пагалубіцца,
Відаць, мне хутка
Прыйдзецца зь пятлёй.

***

Кажу я кату: «Беларусь люблю!»,
А ён што скажа
Богу?

***

Вось-вось зацягнецца мая пятля —
І ў Мураўёва на мундзіры
Вісець ахвяра пажыцьцёва будзе.

***

А вунь і хмарка паплыла
І падмігнула мне,
І абнадзеіла.

***

Гэта сіла, што сёньня мацуе імпэрыю,
Зь цягам часу у трэскі
Яе разьнясе.

***

І памост, і пятля, і хат —
Во іх колькі — целаахоўнікаў...
Толькі ж душу маю не ўтаймуюць яны.

***

Пасьля хтось прыстасуе гэту перакладзіну
На бэльку дзесьці ў карчме
Ці падваліну ў папоўскай хаце.

***

Няхай на будзе гэты вось памост
Алошняй нашай вольнай
Тэрыторыяй.

Уладзімер Жаўняк

***

М.

Не жадаю быць,
Не жадаю сядзець,
Я жадаю жыць,
Я хачу хадзець.

Я хачу ісьці
па скошанай траве,
Я хачу паўзьці
ранкам ад яе.

Зразумець хачу,
Што гэта са мной —
Я хачу гуляць
Толькі зь ёй адной.

***

Той беларус, які забыў пра гонар,
Забыўся мову і адкуль ён сам,
Ен кажа ўсім: «Расея — гэта донар,
Таму патрэбна аб'яднацца нам».

Такога ўжо ня выправіць ніколі,
Ен толькі можа сам сябе зьмяніць,
Але калі адчуе страту волі,
Тады ў яго сардочка зашчыміць.

ЖЫВЕ!

Прысьвячаецца паўстанцам 1920 году

Ён пайшоў, не сказаўшы нічога,
Ціхай ноччу, калі спалі ўсе.
Толькі цяжка тупалі ногі,
Набіраючы рух пакрысе.
Вось прыйшлося з домам расстацца,
Дзе застаўся яго любы сын.
Як хацеў ён... Ды трэба сыпяшацца
Пакуль сонца ня ўстала над ім.
Ен прынес бы любую ахвяру
Дзеля роднай краіны сваёй.
Дзьве сьлязінкі спаўзалі па твары,
Ен іх выцер шурпатай рукой.
І ўжо потым у бітвах крывавых
Гэтай самай шурпатай рукой
Ён сьціскаў кулямёт свой іржавы,
Нішчыў ворагаў, піў за спакой.
За спакой сяброў, аднадумцаў,
Што аддалі жыцьцё за свой край,
За народ, што ня здолеў прачнуцца,
Каб ад чорных пазбавіцца зграй.
Цяжкі бой і ворагаў болей,
Толькі хто тут прамовіць «Здаюсь».
Ен узьняўся, павёў за сабою
Зь дзікім крыкам «Жыве Беларусь!»
І ў адказ шматгалоснае рэха
Моцна, гучна крычала «Жыве!»
Толькі куля спыніла, ён зьехаў
Па счарнелай ад сьнегу траве.
Ен хрыпіць. Хлешча кроў з галавы.
Больш ня будзе наступнага бою.
«— Як там сын?» А сын — ён жывы,
Ен таксама у рукі ўзяў зброю.

Андрэй Захаранка

ПАШТОЎКА

Вы зычылі, пані, вясёлых Калядаў
І шчасьця на будучы год,
А нашы на белай паштоўцы пагляды
Сустрэліся дотыкам нот.

Пяшчотаю сьпеваў пра сьнежныя росы
Квяцістыя словы ліліс,
А Вашы даўгія, агністыя косы
Спадалі струменем на ліст.

Прыгожыя словы, як быццам у шэраг,
У роўны ставалі радок,
А я разглядаў паміж літараў шэрых
Гарэзьлівы, мілы раток.

Вы зычылі мне нарадзіцца нанова,
Вы зычылі радасьцяў мне...
А я расчытаў сярод велічных словаў,
Што й Вы пакахалі мяне...

Пятро Касьцюковіч

БРАТУ ПАМЯРКОЎНАМУ

Абруселым беларусам прысьвячаю

Ўсе імкнуцца к свабодзе спрадвеку.
Продак наш яе вельмі любіў.
Не лічы ты сябе чалавекам,
Калі мару аб волі згубіў!

Хочаш, каб пад маскоўскім прымусам
Край Купалы і Коласа быў?
Не лічы ты сябе беларусам,
Калі родную мову забыў!

Розум твой у памяркоўнасьці сьлёкся
І жывеш ты чужой галавой:
Дзе хто бачыў, каб рускі адрокся
Ад дзяржавы і мовы сваёй?

Над табою сьмяюцца палякі
І бязьмежна зьдзіўленьне армян...
Шчыра молящца сэрбы й славакі,
Каб ня ганьбіў ты гонар славян.

Абруселы, ты станеш казяўкай.
Скажуць: племя тваё аджыло...
Як прыпылены будзеш пад лаўкай
Шапатаць «абы ціха было».

Ты — дзіця беларускай прыроды.
Для цябе рускамоўе — труна!
У Расеі нямала народаў,
Але мова ў Расеі — адна!

Наша мова — мэлёдый суквецьце.
Прыгажэй моў на сьвеце няма.
Не выкідвай яе ты на сьмецьце,
Адчуй радасьць жыцьця безь ярма!

Наша мова заве да свабоды,
Нашай нацыі славу дае.
Нездарма акупанты заўсёды
З такой лютасьцю душаць яе!

Наша мова — царыца ў няволі,
Наступіў час яе вызваляць!
Улада робіць усё, каб ніколі
Не пачаў ты на ёй размаўляць.

Рускамоўныя ўсюды кіруюць,
Загрызаюць ушчэнт Беларусь.
І цябе абакраўшы, піруюць,
Чорнай робячы Белую Русь.

Падымісь! Пасьляшы у дарогу.
З рабалепствам расстанься сваім!
Моў сузор'е народжана Богам —
Будзеш зоркай нязгаснай у ім!

Мова родная ўсюды ў пашане,
Акрамя Беларусі тваёй.
Не сумуй: адраджэньне настане
І захочаш ты думаць на ёй!

Не палохайся рускіх фашыстаў —
Як нямецкім ім дай прыкурыць!
Беларус — ты ж асілак плячысты,
Хай пад імі зямелька гарыць!

Скінь імпэрыі рускай аковы,
За якутам ня рвісь у небыцьцё:
вечнасьць нацыі схована ў мове —
таму сьведкай — калёній жыцьцё.

Сей змаганьня і праўды насеньне,
Аб'ядноўвай братоў дарагіх!
Стань скалой на шляху абрусеньня
І славянства, і нацый другіх!

Абміне беларускую мову
Лёс згараючых ў небе камет,
Калі стане нам роднае слова
Даражэй за бяскрайні Сусьвет!

Андрэй Крывіч

СОНЦА

Мы сядзім і глядзім на сонца.
Нашыя вочы пачынаюць балець.
Але мы працягваем сядзець.
Зялёныя пляміны перад вачмі.
Але нам патрэбны
сьвятло і свабода.
Інакш мы ня будзем папросту людзьмі.
Выходзяць ад нас навальніцы і хмары
І хутка ня будзе ў Краіне жамяры!

Марыля Лагодзіч

***

Ты чуеш крык?
Гэта крычыць мая душа,
якой у вочы зазірнула маланка.
Ты бачыш сьвятло?
Гэта позірк поўні,
што калясіць да Перуна.
Ты лічыш леты?
Гэта стрэлка гадзіньніка
рушыла на поўнач.
Ты пазнаеш жабку?
Гэта я шукаю
прытулку...

Дзяніс Лісейчыкаў

ВІДАВОЧНАЕ

(байка)

Мы прачыталі ў газэце:
«Для абмежаваньня ашаля-
га руху NATO,
Для таго, каб быў хлеб
і вада ў клязэце,
У краіне заснаванася Партыя
дэгенэратаў...»
Сьмяяліся дзеці,
Сьмяяліся вязьні з-за кратаў,
Дзядзька адсунуў раман пра
піратаў,
Навесіў мэдалі дзядулька гарбаты,
«Ха-ха-ха!» — сьмяяліся на поўным імпэце,
«Ух-хо-хо! — Партыя дэгенэратаў!»
Атрымаўшы партбілет, памёр аў сьмеху
Доктар у лякарні. А сьлесар-мантажнік
Аж ключы пагубляў сябрам на пацеху,
Бабулька зь мехам
Пустых бутэлек ад піва «Дражня»
Раток адчынила шчарбаты:
«Хі-хі-хі! — Партыя дэгенэратаў!»
«Мы — адвечныя аслы й мазгавыя
кастраты!» —
Адказваў на ўроку вучань у клясе:
«Мая маці — крэтынка й прыдурак — тата!»
«Ох, блазен!» —
З усьцехаю думаў выкладчык
і сьмяяўся сабе,
А ВНУ загадчык,
Бліскучы й поўны, як мячык,
Пісаў: «У сьвятой барацьбе
З усім сьветам праклятым
Хай сьветла лунае Партыя дэгенэратаў!»
А позна ўночы,
Зьбіраючы справачдачы,
Нейкі начальнік махны, пузаты,
Каўтнуў гарбаты,
Засьмяяўся, заплюшчыў вочы
І зь пяшчотай, найначай,
Сказаў: «Ох, люблю ж я вас, мае
дэгенэраты!»

Алесь Менскі

***

Кажуць, што недзе
Ў нашай краіне
Зона ёсьць, дзе
Людзям жыць небясьпечна.

Ды толькі чыстыя
Нашы мясьціны —
Зона таксама.
Дай Бог, не навечна!

***

Як лёгка быць сьвятым
Пасьля граху цяжкога
І пакідаць на словедзь
Злачынствaў жорсткіх повязь.

Як лёгка ўдзячыць тым,
Хто нам дае нямнога —
Ня дзякуеш ніколі
Тым, хто дае найболей.

Як лёгка сьмелым быць
За сьпінамі мацнейшых,
Але ў двубой шматкоўны
Ня пойдзем мы на роўных.

Ня цяжка ў куце выць
Пра лёс свой найцяжэйшы,
Калі на роднай мове
І слова не прамовіў.

Сяргей Патаранскі

ГАРЫБАЛЬДЗІ

Чаго чакаеце вы, кволыя нашчадкі
забытых родаў, зьнішчаных плямён —
дэяшовай выпіўкі, цяля ад сьвіна-маткі,
даўгачаканых лепшых дзён.

Што трэба вам, закінутай у сьвеце
талкучнай кучы змучаных людзей,
з галовамі, ў якіх гуляе вецер,
з вачамі поўнымі адчаю і надзей.

Быць можа вы падумалі, што трэба
у нешта верыць, і чагось чакаць?!
Так, па над вамі радаснае неба.
На вас яму адкрыта наплеваць.

Таму пара ісьці, паўзьці і рухаць
паршнямі, некага маліць,
чым проста так стаяць, як пень, і чухаць
патыліцу ды мух лавіць.

Волесь Пярун

МІРОН

паэма

Ноч непраглядная. Зоры. Цямрэча.
Горад прытомлены сьпіць.
На занядбанай бязьлюднай пустэчы
Комін цагляны стаіць.

Комін на пустцы самотным здаецца
Толькі на першы пагляд,
Шэрая постаць павольна крадзецца
У цішы да яго наўздагад.

Можа быць, гэта злачынец рыхтуе
Зноўку ноч доўгіх нажэй?
Можа, бадзяга ў цемры вандруе?
Лепей зірнем мы бліжэй.

Сьціплая вопратка, зброі ня мае —
Не, не зламысьнік, відаць.
Пальцы ў кулак ён ад крыўды сьціскае,
Вочы рашуча блішчаць.

Вось незнаёмец па скібках іржавых
Лезе харобра ўгару
Рукі сьвярбяць ад парэзаў крывавых —
Боль нілачым змагару.

Мэта дасягнута. Хай горад родны
Бачыць у небе ізноў
Узьняты на коміне сьцяг наш народны.
Злых хай пазбудзецца сноў.

Толькі вось... Трасца! Асадка кудысьці
Зьнікла з кішэні. Згубіў.
Але ня доўга шукаў хлопец выйсьця:
Палец наўмысьля прабіў.

«Гэта Мірон тут штандар пакідае
Дзеля краіны сваёй.
Ворагаў нашых расплата чакае!» —
Уласнаю піша крывёй.

Час прысыпяшае. Зьнікаць трэба ўночы.
Раптам... «На месьце стаяць!»
Промні пражэктараў б'юць зьнізу ў вочы:
«Злазь, а то будзем страляць!»

Не, не аддасца да катаў у рукі
Той, хто для волі жыве!
Так... Побач мачты высокай напругі...
Плян высыпае ў галаве.

Пару пальчатак гумовых наўмысна
Ён, бы прадбачыў, схаваў.
Здраднікам хцівым было непамысна,
Як ён ад іх уцякаў.

Зь месца бясьпечнага хлопец глядзеў
На ліхтароў мітусьню.
Лезьці на комін ніхто не хацеў,
Кожны выдумваў хлусьню.

Хоць дзеля грошай пускалі яны
Іншыя лёсы па злом —
Не рызыкнуць дзеля «бацькі» сыны
Сваім уласным жыцьцём.

Эпілёг

Тыя, хто люд наш грызуць, бы сабакі,
Кідаюць волю на зьдзек,
Край аддаюць ні за понюх табакі,
Як і рабілі спрадвек,

Ведаюць хай, што ня зловяць Мірона,
І не прадасца ім ён.
Нас не адзінкі, нас — міліёны,
Кожны у сэрцы — Мірон.

Вольга Чарнавокая

МЕНСК

Я люблю гэты горад,
Хоць ён шумны і пылкі
Я заўжды знайду повад
Каб вярнуцца ізноў
І блукаць па завулках
Узгадаўшы памылкі
І шукаць апраўданьня
Ў простым слове «любоў»

Горад мілы мой горад
Ты ніколі ня здрадзіш
Ты заўсёды чакаеш
Толькі людзі ілгуць
Ты мяне праважаеш
Ты мяне сустракаеш
І да самага золку
Ты ня можаш заснуць

А.Шадрын

ПАДАРУНАК

Прыгожую ружу хачу падарыць
Табе гэтым чэрвеньскім днём,
Хай зьзяе красуня, ласкава гарыць
Самотным, пяшчотным агнём.
У вазе няхай стаіць моўчкі яна,
Глядзіць на цябе ўначы,
Згасаючы ў скрусе, заўсёды адна,
Агеньчыкам сьціплай сьвячы.
Хай будзе яна напамінам табе,
Аб тым, што калісьці я быў,
Аб тым, што насуперак змрочнай журбе,
Цябе непадзельна любіў.
Цнатлівую краску прымі ад мяне,
Хай будзе да самай зімы,
Квітнець успамінам аб дзіўнай вясьне
У якую сустрэліся мы.
Прымі гэты шчыры адбітак душы,
Прыцісні да сэрца свайго,
Пялёсткі цалуючы, з жалем скажы:
«Я ўсё ж так кахала яго!»
Духмяную кветку — апошні мой дар,
Прымі, уратуй, прытулі,
І сьлёзы адчаю ды згубленых мар
прашу, калі ласка, ня лі!
А краску ў ваду алусьці, хай яна
ласкава гарыць уначы,
Смуткуе, згасаючы, — вечна адна,
Агеньчыкам сьціплай сьвячы...
Прыгожую ружу табе падарыў
Зьнікаючы чэрвеньскім днём,
Я ў памяць аб тым, як бязьмежна любіў
І ў знак разьвітаньня з жыцьцём.

Алена Шарэпа-Лапіцкая

МУХАМОР

На мху зялёным сярод лесу
Алелі лужыны ў крыві —
Там пад скалы круглым адвесам
Хлапцы загінулі ў баі.

І на паляне той панурай
Чырвоны пышны вырас грыб,
Пад капялюшам грозным, хмурым
Ен прагна да крыві прыліп.

Паважны, зыркі, накрапляны
У пяцікутнік брудных зор,
Упіўся у імшыстыя дзірваны
Крывавы, сквапны, мухамор.

Праз ноч да самае заранкі
Грымеў Пярун над шчытам гор,
Агнём прарэзьлівым маланкі
Іскрылі трупны мухамор.

І лес гудзеў несамавіта,
Узьнімаў пагрознай сілы крык:
«Нашто, людзкой крывёй наліты,
У нас такі разросься грыб?»

А грыб узрастаў у кожнай хвілі,
І кроў смактаў празь дзірваны,
Аж у канцы яго разьбілі
Ушчэнт грымотна Перуны...

Сымон Шаўцоў

Я ЦЯБЕ НЕ ЗАБЫЎ

У сэрцы маім расьцвітае вясна,
Як цябе, родны Менск, успамінаю.
Я з даўна палюбіў
Горад слаўны мой Менск
Шчырым сэрцам сваім я кахаю.
Сьніцца мне кожну ноч
Гоман вуліц тваіх,
Успаміны пра час той суровы.
Ты й разбураны быў,
У руінах ляжаў,
І цяпер ты ажыў — горад новы.
Я ня бачыў цябе,
Як ты рос і мацнеў,
Як штодзень раскветаеш.
А ці помніш мяне?
Ці дабром ты мяне памінаеш?
Сьніцца часта мне сон —
На Шырокай жыву.
Пад засеньню квяцістых каштанаў
Ды гляджу праз вакно
Із кватэры сваёй
На прыгожы палац Опэры і Балета.
Там блізка я жыў
У тэатр твой хадзіў.
Даваенныя зімы і леты.
А цяпер я далёка жыву
Ад сталіцы маёй Беларусі.
Край нязнаны, чужы
Прытуліў, прыгарнуў.
Аўстралійцам цяпер я завуся.
Terra incognita ўсынавіла мяне
Сірату — бедака беларуса.
Я заўсёды цябе, родны Менск,
Добрым словам сваім успамінаю.
Хоць далёка за морам жыву,
Але ў думках сваіх
Я ўсё часта цябе навяшчаю.
У маладыя гады — я быў рабочым тады,
Майстраваў на заводзе машыны.
Алаведы пісаў пра геройства труда,
Пра лепшых рабочых Айчыны.
Ды навуку здабыў
У вядомым тваім БДУ.
Не па волі сваёй я патраліў ў бяду
Пры жорсткай уладзе савецкай.
За «памылкі свае» — што ня трэба
Сказаў я недазволеныя словы.
Палітычны «Отдел ГПУ-КГБ»
Мяне запісаў у «ліст асабовы».
Тое ўсё, што было —
Боль і крыўда мной перажыты.
Я ня помсьціўся тым,
Хто мяне шальмаваў,
Я ўсім дараваў.
Крыўда мною даўно ўжо забыта.
За цябе ваяваў, мілы горад, мой Менск
З фашыстоўскай навалай.
На франтах той вайны
Герояў сыноў загінула нас
Ой, ня мала!
Ліхалецьце вайны падхапіла мяне
Занясло ўдалячынь ад Айчыны.
Я цябе не забыў, любы горад мой Менск.
Я лічу сябе тваім сынам.
Я народжаны там,
Зьведаў шум баравы,
Блакіт рэчак, азёр,
Увесь край васількова-сіні.
На крайняй хаце сяла,
На саламянай страсе
Слухаў клёкат бусьліны.
Не забуду той край,
Не забуду я Менск —
Горад герой Беларусі.
А народ той прайшоў
Шлях цяжкі праз калючыя церні.
Горад родны, мой Менск,
Будзеш стольным народу свайму
Заўсёды яму верны,
І ніколі ня станеш
«Горадам Расейскай губэрні».
Жыві, весяліся, будзь сьмелы.
Разьвівайся, расьці і квітней.
Дэманструй, вышэй паднімай
Сьцяг бел-чырвона-белы.
Я жадаю табе ўзбагачацца.
А народ мне раднёй
Будзе вечна са мной
Родная мовай сваёй прывячацца.

Алесь Шыец

***

Ля калодзежа лаўка,
На лаўцы — вядзерачка,
У ім — празрыстае мора,
Найсмачнейшай вады.

Я ў думках лячу да цябе —
Мая вёсачка.
Як жывеш?
Як настрой?
Як там родныя вы?

***

Ад зла, ад нядолі, ад сумных нягод,
О, Божа-Айцец, уратуй наш народ!
Дай веры, надзеі, дай моцы трываць,
Праз змрочную цемру, сьвятла дачакаць!
Усім сэрцам Табе кожны дзень я малюся —
О, Божа-Айцец, хай жыве Беларусь!

Віталь Юрэвіч

ЖЫВЕМ

Я хутка адыду. Я растварэся ў глебе,
каб кветкамі ўзысьці ў духмяным мурагу.
Я буду матылём, магчыма, часткай неба,
А мо крынічкай ціхай да рэчкі пабягу.

А можа стану ў пушчы я дубам непахісным
І птушкі зашчабечуць у маім галлі.
А мо у дзень сьпякотны пад покрывам
цяністым
Ты засыпаваеш песню аб шчасьці на зямлі.

Я ветрам панясуся па полі залацістым
Пасьля імшы царкоўнай я загучу званом.
Я зоркай асьвячу жыцьцёвы шлях цярністы,
Калі куцыцю падзеліш са мной ты за сталом.

І ў радасьці, і ў ліха з табой я буду разам
Ня помнікам суровым, ня прывідам начэй.
Пакліч мяне ты толькі, — успыхну я адразу
Праменьчыкамі сонца ў вачох тваіх дзяцей.

Ірэна Янчанка

***

Мне сьніцца сон, хоць я ня сплю,
Нібыта я знайшла зямлю,
Дзе стрэла ўсіх сваіх сяброў
З былых і будучых часоў.
Адзін адному рады мы
І што пакінулі дамы,
Дзе ўсё не разумее нас,
А тут спыніўся марны час.

***

Нам ёсьць аб чым пагаманіць,
А можна ціха каву піць.
Тут усё сваё, тут наш абшар,
А зоркі — рэшта нашых мар.
І раскрываецца душа,
Як кветка, Што была Сьпярша,
Ці вецер ў вершалінах дрэў,
Ці маіх думак звонкі сьпеў.
Мне кожны дапаможа тут.
І абароніць ад пакут
Усіх нас і наш умоўны сьвет,
Стары, як неба залавет.
Усё раптам зьнікне ў гэты раз,
І на Пытаньне ёсьць Адказ.
Ды вось ня памятаю я,
А дзе была зямля мая?
Я толькі цень яе лаўлю...
Тады спала ці зараз сплю?
Прачнуцца тэбэ ці заснуць?
Каб зноў туды мне зазірнуць.
Што ж, застаецца ў плыні дзён
Чакаць, ці спраўдзіцца мой сон...

ПРА МОВУ, «ЭЛЕКТАРАТ» ДЫ ІНШАЕ...

Калі чалавек ня вельмі дасканала ведае якую-небудзь замежную мову, то, калі яму даводіцца размаўляць на гэтай мове, ён просіць свайго суразмоўцу гаварыць павольна. Гэта робіцца дзеля таго, каб мець магчымасьць усё сказанае перакласьці ў галаве на сваю звыклую мову. Інакш будзе згублены сэнс усяго толькі што сказанага. Тое самае можна сказаць аб усіх гэтых «слоўцах», якія ў апошні час запоўнілі наш моўны асяродак. Усе гэтыя «пэйджэры» ды «дылеры» ня вельмі цешаць слых беларуса. Я маю на ўвазе больш-менш адукаванага. Нібыта й разумееш яго (ведаеш дакладна пераклад), але ўсё роўна: чужое ёсьць чужое.

У мяне да гэтых словаў своесасаблівыя адносіны. Я, зразумела, ведаю, чым адрозьніваецца «тампакс» ад «сьнікерсу», але чамусьці, калі я іх чую, уяўляецца мне зусім ня тое, што яны азначаюць на самой справе. Напрыклад, той жа «пэйджэр» мне ўяўляецца ў выглядзе тоўстага лысага дзядзькі, кшталту Буржуіна зь вядомай дзіцячай казкі. «Холдынг» — гэта пажылая чапурыстая цётка, якая аддалена нагадвае Старую Шапакляк.

Але, на першым месцы сярод гэтых словаў у мяне стаіць «электарат». Не магу без жахлівасьці чуць гэтае слова, бо яно ў мяне ўяўляецца ў выглядзе жудаснай шэрай масы, якая вагаецца, калышацца і вось-вось праглыне і мяне, і ўсіх астатніх.

І я ведаю, што ня толькі ў мяне ўзьнікаюць такія асацыяцыі. І не таму гэта здараецца, што ў мяне ці ў каго іншага «страха» «паехала». Нічога ў нас не «паехала». Наадварот, гэта здаровая рэакцыя на чужое. Калі вам кажуць «сіняе неба», дык вы і ўяўляеце менавіта неба і менавіта сіняе. Калі кажуць «ручай», то горы вам наўрад ці ўяўляюцца. Але ж гэта так модна — пры гутарцы дзе-нідзе ды і ўсунуць якога-небудзь «дылера». Я зусім ня супраць усіх гэтых словаў, калі яны да месца. Мяне непакоіць іншае: як паступова памірае мая мова, бо калі замест слова «народ» або «насельніцтва» кажуць «электарат», гэта наводзіць на сумныя думкі.

У нас жа столькі словаў, столькі выразаў, ды такіх сакавітых, што розным там «амэрыканізмам» далёка да іх як да неба! Напрыклад, як можна перакласьці на якую-небудзь іншую мову выраз: «Што яны думаюць, мы тут грошы лапатай грабем? А мы таксама ў бэтах (г.зн. у банкрутстве) бываем!» Гэта была размова двух гандлярак пра падатковую інспэкцыю.

У кожнай вёсцы, у кожным раёне свая, непаўторная мова. Але, што самае дзіўнае, народ мой у сваёй большасьці не ўсьведамляе гэтую мову як сваю, як родную. Мая суседка, гараджанка зь вельмі невялікім стажам (дагэтуль жыла ў вёсцы) гаворыць на прыгожай беларускай мове, ледзь не акадэмічнай. Зайшла нейк да мяне, абурасцца: «Гэта ж ведаеш, ехала зараз з дачкою ў аўтобусе (дачцэ ейнай чатыры гадкі), жанчына нейкая пачала зь ёю па-беларуску гаварыць. Навошта дзіцяці язык ламаць? Яна ж у горадзе жыве, па-руску гаворыць!» Я так наіўна пытаюся: «А ты зараз на якой мове гаворыш? Кітайская ці можа партугальская якая? А можа ты ўсё ж па-беларуску гаворыш?» Яна працягвала ўпарціцца: «Я па-нашаму гавару! А беларускую мову я не люблю!»

Нонсэнс ды й толькі! Я так і не змагла яе пераўпэўніць. Наогул, у апошні час я ўсё больш маўчу, бо бачу, што мае погляды карэнным чынам адрозьніваюцца ад погляду большасьці. А яна, гэтая большасьць, калі разумее, што нехта думае ня так, як яна, рэагуе вельмі агрэсіўна.

Вельмі сьвежы прыклад. Зь вялікім жалем я пачула навіну пра сьмерць прынцэсы Даяны. Так цяжка было на душы, нібы каго з блізкіх страціла. Пад уплывам такога настрою я неасьцярожна выказала свой жаль сярод сваіх калегаў. О, як я потым аб гэтым пашкадавала! Чаго толькі не прыйшлося пачуць на адрас няшчаснай прынцэсы ды і на свой таксама! Што яна была ледзь не прастытуткай, што багатая, а так ім, гэтым капіталістам, і трэба. Няхай не разьяжджаюць на мэрсэдэсах! Давялося пачуць таксама, што нашыя калгасьніцы ня горшыя за яе. Сябры, хто ж аспрэчвае той факт, што калгасьніцы ня горшыя, але ж не аб гэтым размова. Божухна, мы ж лічымся хрысьціянамі! А як жа быць зь Біблейскім заклікам аб любові да бліжняга, да дабрыні?!

Можа, у мяне сапраўды «страха паехала», калі цэлы тыдзень не пра каўбасу думала, а шкадавала прынцэсу?

А можа я проста ніяк не магу зразумець таго непераможнага «люмпэнізму», калі можна сваёй хваравітай цікаўнасьцю давесьці чалавека да гібелі? Альбо калі можна адчуваць задавальненьне ад таго, што кагосьці засадзілі ў турму?

А можа гэта той незразумелы мне інстынкт самазахаваньня: няхай суседу будзе дрэнна, тады мне будзе лепш?!

Дзе знайсьці адказ?!

Ліля Сазанавец,
Ліда

Даведкі

СЛОЎНІКІ

Якія слоўнікі (беларуска-расейскія, расейска-беларускія) былі выдадзеныя ў нас і за межамі? Якія зь іх найбольш поўныя і аўтарытэтныя? Ці ёсьць магчымасьць іх набыць? Натуральна, я маю на ўвазе не савецкія выданьні, а з «аўтэнтычным правапісам», з жывой мовай.

А.Аксёнаў,
Гомель

Большасьць «несавецкіх» слоўнікаў беларускай мовы, выдадзеных за апошні час, складаюць факсымільныя перавыданьні аўтарскіх слоўнікаў ранейшага часу. Найбольш вядомыя і даступныя зь іх такія:

Іван Насовіч. Слоўнік беларускай мовы (Словарь бѣлорусскаго наръчия). – СПб, 1870. Перавыдадзены факсымільна ў Менску ў 1983 годзе. Слоўнік адлюстроўвае лексыку (больш за 30 тыс. словаў) жывой беларускай мовы, сабраную аўтарам у Магілёўскай, Менскай, Гарадзенскай і Віленскай губэрнях. Дзякуючы сваёй універсальнасьці, разнастайнасьці моўнага матэрыялу і надзвычай багатай ілюстраванасьці артыкулаў, слоўнік дагэтуль застаецца адным з найбольш грунтоўных даведнікаў беларускай лексыкі.

М.Байкоў і С.Некрашэвіч. Беларуска-расейскі слоўнік. –Менск, 1925. Перавыдадзены факсымільна ў 1993 годзе немалым накладам, таму яго яшчэ можна набыць у букіністычных кнігарнях. Падбор лексыкі мае кантрастыўны характар (г.зн. зьмяшчаюцца, як правіла, беларускія словы, якія розьняцца ад сваіх расейскіх адпаведнікаў вымоваю, напісаньнем альбо сэнсам), таму гэты слоўнік у параўнаньні зь іншымі дастаткова сьціслы.

Вацлаў Ластоўскі. Падручны расейска-крыўскі (беларускі) слоўнік. – Коўна, 1924. Перавыдадзены факсымільна ў Менску ў 1991 г. Мае каля 17 тыс. слоўнікавых артыкулаў. Як прадстаўнік моўнага пурызму В.Ластоўскі вырашае задачы слоўніка, выкарыстоўваючы ўласнабеларускія моўныя рэсурсы. Вельмі выразна праяўляецца ў слоўніку адметнасьць беларускай лексыкі, бо захаваньне моўнае індывідуальнасьці Ластоўскі лічыў падставай далейшага разьвіцьця нашае мовы.

Янка Станкевіч (з Ант. Адамовічам). Маленькі маскоўска-беларускі (крывіцкі) слоўнічак фразэалягічны і прыказкаў ды прывітаньні, зычэньні і інш. – Менск, 1944; 3-е выданьне – 1992. Слоўнік мае каля 250 артыкулаў зь беларускім тлумачэньнем расейскіх устойлівых словазлучэньняў, зваротаў і г.д. штодзённага ўжытку. Гэты слоўнік, мяркуючы зь вялікага накладу, можна набыць.

Янка Станкевіч. Беларуска-расейскі (Вялікалітоўска-расейскі) слоўнік. – Нью-Ёрк, 1990. Больш за 60 тыс. артыкулаў. У слоўнік уваходзіць выбранае зь іншых слоўнікаў (І.Насовіча, У.Даля, М.Гарэцкага, М.Байкова, М.Касьяровіча, М.Шатэрніка), а таксама сабранае самім аўтарам. Паводле аб'ёму матэрыялу –гэта адзін з найбагацейшых аўтарскіх слоўнікаў беларускай мовы.

Антон Кузьміч

СПАДАРУ РЭДАКТАРУ,

№27-28 «НН» атрымаўся ўдалы мо шчэ таму, што «НН» — тавар амаль паштучны. Хачу спыніцца на назове «Эйрэ» з матэрыялу сп. Валеры Буйвала. Сапраўды, у лацінскім напісаньні EIRE можна прачытаць як «эйрэ», але у сапраўднасьці па гэльску вымаўляецца як «ЭРЭ». Назоў Ірляндыі ў аўтэнтычнай форме было б, на мой погляд, больш правільна падаваць фанэтычна, бо ўсё роўна кірыліца не захоўвае вонкавае аблічча лацінскага напісаньня. Ды й фанэтычны прынцып беларускага правапісу не супярэчыць гэтаму.

Шматлікія назоўнікі ўласныя ў нас падаюцца ў скажонай русіфікаванай форме (у Францыі (Франс) не было караля Людовіка, а быў Луі, у Англіі (Інглэнд) не было караля Карла, а быў Чарлз, не было караля Якава (!), а быў Джэймз і г.д.).

Дарэчы, слова «poblacht» азначае «рэспубліка», а не «Часовы ўрад».

Закрану таксама матэрыял кампаньера Лёліка Вушкіна пра «Эры Батасуна». Я разумею сымпатыю кампаньера Вушкіна да ЭТА, бо сам сымпатызант ІРА. І гэтыя сымпатыі нам, зацісьнутым у кут акупацыйным рэжымам, зусім натуральныя. Справа трошкі іншая з гледзішча жыхара Эрэ альбо Гішпаніі. Да нашага зьдзіўленьня ён у пераважнай большыні адмоўна ставіцца да забойства, нават у імя сьветлай будучыні. (Гэта вам не лістападаўскі плебісцыт — забіваць ці не!) Я ўважліва слухаў гішпанскае радзіва пад час забойства М.Бланко. Чым жа той М.Бланко завінаваціўся перад ЭТА? Мо проста зарэзалі чалавека, каб мець гучны розгалас?

Лёлік Вушкін, пішы ясную праўду!

У «Эпіконе» у Зьмітра Сідаровіча фігуруе дзеяслоў «сапела». На маю думку, дзеяслоў «сапці» мае ў мінулым часе форму «соп», «сапла». Мяркую, што трэба замяніць расейскае слова «дзярмо» на правільнае беларускае «гаўно» Ігару Сідаруку. Для большай выразнасьці можна і з прыметнікам — «гаўно сьвінос». Рэкамэндую для ўжытку і ягоную цьвёрдую хворму — «каўляш». Далей, па тэксту «У вольнай (ха-ха!..) руцэ — два зацісьнутых пяцібаксавіка». Мо лепей «два зацісьнутыя пяцібаксавікі»?

Вядома, матэрыял пра 'пэдэрастаўгомасэксуалістаў цалкам памылковы. Няма чаго спрабаваць эстэтызаваць грэх і брыдоту. Можна як хочаш зьдзеквацца са сваіх геніталіяў, але рабі гэта ў будуары, а не на старонках элітысцкай газэткі. Тэарэтызаваць тут няма чаго. «... зламілі сабе галаву». Мо ўсё ж «зламалі сабе галаву»?

На апошняй старонцы «Мастацтва... было наскрозь прапітанае сымбалізмам». «Прапітанае» — цяжкае слова для перакладу. Тут можна было б падаць як «прасякнутае», «працятае».

Далей: «... І гатовыя захлопнуць яе труну вечным камянём». «Захлопнуць» — цалкам небеларускае слова.

Хацелася б пачытаць хрысьціянскую паэзію ў «Грамафоне».

Элітысцкі пэрыёдык не павінен дапускаць прыкрыя моўныя хібы на свае элітысцкія бачыны.

P.S. Давайце вяртаць клічны склон.

Мікола Бусел,
Дуброва

РЭЦЭНЗІЯ

Усё для фронту, усё для перамогі

Суднік С., Чыслаў С. Расейска-беларускі вайсковы слоўнік. — Менск: Белфранс, 1997. — 250 с.

Спробы ўкласьці слоўнік вайсковых тэрмінаў і шыхтовых камандаў рабіліся ад часу, калі рубам стала праблема аб стварэньні беларускага нацыянальнага войска, а менавіта з 1918 году. Гэты час можна лічыць пачаткам працы ў галіне беларускай вайсковай тэрміналёгіі, якая практычна, нягледзячы на палітычную кан'юктуру, не прыпынялася аж да сёньняшніх дзён.

Многія беларускія мовазнаўцы надавалі немалую ўвагу вайсковай тэрміналёгіі. Напрыклад, шырока вядомы «Падручны Расейска-Крыўскі (Беларускі) слоўнік» Вацлава Ластоўскага, выдадзены ў 1924 годзе ў Коўне, мае цэлы разьдзел, прысьвечаны беларускім вайсковым камандам і тэрмінам.

Распрацоўка беларускай вайсковай лексыкі пэўны час ішла і ў БССР. У канцы 20-х гадоў у СССР дзейнічаў прынцып фармаваньня ўзброеных сілаў паводле нацыянальна-тэрытарыяльнага прызнаку. У той час існавалі вайсковыя адзінкі, сфармаваныя выключна зь беларусаў, а таму і каманды мусілі неяк беларусізаваць. Але ўжо ў пачатку 30-х з такой практыкай было скончана (ад тых часоў і аж да скону СССР беларусы служылі ў Сібіры ці на Далёкім Усходзе, а Беларусь абаранялі выхадцы з Каўказу і Сярэдняй Азіі), і ўсе напрацоўкі ў гэтай галіне былі ня тое што непатрэбнымі, а прызнаныя скрайне шкоднымі і былі пушчаныя пад нож (нярэдка разам зь іхнымі распрацоўшчыкамі).

Патрэба распрацоўкі вайсковай тэрміналёгіі ўзьнікала тады, калі ўзьнікала магчымасьць стварэньня беларускіх нацыянальных вайсковых фармаваньняў. Але найбольш востра яна стала пасьля распаду СССР і ўзьнікненьня Ўзброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.

Папярэднікам гэтаму слоўніку быў «Кароткі расейска-беларускі вайсковы слоўнік», выдадзены ў 1993 годзе, які ўтрымліваў каля 1000 словаў і большасьць шыхтовых і пазашыхтовых камандаў. У 1996 годзе на ініцыятыву Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь быў выдадзены «Руска-беларускі слоўнік для вайскоўцаў», які паводле сваёй лексыкі меў мала агульнага (калі не сказаць болей) з той беларускай моўнай традыцыяй, якая ўжо пасьпела скласьціся ў галіне вайсковай тэрміналёгіі. Таму паўстала вострая патрэба ў больш поўным вайсковым слоўніку, які б адпавядаў традыцыі нацыянальнага войска. Гэты «Расейска-беларускі вайсковы слоўнік» якраз арыентуецца на гэтую традыцыю.

Слоўнік утрымлівае 8000 словаў і словазлучэньняў сучаснай вайсковай і пабытовай лексыкі, а таксама дае ўсю сыстэму вайсковых шыхтовых і пазашыхтовых камандаў. У шмат якіх перакладах расейскіх тэрмінаў аўтары выступілі наватарамі, што тлумачыцца спэцыфікай сучаснага войска. Акрамя таго, некаторым тэрмінам, якія ўжо замацаваліся ў беларускай мове, даюцца варыянты (напр. супрацьгаз — газаахоўнік; гарнізон — залога і некат. інш.). Можна заўважыць і некаторыя непасьлядоўнасьці (напр. шараговец — шарэнга, замест шэраг). Даюцца таксама пераклады вайсковых чыноў, кшталту гетман, паручнік, харужы і г.д., што (на жаль) не адпавядае сучаснай арганізацыі Ўзброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь, але каштоўнае на пэрспэктыву.

«Расейска-беларускі вайсковы слоўнік» — найбольш поўны на сёньняшні дзень у сваім родзе, і, безумоўна, станецца асноўнай базай для далейшай распрацоўкі ў галіне вайсковай тэрміналёгіі.

Паўлюк Канавальчык

Бібліяграфія Міхася Раманюка

Працяг са старонкі 8.

15. Тэорыя і гісторыя мастацкай крытыкі. Праграма для спэцыяльнасьці: мастацтвазнаўства. – Менск: БелАМ, 1995

II. НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ І АРТЫКУЛЫ

1. Жаночае народнае адзеньне (паўднёва-заходнія раёны Берасьцейшчыны, канец XIX – пач. XX ст.) // Помнікі гісторыі культуры Беларусі. №3. 1971
2. Традиции белорусского народного костюма и моделирование современной одежды // Краткие тезисы докладов к всесоюзной научной конференции аспирантов вузов и научно-исследовательских учреждений искусств и культуры, посвященной 50-летию образования СССР. 30 мая – 3 июня 1972 г. – Ленинград, 1972
3. Современность и традиции // Мода-74. – Менск, 1973
4. Ручнік // БелСЭ. Т.9, 1973
5. Сьвяточныя строі жанчын Мазыршчыны / / Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. №2. 1975
6. Вясёлкі ў падарунак // Маладосць. №2. 1975
7. Творы даўняга рамяства // Беларусь. №8. 1975
8. Народный костюм Белорусского Полесья (конец XIX – начало XX вв.): Автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата искусствоведения. – Менск: АН БССР, 1975
9. Панёва // БелСЭ. Т.8, 1975
10. Пояс // БелСЭ. Т.8, 1975
11. Прасьніца // БелСЭ. Т.8, 1975
12. Белорусские рушники // Советская женщина. №8. 1976
13. Творы даўняга рамяства // Советская женщина. №8. 1976
14. Беларускае народнае адзеньне. Энцыкляпэдыя часопіса «Бярозка» (артыкул, графічная рэканструкцыя) // Бярозка. №3. 1979
15. Выставка произведений самодеятельных художников и мастеров декоративно-прикладного искусства Белорусской ССР «Тебе, родная партия, наше творчество и мастерство». Каталёг. – Менск: Белсовпроф, 1981
16. Сучасная кераміка Беларусі // Выяўленчае мастацтва Беларусі. – Менск, 1981
17. З рукатворнай спадчыны // Беларусь. №12. 1981
18. Беларускі нацыянальны касьцюм (манаграфія на французскай мове). – Парыж, 1981
19. Беларускае народнае адзеньне. – Менск: Беларусь, 1981
20. Паэзія беларускага народнага касьцюма. У кн: Беларускі каляндар. – Беласток, 1982
21. Ёсьць куток на зямлі // Бярозка. №10. 1982
22. У вянок песьнярам // Беларусь. №12. 1982
23. СССР – наша Радзіма // Мастацтва Беларусі. №1. 1983
24. Мовай фарбаў // Мастацтва Беларусі. №5. 1983
25. Калінкавіцкі строй // Мастацтва Беларусі. №6. 1983
26. Барвы Леаніды Ючковіч // Мастацтва Беларусі. №9. 1983
27. Узоры сцэнічнага касьцюма // Мастацтва Беларусі. №11. 1983
28. Застаўска-завершанскія куфры // Мастацтва Беларусі. №1. 1984
29. Харство высокай пробы // Мастацтва Беларусі. №4. 1984
30. Панямонскі дыван Шлячковай // Мастацтва Беларусі. №6. 1984
31. Мастацтвазнаўча-этнаграфіная раянаваньне Беларускага Палесься (паводле матэрыялаў народнага касьцюма, узорыстага ткацтва і вышыўкі беларусаў канца XIX – сярэдзіны XX ст.). У кн.: Помнікі старажытна-беларускай культуры. Новыя адкрыцьці. – Менск: Навука і тэхніка, 1984
32. Абрус // Тамсама
33. Абутак // Тамсама
34. Агоўская размалёўка // Тамсама
35. Адзеньне // Тамсама
36. Андарак // Тамсама
37. Брагінскі строй // Тамсама
38. Бруздовіч Францішак // Тамсама
39. Брыль // Тамсама
40. Буда-Кашалёўскі строй // Тамсама
41. Буда-Кашалёўскія ручнікі // Тамсама
42. Бурка // Тамсама
43. Бурнос // Тамсама
44. Ваўкавыска-Камянецкі строй // Тамсама
45. Вілейскі строй // Тамсама
46. Віцебскія ручнікі // Тамсама
47. Віцьцё мастацкае // Тамсама
48. Вышыўка // Тамсама
49. Слуцкая ткачиха Ганна Полещук. У кн.: Народные мастера. Традиции, школы. Выпуск 1. – Москва: Изобразительное искусство, 1985
50. Художественная соломка Белоруссии. Творчество В.И.Гаврилюк и Л.Г.Головацкой. – Тамсама
51. Матэрыяльнная культура і сялянскі побыт вёскі Мікалаеўшчыны. У кн.: Тэзісы дакладаў і паведамленьняў навуковай канфэрэнцыі з нагоды Дня нараджэньня народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. – Менск: Міністэрства культуры БССР, 1985
52. Галаўныя уборы // ЭЛіМБел. Т.2, 1985
53. Гарсэт // Тамсама
54. Гарадзенскія дываны падвойныя // Тамсама
55. Давыд-Гарадоцка-Тураўскі строй // Тамсама
56. Давыд-Гарадоцкія куфры // Тамсама
57. Дамачоўскі строй // Тамсама
58. Дубровенскі строй // Тамсама
59. Дываны маляваныя // Тамсама

Фота з архіву Міхася Раманюка

60. Жупан // Тамсама
61. Звязда // Тамсама
62. Кабат // Тамсама
63. Кажух // Тамсама
64. Калінкавіцкі строй // Тамсама
65. Камізэлька // Тамсама
66. Каптур // Тамсама
67. Капыльска-Клецкі строй // Тамсама
68. Капыльска-Клецкія ручнікі // Тамсама
69. Картуз // Тамсама
70. Карункі // Тамсама
71. Кветкі зямлі Капыльскай // Мастацтва Беларусі. №12. 1986
72. Кашуля // ЭЛіМБел. Т.3, 1986
73. Кобрынскі строй // Тамсама
74. Краснапольскі строй // Тамсама
75. Лепельскі строй // Тамсама
76. Лідзкія куфры // Тамсама
77. Куфар // Тамсама
78. Куфры размаляваныя // Тамсама
79. Ляхавіцкі строй // Тамсама
80. Ляхавіцкія ручнікі // Тамсама
81. Магерка // Тамсама
82. Магілёўскі строй // Тамсама
83. Маларыцкі строй // Тамсама
84. Мотальскі строй // Тамсама
85. Мастоўскі строй // Тамсама
86. Наваградзкі строй // Тамсама
87. Мотальскія кажухі // Тамсама
88. Мотальскі ручнік // Мастацтва Беларусі. №3. 1987
89. Намітка // ЭЛіМБел. Т.4, 1987
90. Народныя строі // Тамсама
91. Неглюбскі строй // Тамсама
92. Панёва // Тамсама
93. Пінска-Івацэвіцкі строй // Тамсама
94. Пінска-Івацэвіцкія ручнікі // Тамсама
95. Пухавіцкі строй // Тамсама
96. Ручнік // Тамсама
97. Саян // ЭЛіМБел. Т.5, 1987
98. Сьвіта // Тамсама
99. Слуцкі строй // Тамсама
100. Сурвэтка // Тамсама
101. Турава-Мазырскі строй // Тамсама
102. Фартух // Тамсама
103. Фіранкі // Тамсама
104. Хустка // Тамсама
105. Чапец // Тамсама
106. Чачэрскія куфры // Тамсама
107. Чылка // Тамсама
108. Шабета // Тамсама
109. Новае жыцьцё старажытнага мастацтва // Мастацтва Беларусі. №3. 1988
110. Мужчынскія галаўныя ўборы // Беларускае мастацтва і літаратура ў школе. №10. 1988
111. Выбух, які радуе // Мастацтва Беларусі. №1. 1988
112. Песьня Беларусі // Мастацтва Беларусі. №7. 1988
113. Брагінскі строй // Мастацтва Беларусі. №6. 1988
114. Вашчанка Гаўрыла Харытонавіч. Уступны артыкул да каталёгу выставы 1988 году. – Менск: Саюз мастакоў Беларусі, 1988
115. Куфар у мастацкай культуры інтэр'ера сялянскай хаты. У кн.: Помнікі мастацкай культуры Беларусі. Новыя дасьледаваньні. – Менск: Навука і тэхніка, 1989
116. Ляхавіцкі строй. У кн.: Памяць. гісторыка-дакумэнтальная хроніка Ляхавіцкага раёну. – Менск: БелСЭ, 1989
117. Абутак // Этнаграфія Беларусі. – Менск, 1989
118. Касьцюмы «з народным калярытам» / / Мастацтва Беларусі. №2. 1989
119. Народны касьцюм Піншчыны // Беларуская мова і літаратура ў школе. №4. 1989
120. Валеры Шкаруба. Каталёг выставы. – Менск: Саюз мастакоў БССР, 1989
121. Паэзія хараства. Творчасьць народных майстроў мастацкага фонду БССР. – Менск: Саюз мастакоў БССР, Мастацкі фонд БССР, 1989
122. Аблавуха // Этнаграфія Беларусі. – Менск, 1989
123. Агоўская размалёўка // Тамсама
124. Адзеньне // Тамсама
125. Андарак // Тамсама
126. Бекеша // Тамсама
127. Бравэрка // Тамсама
128. Брагінскі строй // Тамсама
129. Брыль // Тамсама
130. Буда-Кашалёўскі строй // Тамсама
131. Бурка // Тамсама
132. Бурнос // Тамсама
133. Ваўкавыска-Камянецкі строй // Тамсама
134. Вілейскі строй // Тамсама
135. Віцебскія ручнікі // Тамсама
136. Віцьцё мастацкае // Тамсама
137. Вэлюм // Тамсама
138. Вянок // Тамсама
139. Галаўныя ўборы // Тамсама
140. Галовачка // Тамсама
141. Гарсэт // Тамсама
142. Гафт // Тамсама
143. Давыд-Гарадоцка-Тураўскі строй // Тамсама
144. Дамачаўскі строй // Тамсама
145. Дзеравяшкі // Тамсама
146. Дубровенскі строй // Тамсама
147. Кабат // Тамсама
148. Кажух // Тамсама
149. Калінкавіцкі строй // Тамсама
150. Калінкавіцкія ручнікі // Тамсама
151. Камізэлька // Тамсама
152. Каптур // Тамсама
153. Капыльска-Клецкі строй // Тамсама
154. Капыльска-Клецкія ручнікі // Тамсама
155. Картуз // Тамсама
156. Касьнікі // Тамсама
157. Кафтан // Тамсама
158. Кашуля // Тамсама
159. Кобрынскі строй // Тамсама
160. Краснапольскі строй // Тамсама
161. Кубак // Тамсама
162. Кунтуш // Тамсама
163. Лепельскі строй // Тамсама
164. Ляхавіцкі строй // Тамсама
165. Ляхавіцкія ручнікі // Тамсама
166. Магерка // Тамсама
167. Магілёўскі строй // Тамсама
168. Маларыцкі строй // Тамсама
169. Мастоўскі строй // Тамсама
170. Мотальскі строй // Тамсама
171. Мотальскія кажухі // Тамсама
172. Мятлік // Тамсама
173. Наваградзкі строй // Тамсама
174. Нагавіцы // Тамсама
175. Намітка // Тамсама
176. Народныя строі // Тамсама
177. Насоў // Тамсама
178. Неглюбскі строй // Тамсама
179. Падзічка // Тамсама
180. Панёва // Тамсама
181. Пасталы // Тамсама
182. Пацеркі // Тамсама
183. Пінска-Івацэвіцкі строй // Тамсама
184. Посьцілка // Тамсама
185. Пухавіцкі строй // Тамсама
186. Рукавіцы // Тамсама
187. Саян // Тамсама
188. Скіндачка // Тамсама
189. Слуцкі строй // Тамсама
190. Спавівач // Тамсама
191. Спадніца // Тамсама
192. Сурвэтка // Тамсама
193. Сярмяга // Тамсама
194. Турава-Мазырскі строй // Тамсама
195. Хустка // Тамсама
196. Чапец // Тамсама
197. Чачэрскія куфры // Тамсама
198. Чылка // Тамсама
199. Шабета // Тамсама
200. Шнуроўкі // Тамсама
201. Сучасная кераміка Беларусі. У кн.: Выяўленчае мастацтва Беларусі. – Менск: Беларусь, 1989
202. Дзявочыя галаўныя ўборы // Беларуская мова і літаратура ў школе. №1. 1990
203. Зачараваньне беларускім краявідам / / Мастацтва Беларусі. №3. 1990
204. Вянок куст // Мастацтва Беларусі. №3. 1990
205. «Чорная быль» у Нью-Ёрку // Мастацтва Беларусі. №2. 1991
206. Зь вялікага грому малы дождж // Мастацтва Беларусі. №9. 1991
207. Зямныя велічныя духі // Мастацтва Беларусі. №4. 1991
208. «Я вазёрную сінечу... сярод гор лаўлю». Творчасьць Нго Суан Біна // Мастацтва Беларусі. №4. 1992
209. Вяртаньне ў май // Мастацтва Беларусі. №3. 1992
210. Мастацтвазнаўча-этнаграфічнае раянаваньне Паазер'я (паводле матэрыялаў традыцыйнага нацыянальнага касьцюма беларусаў XIX – першай паловы XX ст.). У кн.: Матэрыялы навукова-практычнай канфэрэнцыі «Гістарычнае і народнае адзеньне Віцебшчыны». –Віцебск: Навукова-мэтадычны цэнтар народнай творчасьці, 1992
211. Антон Такарэўскі – народны майстар. У кн.: Памяць. Гісторыка-дакумэнтальная хроніка Пружанскага раёну. – Менск: БелЭн, 1992
212. Куфры Пружаншчыны. – Тамсама.
213. Натхнёны жыцьцём вёскі // Мастацтва. №1. 1992
214. Саюз промня і чалавечага генію // Мастацтва. №3. 1992
215. Навукова-практычнае значэньне канфэрэнцыі «Гістарычнае і народнае адзеньне Віцебшчыны». У кн.: Матэрыялы навукова-практычнай канфэрэнцыі «Гістарычнае і народнае адзеньне Віцебшчыны». – Віцебск: Навукова-мэтадычны цэнтар народнай творчасьці, 1992
216. Вяшчун Беларускасьці // Голас Радзімы. №48. 26 лістапада 1992
217. Адзеньне // Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі, 1993
218. Галаўныя ўборы // Тамсама.
219. «Студэнт – як чуйная мэмбрана...» Разам з В.Трыгубовіч // Мастацтва. №10. 1993
220. Афорты і малюнкі Васіля Баранава... / / Беларусь. №11. 1993
221. Натхнёна пра Беларусь // Маладосьць. №2. 1993
222. «Агарожа для коней», альбо «Вечны сад» (артыкул пра сучаснае выяўленчае мастацтва Нямеччыны) // Мастацтва. №8. 1994
223. Колер, якім пульсуе матэрыя // Мастацтва. №9. 1994
224. Песьні і строі Піншчыны (навуковая манаграфія). Разам з В.Ліцьвінкам, У.Раговічам. – Менск: Бел. ін-т праблем культуры, 1994
225. Шляхі адраджэньня нацыянальных мастацкіх традыцыяў. У кн.: Матэрыялы навукова-практычнай канфэрэнцыі «Народныя паясы – мастацтва і рамяство». – Менск: Бел. ін-т праблем культуры, 1994
226. Вышыўка // Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі. Т.2, 1994
227. Галаўныя ўборы // Тамсама
228. Этнаграфічныя малюнкі Язэпа Драздовіча // Спадчына. №3. 1994
229. Віртуоз Давыд-Гарадоцкае размалёўкі // Мастацтва. №1, 1995
230. Чароўныя куфры Лідзіі Доўгер // Мастацтва. №6, 1995
231. Саламяная рапсодыя // Мастацтва. №9, 1995
232. Цярпеньне і радасьці працоўні // Мастацтва. №7. 1995
233. З Маладога ўсяго многа... // Мастацтва. №10. 1995
234. Апошні з магікан старадаўняй традыцыі // Мастацтва. №1. 1996
235. Рамяство. Ад прадзедаў к нашчадкам // Мастацтва. №3. 1996
236. Некалькі адкрыцьцяў аднаго фэстывалю // Мастацтва. №12. 1996

III. КРЫТЫЧНАЯ ПУБЛІЦЫСТЫКА

1. Сустрэчы з адвечным. Рукатворныя мэлёдыі // ЛіМ. 25.09.1970
2. Работы народных умельцаў // Ленінец. 10.03.1970
3. І сучаснае, і традыцыйнае... // ЛіМ. 16.02.1973
4. Народныя традыцыі і сучасны касьцюм / / ЛіМ. 4.10.1974
5. Как мы одевались // Вечерний Минск. 14.04.1975
6. Строі вясковых жанчын // Голас Радзімы. Ліпень 1975
7. Рукатворныя мэлёдыі // ЛіМ. 13.02.1976
8. З народных крыніц // ЛіМ. 3.12.1976
9. Сцэнічны касьцюм, якім яму быць? // ЛіМ. 3.06.1977
10. Пара шчасьлівая, пара адказная // ЛіМ. 15.07.1977
11. «Як быццам вернесься ў май...» // Голас Радзімы. 7.07.1977
12. Роздум аб зямлі беларускай // ЛіМ. 10.11.1978
13. Веснавое рэха // ЛіМ. 27.10.1978
14. Фарбы беларускага краю на берагах Нявы // ЛіМ. 3.11.1978
15. Першыя крокі // ЛіМ. 25.08.1978
16. Краски родного края // Сельская газета. 13.08.1978
17. Фарбы роднай зямлі // ЛіМ. 11.07.1978
18. Красаваць і налівацца важкім коласам / / ЛіМ. 11.05.1979
19. Ля вытокаў // ЛіМ. 28.12.1979
20. Вечны гоман кроснаў // ЛіМ. 4.05.1979
21. Фарбы Узбэкістану ў Менску // ЛіМ. 1979
22. Пара творчага станаўленьня // ЛіМ. 15.02.1980
23. Праз усё жыцьцё. Да 80-годзьдзя з дня нараджэньня Пятра Сергіевіча // ЛіМ. 8.08.1980
24. Мэлёдыі народнага хараства. Нататкі зь першай рэспубліканскай выстаўкі народнага касьцюма, якая адчыненая ў залях Дзяржаўнага музэю БССР // ЛіМ. 15.08.1980
25. Шчымлівая песьня душы // Голас Радзімы. 4.09.1980
26. Пара творчага паўналецьця // ЛіМ. 12.09.1980
27. На сучасным узроўні // ЛіМ. 8.08.1980
28. Па адзеньні сустракаюць // Голас Радзімы. 22.01.1981

ЭПІКОН

СЯРГЕЙ КОНАН

ПАДНЯЦЦА З КАЛЕН

Ці спрабавалі вы падняцца з кален? Проста ўзяць і ўстаць на ногі. Агледзецца вакол і зразумець — гэта так проста ўстаць з кален. Але паспрабуйце ня ўпасьці на іх, калі навакол стаяць на каленях. Вам хочацца знайсьці падтрымку? Вы глядзіце, хочаце ўбачыць погляд-падтрымку. Яго няма. Толькі быццам сьсечаны лес, вакол чорныя патыліцы. Недзе там, у далечыні, можа нехта зрабіў тое самае. Але немагчыма ўчапіцца нават позіркам. Толькі адчуваньне: я не адзін.

Тыя, хто побач, ня могуць зразумець. І пытаюць, маўкліва пытаюць: Навошта?

Як навошта? Адчуць сябе вольным. Можна ісьці і нічога не баяцца.

Можна дыхаць вальней...

Тупы і балючы ўдар у сьпіну. Я прачнуўся. Усё толькі сон? Так. Я стаю на каленях. Адразу ж спроба ўзгадаць і як мага мацней запомніць, як добра стаяць на нагах. Я раблю так кожнае раньне. Запамінаю і забываю, каб новай ноччу ўсё ўбачыць і пражыць ізноў: устаць. Зрабіць некалькі крокаў, уздыхнуць і... прачнуцца.

Усе ночы, як і ўсе дні, падобныя ўнутры.

Невядома, колькі мы стаім на каленях. Я з нараджэньня. У мяне, як і ў кожнага, сваё месца. Такое наша жыцьцё. Лічыцца, што мы і стаяць ужо ня можам, ногі не прыдатныя да гэтага. Праўда ці не, я ня ведаю, але, як і астатнія, ні разу ня бачыў, каб нехта стаяў на нагах.

Гэта нельга, бо забаронена. Кім?

Ізноў ня ведаю адказу, проста нельга і ўсё.

Некаторыя называюць наш стан карай. Другія лічаць гэта сэнсам нашага агульнага існаваньня. Вы зьдзіўленыя, што мы думаем. А што яшчэ можна рабіць? Думаць і ствараць ідэі апраўданьня, каб потым жыць імі.

Мяркуюць, што пакуль мы ў такім становішчы, нам нічога ня трэба, акрамя сну. І той вельмі кароткі.

Я часамі спрабую ня спаць і тады бачу ноч, цемру і ўяўляю, што крочу наперад. Уначы ж павінны мы спаць і бачыць адзін той самы сон, як удзень стаім на каленях. Ніхто ня дзеліцца сваімі снамі, ды й навошта, калі ўсе павінны бачыць адно. У адваротным выпадку павінна быць кара. Зьдзіўляе адно. Мяне кара яшчэ не спасьцігла. Можа, гэта прыдумка?

Я б устаў, я б пакрочыў. Толькі б хто-небудзь яшчэ падтрымаў. Адзін не магу. Навакольле маўчыць. Ніхто ні з кім не размаўляе. Як можна такое рабіць з чужой сьпінаю. Таму цішыня. Я проста нота гэтай цішыні.

Але мы ёсьць. Праўда, навошта, ня ведаем. Можа, таму, хто прымусіў нас жыць так, прыемна: я змог паставіць безьліч істот на калені. Я, праўда, нікога ня бачыў і ня чуў. Прыдумка мая праз тое трошкі сьмешная.

Больш за ўсё мяне турбуе адно: а калі да нас нікому няма справы, мы проста прызвычаіліся. З апошняга часу мая гіпотэза стала асноўнай падставай для развагаў. Я знаходжу шмат доказаў, вымаўлёўваючы карціну ўнутранай залежнасьці. Усё праз нашыя душы. Напалоханыя некалі, яны прымусілі цела апусьціца на калені і, супакоіўшыся, забаяліся нешта мяняць. Вось і я зараз адгаворваю сябе. Ня трэба, не рабі. Калі ня я, дык хто? Можа, я адзін дайшоў да такіх высноваў? Таму я проста павінен...

Галоўнае, не палохацца. Самае жахлівае: я ізноў бразнуся на калені. Ну, можа скончыцца жыцьцё. Усё ня так страшна.

Далоні вільготныя, спацелі ад хваляваньня, ды й ногі дрыжаць. Іншага выйсьця няма. Трэба пачынаць.

Абаперціся на левую руку, павольна падцягнуць правае калена ўверх, паставіць нагу. Нічога. Здаецца, усё нармальна. (Цікаўнасьць зьядае страх). Другую. Зараз выпрастаецца. Я ня падаю! Я стаю на нагах! Цяпер уздыхнуць на поўныя грудзі, зрабіць маленькі крок уперад.

Я магу.

Я зрабіў гэта.

Хоць астатнія пакуль засталіся, я змог вырвацца.

Я стаў вольным. І гэта ня сон.

СЯРГЕЙ ПРЫЛУЦКІ

РОЗДУМ ПАД ДАЖДЖОМ

Брудная восень халодным дажджом забілася па чорным асфальце. Спачатку нясьмела, нібы чагосьці баючыся, празь некалькі хьвілін ён ужо сьпешна крочыў па горадзе.

Маленькія кропелькі зьліваюцца ў раўчакі-ніткі, якія, абмінаючы каменьчыкі і сьмецьце, рухаюцца да засыпанай лістотай цёплай зямлі. Якаясь невядомая сіла цягне іх да яе... Не відаць нічога — ні зорак, ні месяца, ні белых аблокаў. Толькі, нібы волаты вакол свае ахвяры, узвышаюцца сылюэты дамоў.

З чорнай бездані нябёсаў данесься грокат. Настырныя кроплі яшчэ з большым запалам пачалі абдорваць стомлены твар сьвежасьцю. У доме насупраць загарэлася сьвятло. Відаць, таксама камусьці ня сьпіцца. Мабыць, як і мне, не даюць заснуць сумныя думкі, патрабуючыя сур'ёзнага разважаньня, адказу на пытаньні, якія, напэўна, вырашаць далейшае жыцьцё. Сьвятло расьсеялася ў паветры, асьвятліўшы здурнелую непагадзь. Дзесьці ў цемры — паваленае дрэва. Яшчэ два гады назад спаліла яго маланка. Зьнішчыла прырода сваё дзіця, якое і цяпер ляжыць, нікому не патрэбнае. Яно нагадвае маё дзяцінства — такое ж чорнае і такое ж нежывое...

Ні на хвіліну не пакідае пачуцьцё сораму за нявыкананы абавязак. Адзінае, што ратуе — сьцяг пад курткай. Два гады назад такога ж колеру была й мая сьвяточная белая кашуля. Чырвоная «фарба» цёплымі струменьчыкамі цекла па целе. Сэрца гатовае было вырвацца наўздагон сьмерці. А колькі іх білася вакол у маленькім танцы! Гэта павінна было здарыцца, як заканамернасьць. І не дазволь, Божа, лёсу яшчэ раз зьвярнуць на крывавы шлях.

Дождж не сьціхае. Наперадзе — ноч. Са зьлепленых валасоў вада цячэ па патыліцы за каўнер, ахалоджваючы палаючае цела.

Мінулае жыцьцё, людзі, зь якімі разам усьміхаўся, сьлепа пакланяўся законам жорсткасьці, — засталіся толькі ў памяці. Пастаўлена нарэшце кропка бессэнсоўнасьці. Толькі зараз разумееш, кім ты быў на самой справе. Схаваўшыся ў кутку, ты чагосьці чакаў, замест таго, каб дзейнічаць. Твой розум паддаваўся ўплыву зьнішчальнага асяродзьдзя, ня маючы моцы прачнуцца ад летаргічнага сну.

І зьніклі ўсе, хто быў побач. Толькі адзін сьцяг застаўся саграваць неўміручую веру.

Калі ў цябе ўзьнікае патрэба ў чымсьці, ты імкнесься любой цаной заваяваць асабістую задаволенасьць, не азіраючыся навокал, на той сьвет, які цябе нарадзіў. Ты хаваеш свой твар у цень, баючыся сустрэць молячы погляд паміраючага, перапалохаць навакольле смуродным подыхам вачэй. Ты жывеш аўтаматычна, нават не задумваючыся над тым, што ты робіш. У тваёй паходцы ўжо прыжылася звычка нэрвова і пасьпешна перастаўляць доўгія ногі ўздоўж цёмных завулкаў. У высахлым і даўно счарсьцьвелым кавалку цябе — ужо не пазнаць сэрца.

З самага нараджэньня ты слухаў глухое біцьцё крыніцы твайго існаваньня. З самага пачатку табе далі шанец перамагчы сьмерць, але ты яго ня выкарыстаў. Ты сам сябе зьнішчыў — душа перастала дыхаць. А калі ўсё ж завітае ў тваю хату ўсьведамленьне — будзе позна ўваскрасаць.

РУСЛАН РАВЯКА

З УЗВЫШША...

На вуліцах гораду зьявіліся танкі.

Агромністая колькасьць чалавечай масы, апранутай у вайсковае, мітусілася на падыходах да плошчы, дзе дзясяткі тысячаў цывільных людзей ледзь-ледзь стрымліваліся міліцыянтамі.

Мы зь сябруком выйшлі з кавярні, што месьцілася пры плошчы. Я кінуў у бок натоўпу:

— Гадкоў пяць таму я быў бы там!

— Чаму ж цяпер ня йдзеш? — запытаў сябрук і хмура пасьміхнуўся.

— Час ня той, ды й я пастарэў, здароўе і нэрвы даражэй!

— Сапраўды.. Цікавей было жыць, калі былі маладзейшымі... Міліцыянты, гумовыя дубінкі, пажарныя вадалівы, сутычкі..., — сябра дастаў з кішэні пачак танных цыгарэт, пакруціў іх у руках і кінуў у замызганную сьметніцу.

— Я калі-нікалі разважаю, мо тады мы памыляліся? Цяперака ж разумееш, што ўсе тыя гульні — брудныя. Сёньня народ падымаецца на покліч адных, заўтра іншых... Відаць, нямашака на сьвеце праўдзівых лідэраў, што дбалі б пра гэты наўтоп.

Сябра глянуў мне ў вочы.

— А ты разуверыўся ў сваім народзе!

— Мо ты, хіба, яшчэ ў нешта верыш? То чаму ж зараз ты тутака? Ідзі, паспрабуй распавесьці ім праўду. Ведаеш жа шмат і лічыш сябе разумнейшым...

Мой сябра плюнуў сабе пад ногі.

— Сёньня, я ўжо не вар'ят. Лепш бачыць гэта ўсё аднекуль збоку.

Мы падняліся на старажытнае, гістарычнае ўзвышша... Са зброяй у руках войска рушыла роўнымі шыхтамі на плошчу. Натоўп зароў, у паветра ўзьняліся плякаты, вялізную колькасьць сьцягоў матляў над галовамі людзей вецер. Весела зайграў аркестар.

Я памахаў рукою з трыбуны, вітаючыся з натоўпам. Пачынаўся вайсковы парад у гонар нашай пермогі над тыранам.

Сябрук крыху павярнуў твар да мяне, ад тэлекамэраў, і прамовіў:

— Людзям заўсёды патрэбныя моцныя лідэры...

ЗЬМІТРО СІДАРОВІЧ

КВАТЭРЫ

Я за гэтую кватэру біўся тры месяцы. Шмат было жадальнікаў пасьля аб'яўкі ў газэце. Разумееце, здаецца кватэра амаль у цэнтры гораду, з тэлефонам, з прыймальнай аплатай — ясна, ня ты адзін будзеш такі хітры. Доўга даводзілася гаспадару даказваць, што я лепшы здымшчык з усіх астатніх, пакуль угаварыў.

А гаспадару было васямнаццаць гадоў. Маладзейшы за мяне. Бацёчкі ягоныя зусім нядаўна, год толькі, патрапілі ў аўтамабільную катастрофу — і насьмерць. Не пашанцавала людзям... Хлопец застаўся адзін, а цяпер вось захацеў зьехаць у Маскву паступаць у нейкую там вучэльню. Ну — і кватэру здаць, усё ж неблагі прыбытак. Ды й цяжка аднаму ў пустых сьценах.

Пэўна, асноўным довадам у нашай гутарцы зьявілася мая бутэлька гарэлкі, якую мы расьпілі пад час апошніх агледзінаў кватэры. Пераканаў.

Я мастак. Хоць не на ўсе рукі, але на пэндзаль набярэцца. Ці буду мастаком. Проста зьявіўся такі настрой — пажыць аднаму колькі часу, агледзецца, раскласьці эцюднік, сеё-тое намаляваць, нешта пачаць, нешта скончыць. І халера зь імі, грашыма, калі можна замкнуцца ад іншага сьвету і трохі засяродзіцца ў сабе і для сябе.

Такім чынам, я апынуўся ў гэтай кватэры і быў страшэнна рады. Яна была двухпакаёвая, хоць малога пакою для мяне й не йснавала: гаспадар звалок туды асноўныя рэчы й мэблю ды замкнуў. Ну, нічога, мне хапала астатняга — пакой, гаўбец, кухня й вітальня ў прыдачу!

У той вечар я расклаў свой эцюднік ды намяшаў фарбаў, але ўзяцца за нешта сур'ёзнае не давялося. Прапаў гумар, да таго ж сьцямнела, і я сеў на кухні за гарбату, тупа гледзячы праз вакно на мігценьне машынавых падфарнікаў ды аўтобусных салёнаў на вуліцы.

І тут я пачуў стук. Разумееце, не ад суседзяў, а менавіта з замкнёнага пакою. Неяк дзіўна — два разы стукне, тады цішыня, потым зноў два разы і гэтак далей.

Адчуваньне было такое, што стукае якраз насупраць таго месца, дзе сядзеў я, але з другога боку сьцяны. Касьцяшкамі пальцаў.

Я стукнуў у адказ. Паўза. Потым адтуль зноў у ранейшым рытме. Божа, думаю, каго там замкнулі?

Выбег у вітальню, туды дзьверы гэтага замкнёнага пакою выходзяць. Прыклаў вуха да дзьвярэй. Нейкі час было ціха, потым у самае вуха — стук! Разумееце — зноў насупраць мяне з таго боку! «Хто там?» — крычу. Маўчаньне. Потым зноў —стук-стук!

«Ну, ладна, хопіць дурэць!» — сказаў я, адняўшы вуха. Маўчаньне! Што за чорт, падумаў я і — лясь! — кулаком па гэтых дзьвярах. Яны задрыжэлі, але ж замку, вядома, нічога не зрабілася, вытрымаў. «Хто там сядзіць, адзавіся», — стомлена ўсклікнуў я, і пасьля таго адказам мне была цішыня. Стук не паўтарыўся.

(Працяг у наступным нумары)

ЮРЫ ЧАРНЯКЕВІЧ

МРОІ

Вось і пачалося... Але што, што? Пачатак восені? Пачатак канца? Я й сам ня ведаю. Ды й ніхто ня ведае. Але ўсё пачалося...

І я нібыта крочу кудысьці па гарадзкіх завулках, а яны сустракаюць мяне цішынёй і пустатой. Мае крокі далёка чуваць. Нікога, аднак, не сустракаю, але бачу ўдалечыні людзей. Падыходжу да іх, ды яны чамусьці сыходзяць, не зьвяртаючы на мяне аніякай увагі, быццам мяне ўвогуле няма. Магчыма, гэта робіцца ад таго, што я не гляджу ў вочы людзям? Больш не гляджу? Бо раней, калі я ішоў насустрач чалавеку, я хацеў злавіць ягоны позірк, зазірнуць, хаця б на імгненьне, у тую бездань, імя якой — душа людзкая. І тыя вочы: цікаўныя ці халодныя, вясёлыя ці бязьлітасныя — усе яны глядзелі на мяне і перадавалі свае пачуцьці, і адыходзілі. І я ведаў, што гэтыя незнаёмыя людзі таксама зазірнулі ў мяне, у маю душу і змаглі наталіць сябе тым, чаго ім не хапала. Яны адчувалі еднасьць са мною і ніколі не забудуць гэтага.

Ды цяпер я развучыўся глядзець у вочы, ці — ды што там! —проста на людзей, і яны праходзяць, абыякавыя, мітусьлівыя, занятыя толькі сабой, не зважаючы на мяне. А я адчуваю, што ў гэтыя хвіліны робіцца нешта такое дрэннае, за што потым прыйдзецца вельмі доўга расплочвацца, бо будзе позна зьмяніць што-небудзь. І цяпер я больш гляджу пад ногі, бо баюся зьнішчыць якога-небудзь небараку-мураша, які не пасьпеў схавацца ад такога вялікага і жудаснага Homo Sapiens. А яшчэ люблю глядзець у чыстае неба, якое здаецца такім блізкім! Але мяне хвалюе тое, што я павінен адначасова глядзець уніз і ўверх, што ўвогуле немагчыма. Але я мушу так існаваць. І існую. Пакуль што існую.

І раптоўна ўсе краявіды вакол мяне зьнікаюць і я апынаюся ў чорнай, але не беспаветранай і не маўклівай касьмічнай прасторы. Я адчуваю мілагучныя сьпевы зорак, і непадобныя на зямныя, гукі ўліваюцца ў маё цела, поўнячы яго сілай і лёгкасьцю. І вось я ўжо плыву-лячу сярод гэтага безьмежнага, чарнюткага і поўнага цудаў мора. Дыхаецца так вольна, як ніколі. Воля! Вось яна — воля! І я адчуваю сябе вольным ад турбот, ад думак, ад людзей і ад сябе самога. Пэўна, гэта і ёсьць шчасьце? Я — гэта ўсё. Я — вышэй за ўсіх, вышэй за Бога. Нічога няма: ні Дабра, ні Зла, ні Жыцьця, ні Сьмерці. Адзінота, поўная адзінота. Гэта галоўнае, што патрэбна. І толькі гэта. І больш анічога.

Але штосьці, ці, магчыма, хтосьці, кажа мне, што тое, што побач — ня вечнае, што яно пройдзе, як пройдзе ўсё ў гэтым сьвеце, як зьнікне ўсё ў забыцьці, і кліча мяне, заклінае вярнуцца туды, адкуль я прыйшоў. Але я не хачу назад і плачу, вельмі доўга і моцна плачу ад таго, што прыйдзецца ісьці туды, адкуль — з такой цяжкасьцю! — я прыляцеў на толькі што апранутых крылах. Але ж, нарэшце, усё ж такі іду, іду, хоць і не разумею, чаму, іду назад, каб ізноў прыйсьці ў пекла, каб чарговы раз нарадзіцца на сьвет. І дзеля таго, каб хутчэй усё зьнікла, расплюшчваю вочы...

З усьмешкай на вуснах і мокрымі ад сьлёз вачыма я доўга ляжу на ложку, як заўсёды шкадуючы, што ўсё скончылася, і гляджу на пусты і таму такі маўклівы шпрыц.

ІРЭНА ЯНЧАНКА

МЫ

Ноч. Зоры. Поўня. Калючы жвір коле босыя ногі. Я бягу наперад, ледзь кранаючыся зямлі. Але адчуваньне — нібы лячу. Я не адна. Бачу побач сьветлую постаць. Гэта Яна. Мая сяброўка, маё другое я.

Яна прыходзіць у сьне. Я гляджу ў Яе зялёныя вочы і разумею — мне пара...

І вось мы бяжым разам. Крок у крок. Я ня бачу зараз яе вачэй, але адчуваю яе думкі. Бо гэта — і мае думкі таксама.

Я ніколі тут не была, але ведаю гэтыя мясьціны. Ці мо' Яна ведае?

Лес. Галіны б'юць па твары, але я не павінна спыняцца, ці нават зьвяртаць на гэта ўвагу. Бо тады я адстану ад Яе. Я павінна пасьпець. Мы проста ня можам не пасьпець. Нас ніхто ня спыніць. Мы — разам. Мы вернемся да Нашае Пушчы, бо нас чакаюць. На нас спадзяюцца.

А пакуль што мы ўсё далей і далей адтуль. Засталося крыху.

Чаму тут нават трава рэжа ногі ў кроў? Бо гэта ня нашая трава?..

Вось яно. Я падыду да берага, зазірну ў чорную глыбіню. Пачакаю, пакуль прыцішыцца шалёны стук сэрца. Супакою думкі. Глыну гаркой вады — гэта сьлёзы нашых сяброў.

Нырну ў Возера. Вада апячэ. Нічога — мы ж будзем плыць разам. Але на той бераг выйду толькі я. Яна застанецца пад вадой.

Вось і ўсё. Я ўжо ведаю, куды павінна ісьці, што рабіць. Са зьдзіўленьнем углядаюся ў сваё новае адлюстраваньне. З вады глядзіць на мяне Белая Ваўчыца. Але — што гэта? Вочы... Яны засталіся блакітнымі.

Што цяпер?! Мае сёстры і браты даруюць мой колер поўсьці (так трэба: такою была Яна). Але хто зразумее мяне з такімі вачамі?!

Я прачынаюся. Сьвет падае мне ў твар. Я чую, не — адчуваю, як аддаляюцца яе нячутныя крокі... Я нешта зрабіла ня так. Але ёсьць яшчэ час. Яна будзе чакаць. І наступны раз я зраблю ўсё, як трэба. І Яна ўпэўненая ў гэтым, таксама як і я. Я дапамагу знайсьці Наш Край ды Яе спакой.

Сонечная Раніца. Цікавы сон! Падыходжу да люстэрка, прыводжу ў парадак валасы. Што гэта?! Мае вочы... Ці мне прымроілася гэтае зеленаватае адценьне?.. Што ж, наступная поўня ўсяго праз 4 тыдні.

Ноч. Зоры. Поўня. Мы — Я і Яна. Вочы ў вочы, сэрца ў сэрца... Усё будзе добра.

«Шэсьць песень пра восень»

Аўтарская песьня ў сёньняшняй Беларусі — бадай, самы беларускі з усіх музычных жанраў. Зрэшты, гаворка ўжо пра зьяву ня толькі й ня столькі музычную, колькі пра сацыяльна-сьветапоглядную і грамадзка-культурную. Народжаная ва ўтульных кухнях пад дахам таталітарнага грамадзтва, яна някепска пачувалася ў андэграўндзе, час ад часу выходзячы на шматлюдную плошчу. Несучы ў сабе ад нараджэньня адбітак звышіндывідуальнасьці й надзвычайнай асабовасьці, менавіта бардаўская сфэра традыцыйна складалася як апірышча дысыдэнцтва, вольнасьці ды духоўнага грамадзкага супраціву. У той жа час гэта цэлы мастацкі пласт, які ўсяляе не ў адно сэрца гонар і надзею.

Пра шэраг актуальнасьцяў з жыцьця аўтарскай песьні ў Беларусі мы гаварылі з Кастусём Елісеевым — чалавекам, які займаецца «бардаўскім» прадусарствам...

— Кастусь, найперш крыху пра тое, як і калі нашыя барды зрабілі крок з андэграўнду ў, гэтак мовячы, шырокія слухацкія масы.

— Падчас уздыму беларушчыны напачатку 90-х гадоў барды, зразумела, ня сталіся лішнімі. Тады яны гуртаваліся ў нейкія свае колы, і недзе ўвосені 91-га ў нас утварыўся невялічкі хаўрус людзей, якія пачалі распрацоўваць ідэалёгію. Але структура сталася нетрывалай. У 93-м годзе мы вярнуліся да сваёй праграмы ўжо ў паліграфічным рэчышчы, спрабуючы выпусьціць некалькі кніжак маладых паэтаў. Матэрыялаў і цяпер ляжыць шмат, дагэтуль мы тую праграму не раскруцілі. З канца 93-га пераключыліся на выпуск альбомаў, практычна з таго часу пачалося стварэньне на прафэсійных носьбітах даволі вялікай ужо фанатэкі. А ў 95-м мы «раскруцілі» сваю дзейнасьць —пачалі выступаць ужо не ад нейкай ілюзорнай студэнцкай суполкі, якая выпускае касэты, а правялі грунтоўны фэстываль «Менск-95». Гэта была проста спроба. Потым быў шэраг канцэртаў... Урэшце, у мінулым годзе зладзілі фэстываль «Менск-96», надаўшы яму статус нацыянальнага.

— Кастусь, згадзіся, што бардаўская песьня ў параўнаньні нават з рок-музыкай, ня кажучы пра замежную «папсу» — музыка больш камэрная. Для многіх патэнцыйных слухачоў, прыхільнікаў наш чалавек з гітарай пакуль застаецца, на жаль, невядомым. Паслухаўшы выпадкова, чалавек канстатуе: прыемны сюрпрыз... Якім чынам ты імкнесься часьцей радаваць суайчыньнікаў сюрпрызамі?

— Фэномэн у тым, што прызнае бардаўскую песьню большае кола людзей, чым прызнае рок. Але тое самае можна назіраць і з арганнай музыкай, сымфанічнай... Там таксама шмат хто яе прызнае, але мала хто цікавіцца ўшчыльную. Зрэшты, тут пытаньне стаіць пра раскрутку. Яна забясьпечваецца праз радыёперадачы, якія зьяўляюцца час ад часу на розных каналах радыё. Звычайна гэтыя перадачы прывязваюцца да розных падзеяў.

— Відаць, гэта ня лёгка ў час панаваньня мастацкага ды іншага афіцыёзу?

— Калі б было лёгка, перадача была б штотыднёвай, і яе б маглі чуць усе. Зь дзяржаўнымі каналамі атрымліваецца ня ўсё, прыватных, не кішэнных, ужо няма. На тэлевізіі, дарэчы, мы некалькі разоў паказвалі ўласныя здымкі. Паралельна з выпускам альбомаў ды канцэртамі ствараецца й відэархіў —зноў жа, на прафэсійных носьбітах. Цяпер заканчваецца праца над фільмам, зьнятым у 96-м годзе — «Шэсьць песень пра восень». Думаю, што ён выйдзе да фэстывалю 97-га году. Хутчэй за ўсё, будзем адкрываць фэстываль менавіта прэзэнтацыяй фільма.

— Чым жывуць цяпер нашыя барды? Зьвестак пра іх няшмат. Андрэй Мельнікаў гэтым летам дэбютаваў на сталічнай сцэне як рок-выканаўца, некалі з бардаўскай плыні ў рок прыйшла Кася Камоцкая...

— Гэтая тэндэнцыя назіраецца шмат з кім. Андрэй Мельнікаў для нас застанецца бардам. Хаця, на маю думку, ягоны патэнцыял і як рок-музыканта вельмі вялікі. З гуртам яны закранулі тую энэргетычную зону, якая ў Беларусі яшчэ нікім не распрацоўвалася. Калі да прыкладу прывесьці ўсходняга суседа, то ў іх гэтую зону займае гурт «Аліса». Хаця я сказаў бы — зь вялікім нэкрафілічным зьместам.

— У нашым выпадку містычнасьць Мельнікава ня чорная, а сьветлая!

— Так! Хаця ў музыцы ён ёсьць вельмі жорсткім чалавекам... Алесь Камоцкі стварыў гурт. Пачаў рабіць аранжыроўкі. Але ўсё гэта знаходзіцца, на ягоную думку, яшчэ ў нэгатыўным стане, каб выдаваць напрацоўкі на публіку. Сяржук Мінскевіч, аўтар, вядомы сваімі «жахамі», «чырвона-зялёнымі вэрблюдамі» і ўсім астатнім, стварыў панкаўскі гурт, працуе з прафэсійнымі аранжыроўшчыкамі. Пакуль усё ў іх знаходзіцца ў стадыі распрацовак, але стыль — свой. Гэта нешта падобнае да нэапанку, прычым з добрым выкананьнем. Зноў жа, як бард, ён таксама, як і Мельнікаў, ніяк ня страціць свайго твару ад таго, што будзе паралельна выконваць яшчэ і рок. Зрабіў касэту з аранжыроўкамі Валодзя Клімовіч. Яны, праўда, больш стратныя ў яго. І, адпаведна, не такія складаныя, як, напрыклад, у Сержука Мінскевіча ці Вальжыны Цярэшчанкі ўжо з квартэтам. Мяркуецца, што праца квартэту Цярэшчанкі будзе працягвацца да стварэньня поўнай праграмы, якую ўжо можна будзе паказваць на розных сцэнах. Зрэшты, гэта стопрацэнтова прафэсійны накірунак яе разьвіцьця як аўтара. Зьяўляюцца часам і новыя аўтары...

— Цяпер пра новых аўтараў. Відаць, шмат хто спрабуе нешта рабіць, сьпявае «ціха сам сабе» — ці не патрэбныя час ад часу фэсты дзеля шуканьня новых імёнаў?

— Ёсьць спадзяванкі, што кожную весну ў Магілёве будзе адбывацца фэстываль «Новы горад» менавіта як фэстываль новых імёнаў. А ўвогуле выканаўцаў накіроўваем на тое, што, калі яны працуюць у нас не як пачаткоўцы, то не павінны ўдзельнічаць у конкурсах. Таму што яны ўжо прайшлі гэты этап. Ад самавітых імёнаў звычайна чакаюць лепшага — у кожнага аўтара ёсьць дастаткова шмат старых песень, якія большасьць публікі ніколі ня чула са сцэны ўжывую. Яны ёсьць недзе на касэтах, недзе на хатня-кухонных фанаграмах... Лепшыя імёны так ці іначай становяцца заўважнымі, яны неяк самі выплываюць. Пачынаем супрацоўнічаць, прыглядаемся, што за чалавек — гэта вельмі важна. Шмат каго з бардаў цяжка ўключаць у сваю каманду з-за чыста псыхалягічных фактараў. Кагосьці давялося выключыць зь яе, бо працуем на рынку, і тут нічога ня зробіш...

— У такім разе каго з новых аўтараў сёньня ты мог бы вылучыць?

— Назаву, хто нас зацікавіў найбольш за апошні год. Гэта Руслан Баёк, які зьявіўся нечакана перад фэстывалем 96-га году. Дэбютаваўшы тады з гуртам «Інтэльмэдыя», чакаецца вялікая. Трэба раскручвацца, паказваць — тут, вядома, ужо іншыя складанасьці... Ёсьць у Гомелі Зьміцер Вінаградаў. На жаль, я сам зь ім не знаёмы, але я знаёмы зь ягонай творчасьцю і яны на фэстывалі адхапілі «біс». Такога мы ўвогуле ніколі не назіралі. Гэта чысьцейшы бард-рок. Думаецца, што будучыня ў іх лічу, што ў аўтара вялікі патэнцыял. У Гомелі цэлае сузор'е бардаў: Цярэшчанка, Бартосік, Мельнікаў — але і ў Вінаградава там ёсьць глеба для разьвіцьця і працы дзеля Беларусі. У той жа час пакуль цяжка кагосьці назваць зь Віцебску, напрыклад...

— Значыць, ёсьць рэгіёны «больш бардаўскія» і «менш»? Чаму так? Увогуле, наколькі цесныя дачыненьні вашая суполка падтрымлівае з рэгіёнамі?

— Ня мы падзялілі Беларусь на «больш-менш» бардаўскія рэгіёны. Мне цяжка адказаць, чаму так сталася і чыя ў тым віна. Самы моцны бардаўскі клюб заўсёды быў у Берасьці, гэта заўважалі яшчэ з савецкіх часоў. Студыя «Вежа», што існавала, зараз знаходзіцца ў стане сну. Напэўна, гэта можна растлумачыць тым, што яны прайшлі вельмі моцны ўздым у 95-м годзе, Вольга Сідарук у нас выступала летась, і мы марым, што да нас на канцэрты будзе прыяжджаць менавіта ўся «Вежа». Я думаю, што і ў гэтым годзе яны зьявяцца і, дасьць Бог, здолеем зрабіць невялічкі іхны канцэрцік.

— Як уплывае на творчасьць, дачыненьні, будучыню, філязофію аўтараў моцны падзел, які ёсьць у беларускай аўтарскай песьні (як і ў паэзіі і г.д.)?

— Адзначу, што большасьць нашых аўтараў цяпер маюць акрэсьленую грамадзкую пазыцыю. Цяжка ўзгадаць імя, незалежна ад мовы выкананьня, барда, які б падтрымліваў тое, што адбываецца ў краіне. Проста розныя людзі па-рознаму пра гэта гавораць. Адносіны паміж беларуска- і расейскамоўнымі бардамі ўсталяваліся ў 95-м годзе на магілёўскім фэстывалі «Новы горад», тады ўсе, здаецца, паразумеліся, пасябравалі. Хоць былі складанасьці заўсёды. Скажам, расейскамоўным было цяжка зразумець, чаму ім даецца адзін канцэрт падчас фэсту, а беларускамоўным — два. Або ўвогуле не адзін, а палова канцэрту — другая палова на леташнім фэстывалі была ўкраінская. Зь іншага боку, падзелу немагчыма пазьбегнуць, бо ў расейскамоўных бардаў адбываюцца свае зьлёты, куды беларускамоўных не запрашаюць. Нашая каманда заўсёды была больш талерантнай, хаця і цярпела больш нападак. Мы й цяпер працягваем самыя шчыльныя дачыненьні, прыкладам, з клюбам самадзейнай песьні «Эскіз», якім кіруе Сяржук Шпілеўскі. Мы пастаянна сустракаемся, проста зараз кожны адправіўся ў асобнае плаваньне.

— Ты згадаў напачатку пра хуткі чарговы фэст у Менску. Калі і хто прасьпявае нам новыя «Шэсьць песень пра восень»?

— На гэты раз мяркуецца правесьці фэстываль у лістападзе. Натуральна, імпрэза з агульнанацыянальным статусам павінна сабраць найлепшыя імёны. Адзін вечар фэстывалю мяркуем аддаць выступам гасьцей — бардаў з Украіны, зь якімі таксама падтрымліваем кантакты. Гэта будуць таксама слынныя аўтары. Пасьля — два канцэрты беларускіх выканаўцаў. Дарэчы, украінцы прапанавалі правесьці пазьней канцэрт нашых бардаў у Кіеве —таксама на адзін вечар.

— А што чуваць ад беларускай дыяспары?

— Спадзяемся наладзіць шчыльнейшыя дачыненьні зь Беласточчынай — Маруська Мятліцкая будзе ў нас прадстаўляць Гайнаўку. Ёсьць там гурт «Белы сон», ён выконвае бард-рок. У прынцыпе, узровень дазваляе паказваць яго і ў Менску. Ёсьць таксама адна дужа цікавая «наводка» на Вільню. Але пакуль што я, бадай, ня буду яе раскрываць...

— ... каб не сурочыць?

— Так, хоць, зь іншага боку, Вільня ўжо ня раз давала Беларусі бардаў. Шмат хто, той жа Зьміцер Бартосік, як аўтар, вырас менавіта будучы віленчуком. Час ідзе, усё зьмяняецца — думаю, зьявяцца новыя імёны.

Гутарыла Таццяна Сьнітко

Танец ценяў

Gods Tower. Canticles (experimental demo). — Homel: recorded at D.P. studio, 1994.

Гэты альбом стаўся лягічным працягам спрэчкі паміж Менскам ды Гомелем у вызначэньні ідэйнага цэнтру цяжкай музыкі Беларусі. Спрэчка гэтая цягнецца ўжо колькі гадоў. І калі Менск ставіць на маладыя каманды, як сёлета на «Вішэс Крусэйд», то Гомель абірае «цяжкую артылерыю», бясспрэчны лідэр якой — Gods Tower — галоўны прадстаўнік гомельскай генэрацыі heavy.

Музыка, якую грае Gods Tower, сапраўды адрозная — гэта так званы pahan folk doom. Альбом Canticles перадае атмасфэру панаваньня нязьведаных сілаў паганства, у музыцы пазнаюцца матывы далёкай мінуўшчыны. Гэта сапраўдныя сьвятарныя паганскія казаньні і малітвы, мэлядычны танец ценяў ды шмат чаго іншага.

Сяргей Сахараў

Цудоўная фартуна

Non solum nobis divites esse volumus, sed liberis, propinquis, amicis maximeque rei publicae.

(Ня толькі для сябе мы жадаем быць багатымі, але і для дзяцей, сваякоў, сяброў, і асабліва — для дзяржавы.)

Цыцэрон

Граф Міхал Валіцкі, падстольнік каронны, кавалер ордэнаў Сьв. Станіслава і Белага Арла, буйны мэцэнат, філянтроп, калекцыянт, гулец і авантурнік, вядомы знаўца старажытнага мастацтва, бібліяфіл, нумізмат, член варшаўскага Таварыства Сяброў Навук, уладальнік вялікага багацьця... Гэта ўсё ў 1800 годзе. А калі абярнуцца гадоў на 30 назад — перад намі хлопец зь Меншчыны зь сям'і беднага шляхціцца...

Як пісаў польскі пісьменьнік Анджэй Хамэрлінскі-Дзеражынскі, «постаць гэтага чалавека неардынарная не таму, што зрабіў кар'еру якіх мала, бо канец XVIII ст. — час незвычайных кар'ераў. І не таму, што падмурак свае фартуны пабудаваў гульнёй. Не, тут справа ў іншым. У тым, што, дасягнуўшы вышыняў сучаснага грамадзтва, ён не абрынуўся зь іх як, мноства іншых авантурнікаў. Што ў нейкі момант свайго жыцьця перастаў ім быць, а стаў адным зь першых прадстаўнікоў эўрапейскага вышэйшага сьвету, якога магнатэрыя Рэчы Паспалітае безь пярэчаньняў прыняла за свайго, не зважаючы на яго мінулае. Што велізарнае багацьце ўжываў таксама не банальна, шчодра даючы на навучальныя ўстановы, зь якіх выйшлі Міцкевіч і Славацкі, а сярод мастакоў, пісьменьнікаў, людзей ведаў карыстаўся славай сапраўды бескарысьлівага мецэната і шчодрага пратэктара. Што, нарэшце, няведама калі і як гэты чалавек, уся адукацыя якога — нейкая правінцыяльная школка, здолеў здабыць сапраўдную культуру розуму і запас розных непавярхоўных ведаў. Дарэчы, членам Таварыства Сяброў Навук ён стаў у выніку тайнага галасаваньня».

ПАЧАТАК

Крыніцы не пакінулі дакладных зьвестак пра месца ягонага нараджэньня. Вядома толькі, што Міхал Валіцкі зьявіўся на сьвет на Меншчыне ў 1746 г. Некаторыя аўтары, магчыма, перабольшваюць наконт галечы, у якой рос наш герой, каб узмацніць уражаньне ад далейшых дасягненьняў. Так ці інакш, а бацька ягоны Марцін быў усяго толькі варшаўскім стольнікам.

І.Трусаў у артыкуле пра Валіцкага ў Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі (Т.2. Менск, 1994. С. 208) мяркуе, што сапраўднае прозьвішча Валіцкага магло быць Міцкевіч. Што датычыцца прозьвішча Валіцкіх, то яно згадваецца ў Кароне ўжо ў 1248 г. А родапачынальнік дому Валіцкіх гербу «Лада» Аўгусьцін — таго дому, да якога далучаў сябе і Міхал Валіцкі, перасяліўся ў Вялікае Княства пры Вітаўце, каля 1400 г.[1]

Міхал атрымаў адукацыю ды ўтрымліваўся на даволі сьціплы кошт дзядзькі па маці Бучынскага. Вучыўся ён ці то ў Менску ў езуітаў, ці ў Магілёве, ці ў Вільні. Дасягнуўшы паўналецьця, хлапец пазбавіўся і бяз таго невялікае матэрыяльнае дапамогі.

Пра тое, што было далей існуюць розныя меркаваньні. Ведама толькі, што ў Менску Міхал некаторы час праходзіў вывучку ў адвакатуры, а мабыць і адразу атрымаў пасаду віцэ-рэгента ў судзе.

На гэтым мізэрныя зьвесткі абрываюцца гадоў на дзесяць.

ГЕНІЙ БІЛЬЯРДУ

Недзе ў пачатку 70-х мы бачым Валіцкага ў Кракаве, у якасьці прафэсійнага гульца і маркера пры більярдзе.

Калі картачны азарт узрушваў Карону і Літву ўжо не адно стагодзьдзе, то більярд зьявіўся як частка ангельскае моды, што з паловы XVIII ст. захапіла ўсю Эўропу.

Більярдны стол стаяў якраз у доме, дзе жыў Міхал. Штодзённыя практыкаваньні плюс выдатныя здольнасьці зрабілі сваю справу — адным ударам партыю пачынаў і заканчваў. Аб заклад ён заганяў у лузу самыя невераго дныя шары. Значна пазыней варшаўскі анэкдот будзе апавядаць, як малады Валіцкі, заўсёды галодны, гуляў з калегамі, каб у аднаго выйграць на абед, у другога на вячэру. Слава генія більярду грымела па ўсім горадзе.

CICCIDITT IN PUNCTO QVOD NON SPERATUR IN ANNO

(У адзін момант здараецца тое, на што не спадзяесься гадамі.)

І вось, нехта з маладых магнатаў, паназіраўшы за Валіцкім, вырашыў, што лепшага таварыша, каб скласьці кампанію ў падарожжы па Эўропе, яму не знайсьці. Хто гэта мог быць, і куды вялі далейшыя шляхі? Паводле адных зьвестак — хтосьці з Сапегаў вывез яго ў Вену. Там, ухапіўшы картачную фартуну, Валіцкі адчуў сябе дастаткова самастойным. Разьвітаўся з патронам і рушыў у Парыж зь нейкім князем Эстэргазі. Паводле графа Генрыха Жавускага, які ведаў Валіцкага асабіста, тым загадкавым магнатам быў Станіслаў Солтык, пляменьнік кракаўскага біскупа. Солтык увёў Валіцкага ў дом дзядзькі й апекуна. Біскуп у людзях разьбіраўся нядрэнна, таму здолеў убачыць у Міхалу ня толькі гульца, але чалавека годнага. Адпраўляючы пляменьніка за мяжу, толькі пахваліў ягоны выбар.

Ехаў Валіцкі не як слуга, а ў пэўным сэнсе як выхавальнік, як чалавек, здольны прыйсьці на дапамогу.

ЯК ВАЛІЦКІ ВЫРАТАВАЎ СОЛТЫКА

У Неапалі прастадушны Солтык пачаў флірт з адной дамай, і празь яе намаганьні трапіў у сеткі мясцовых шулераў. Калі Валіцкі даведаўся пра гэтае й пасьпяшаўся да свайго спадарожніка, перад яго вачыма паўстала наступная карціна: пан Станіслаў, абабраны літаральна да ніткі, знаходзіцца ў атачэньні махляроў. Убачыўшы маладога спадарожніка Солтыка, італьянцы платажэрна ўсьміхнуліся: «Мала аднаго дурня выпадак даў, дык яшчэ новага занесла!» Няшмат спатрэбілася часу, каб зьбіць зь іх пыху — вось вам літоўскі азарт! Ня толькі адыграў усё назад, але й загнаў іх у такія даўгі, якіх ніколі б ня выплацілі...

ЯГОНЫЯ ЎНІВЭРСЫТЭТЫ

Колькі разоў яны з Солтыкам траплялі ў розныя гісторыі, дзе і чым займаліся ўсе тыя гады — можна толькі здагадвацца. Але не дарма казалі, што Валіцкі быў чалавекам, які ўмеў «з карысьцю выкарыстоўваць дары фартуны». Дробны беларускі шляхціц паўстае чалавекам далёка не правінцыйным, і ў Парыжы ці Лёндане адчувае сябе таксама свабодна, як у Вільні ці Варшаве. Дзе, калі, і якія ўнівэрсытэты скончыў за гэты час? Бо бачылі яго ня толькі пры зялёных століках і ў шумных кампаніях салённых заўсёднікаў, а больш — сярод людзей навукі і мастацтва. Адзначалі глыбокія веды пана Міхала. Хутчэй за ўсё, не абышлося тут без уплыву выдатнага эрудыта свайго часу — Крыштапа Весялоўскага, гісторыка, нумізмата, знаўцы старажытнасьцяў і антыкварыяту, зь якім Валіцкі пазнаёміўся і пасябраваў у Парыжы.

ТРЫЮМФ У ПАРЫЖЫ

Парыж. Другая палова 70-х гадоў. Праз Солтыка Валіцкі трапляе ў першыя салёны, а пры пасярэдніцтве графіні Паліньяк, якая стала ягонай каханкай, і ў двор Людовіка XVI.

Як і ў Вільні ці Варшаве, агульнаю тут была ўсё тая ж неназэрная прага грамадзтва да азартных гульняў. Ня дзіўна, што Людовік XVI загад аб арышце нягодніка Бамаршэ напісаў на піковай сямёрцы. Гэтая акалічнасьць прыйшлася як нельга дарэчы для Міхала. Двор ня мог не заўважыць такту і шляхетнасьці Валіцкага. Пад час картачных баталіяў ён ніколі не даводзіў справу да эксцэсаў і не патрабаваў сатысфакцыі, нават калі бачыў шулерства з боку суперніка. Валіцкі нікому ніколі не адмаўляў у крэдыце ці форы. Ды што карты! Мог даць фору ўсяму двару. Аднойчы зьдзівіў Вэрсаль, зьявіўшыся ў раскошным строі, у якім кожны гузік быў аточаны дыямэнтамі і мсў выяву якога-небудзь мітычнага бога.

За картамі Валіцкі пазнаёміўся зь Людовікам XVI і Марыяй-Антуанэтай, якім аказваў розныя паслугі, з графам д'Артуа (пазыней Карл X), з герцагам Арлеанскім (бацькам будучага караля Луі-Філіпа), ды іншымі. Асабліва блізка сышоўся зь няшчаснае памяці герцагам Арлеанскім. Першы каралеўскі вяльможа не аднойчы станавіўся ахвярай Валіцкага, што падказала гэтаму прагнаму й ня вельмі пераборліваму ў сродках чалавеку заключыць хаўрус з панам Міхалам...

ЯГО ВЯЛІКАСЬЦЬ ФАРАОН

На зялёных століках Эўропы панаваў фараон. Захапленьне гэтай гульнёю прыняло характар эпідэміі, пік якой прыпаў на XVIII — пачатак XIX ст. Фараон ураўноўваў станы ня менш радыкальна, чым Вялікая Французская Рэвалюцыя і стаў адной з самых азартных гульняў за ўсю гісторыю эўрапейскае цывілізацыі.

Сядаць за фараона магла адначасова вялікая колькасьць асобаў. Банкір высыпаў свае дукаты на стол і тасаваў карты. Тыя, хто хацелі гуляць супраць яго, называліся панцёрамі. Кожны зь іх меў уласную калоду, зь якой даставалася карта і клалася перад сабой закрытаю, а на яе — стаўка... Людзі, што адкрывалі банк, як правіла, былі прафэсійнымі шулерамі...

Банкірам у хаўрусе даводзілася быць Валіцкаму, за што ён атрымліваў 1/4 ад прыбытку. Усё астатняе браў сабе герцаг.

Каб мець нейкае ўяўленьне пра Валіцкага-шулера, дастаткова ведаць пра тыя якасьці, безь якіх ня мог абысьціся ніводзін банкір. Па-першае, гульня вялася за кіляграмы золата і выкарыстоўвацца магла толькі нераскрытая калода. Дык вось, трэба было раскрыць, пазначыць, а потым беспамылкова, у долю сэкунды, распазнаць кожную з 52 картаў. Ну і, натуральна, зноў акуратна запячатаць калоду. Па-другое, трэба было мець выдатную памяць. Па-трэцяе, — ня менш выдатны зрок, каб тыя значкі адрозьніваць у неспрыяльных умовах дрыготкага сьвятла сьвечак ды клубоў тытунёвага дыму. Па-чацьвертае, —спрытнасьць рук. Па-пятае, — рэспэктабэльнасьць. Па-шостае, — дасьціпнасьць і інтэлігентнасьць. Па-сёмае, — маланкавую рэакцыю...

15 ПУНКТАЎ ФОРЫ ДЛЯ ЛОРДА СТЭНЛІ І 24 ДЛЯ САЛІНЬЯКА

Герцаг не памыліўся. Валіцкаму не было роўных. Вялізарная маёмасьць каралеўскага брата графа д'Артуа перацякала ў кішэні хаўрусьнікаў.

У той жа час на більярдных сталах Парыжа панавалі два дагэтуль непераўзыдзеныя майстры гэтае забавы — ангелец лорд Стэнлі ды італьянскі авантурнік Саліньяк. Валіцкаму спатрэбілася пяць гадзінаў, каб выйграць у лорда 300 тысячаў франкаў. Ня ведаўшы раней паразаў, ангелец спакусіўся на 15 пунктаў форы... Саліньяк паставіў пярсьцёнак з салітэрам супраць 100 тысячаў за адну партыю. Дыямэнт, можа, каштаваў і

шляхціца Валіцкага

Граф Міхал Валіцкі

больш, але Валіцкі шчодра ацаніў розьніцу ажно ў 24 пункты форы... Італьянца напаткаў той самы лёс.

«LE SAPHIR MERVEILLEUX»

Дарэчы, пра камяні. Паводле словаў графа Жавускага, пан Міхал быў іх вялікім аматарам, і хутка стаўся такім іх знаўцам, што мала хто зь ювэліраў мог зь ім параўнацца. Наогул, за золата, здабытае гульнёй, пан Міхал набываў прадметы антыкварыяту ды розныя каштоўнасьці. Між іншым, авалодаў легендарным, вядомым на ўвесь сьвет сапфірам, што набываў розныя колеры пры захадзе сонца, сьвятле дня, ці пры сьвечках. Сапфір нават натхніў пісьменьніцу і выхавацельку дзяцей герцага Арлеанскага мадам Стэфанію Фэлісітэ дэ Жанліс на стварэньне аповесьці пад назвай «Le saphir merveilleux» («Цудоўны сапфір»).

Былы шарачок з-пад Менску, які быў упэўнены, што добрыя чалавечыя адносіны даражэйшыя за любыя каштоўнасьці, выказваў шчодрасьць, вартую каралёў. Падараваў сапфір жонцы Солтыка.

ЗОЛАТА, АНТЫКВАРЫЯТ, КАШТОЎНАСЬЦІ... ГРАФСКІ ТЫТУЛ

Увесну 1783 г. Валіцкі з Солтыкам наведалі Лёндан. Побыт у Англіі пераміжаўся вылазкамі на кантынэнт. Картачным баталіям прыйшлі на зьмену іншыя заняткі, як, напрыклад, спэкуляцыя на розьніцах коштаў золата, каштоўных камянёў, твораў мастацтва. У адным з падарожжаў у нейкім са шматлікіх італьянскіх княстваў ці каралеўстваў Міхал Валіцкі купіў сабе графскі тытул, які Станіслаў-Аўгуст пазьней зацьвердзіў.

ВАЛІЦКІ — МІЦКЕВІЧ? МІЦКЕВІЧ — ВАЛІЦКІ?

Посьпех, як правіла, каштоўны ня толькі сам па сабе, але яшчэ і ў залежнасьці ад таго, колькі знаёмых, сяброў, ці суайчыньнікаў будуць аб ім ведаць. Нават сьціплы чалавек часам мае патрэбу ў «сьведках» посьпеху.

Вось і пан Міхал, а цяпер ўжо граф Валіцкі, зірнуў на мілыя сэрцу Літву і Карону.

Адначасова ў ягонай біяграфіі наступас чарговая паласа нявысьветленасьцяў. Анджэй Хамэрлінскі-Дзеражынскі тлумачыць яе наступным чынам:

«Летам 1788 г. прыбыў у Кракаў граф Валіцкі. Адначасова Англію пакінуў пан Міцкевіч.

Гэтая дваістасьць прозьвішча хутка выклікала тлум. Не абышлося без такіх, якія зараз крыкнулі, што Валіцкі — гэта не Валіцкі, а ўласна Міцкевіч, які абагаціўся ды далучыўся да прозьвішча і гербу сэнатарскага роду, цяжкім золатам аплочваючы за гэта сахачэўскаму кашталяну (з 1792 г. ваяводзе Равы — А.Ш.) Базылю Валіцкаму.

Толькі меркаваньню гэтаму пярэчаць усе, хто калі-небудзь сутыкаўся ці з графам Міхалам, ці зь ягоным пляменьнікам Леапольдам. Перш за ўсё Ян Сьнядэцкі ў лісьце да Букатага (амбасадара ў Англіі — А.Ш.) ад 14 сьнежня 1788 г. напіша, што Валіцкі, прыбыўшы ў Рэч Паспалітую, вярнуўся й да свайго прозьвішча, якое на некалькі гадоў з-за пэўных важных прычынаў вымушаны быў зьмяніць, выступаючы ў той час як Міцкевіч.

Потым Жавускі высьветліць гэтыя «важныя прычыны». Прозьвішча Міцкевіча Валіцкі абраў яшчэ ў Кракаве, не жадаючы пляміць уласнае тагачасным сваім статусам наёмнага гульца».

КАРОННАЕ ПАДСТОЛЬСТВА ЗА 4000 ДУКАТАЎ, ОРДЭНЫ СЬВ. СТАНІСЛАВА Й БЕЛАГА АРЛА — ЗА ДЫЯМЭНТАВЫЯ ГУЗІКІ

Незацьверджаны графскі тытул не даваў ніякіх перавагаў. Сябра манархаў і прынцаў крыві паводле статусу нічым не адрозьніваўся ад якога-небудзь шарачка. Ад усьведамленьня гэтага не зусім ёмка было знаходзіцца ў таварыстве Радзівілаў, ці, урэшце рэшт, менскіх землякоў Валадковічаў, бо шляхецкая роўнасьць у тыя часы засталася толькі ў пачварным «liberum veto». Успаміны пра легенды грэлі празьмернае самалюбства шарачкоў, якія станавіліся пад канфэдэратыўныя сьцягі, каб нагадаць каралю пра сваю роўнасьць зь ім...

Дапамог Солтык. Вельмі загружаны актыўнай дзейнасьцю ў Скарбовай камісіі ды пасольствамі на Соймы, ён прадаў Валіцкаму сваё кароннае падстольства за 4000 дукатаў (паводле Жавускага — за 200 тыс. польскіх злотых). Магнатэрыя прыняла Валіцкага так, нібыта ён і яго продкі заўсёды знаходзіліся ў яе шэрагах.

На глебе захапленьня старажытнасьцямі Валіцкі зблізіўся з такім жа калекцыянтам і аматарам навукаў — каралём Станіславам-Аўгустам. У знак сяброўства падараваў каралю гузікі з дыямэнтамі — тыя самыя, якімі ўразіў Вэрсаль. Панятоўскі аддзячыў, чым мог — зацьвердзіў графскі тытул, ды пажалаваў адзін за адным ордэны Сьв. Станіслава і Белага Арла.

ВАЛІЦКІ — КАСМАПАЛІТ І КАЛЕКЦЫЯНТ

Шматлікія аўтары адзначалі касмапалітызм і апалітычнасьць Валіцкага. Ніхто ніколі ня бачыў, напрыклад, каб ён трымаў у руках газэту. «Мой падстолі, — запытаўся аднаго разу Станіслаў-Аўгуст, — маеш столькі сяброў, чаму не дамагаесься пасольства на Сойм?» Валіцкі адказаў: «Дзеля таго, найясьнейшы пане, што маю шмат ласкавых да сябе сяброў, і ніводнага не хачу страціць».

Пакуль патрыёты рыхтавалі рэванш за паразу 1792 г., Міхал Валіцкі прыехаў туды, адкуль бегліўсе, каму хацелася яшчэ пажыць. Гэта ізноў быў Парыж, але ўжо ўвосені 1793 г. якабінцы давалі асьвечанай Эўропе прыклады татальнага тэрору. Разам з рамантыкай лёзунгаў Свабоды, Роўнасьці і Братэрства Вялікая Рэвалюцыя несла патокі крыві, голад і нягоды... Кошты на золата рэзка папаўзьлі дагары, затое прадметы раскошы, творы мастацтва, антыкварыят — упалі ў цане. Дык вось што аказалася мацней за страх сьмерці! Як жа мог наш апантаны калекцыянт страціць такі шанец — антыкварыят літаральна ляжаў пад нагамі. Між іншым, у старызьніка ён набыў бюро Марыі-Антуанэты... Лётаў па Парыжы, падбіраючы каштоўнасьці і мімаходзь аплакваючы пакараных якабінцамі сяброў-арыстакратаў.

РЭЧ ПАСПАЛІТАЯ. ВЫБУХ 1794 г.

Валіцкі вярнуўся й стаў сьведкам таго, як Бацькаўшчына спрабуе змыць ганьбу апошніх дзесяцігодзьдзяў. «Не з Канстытуцыі трэба было пачынаць, а з шыбеніц!» — скажа адзін з патрыётаў, малады генэрал-лейтэнант інжынэрыі войскаў Вялікага Княства Літоўскага Якуб Ясінскі. Вясной 1794 году гэтак меркаваў ужо ня толькі ён. Сапраўды, адступаць не было куды — ніколі яшчэ народы Рэчы Паспалітай не назіралі такіх відовішчаў у сябе дома. На шыбеніцах на варшаўскім рынку віселі ўчорашнія калегі пана Міхала па зялёных століках, асуджаныя за нацыянальную здраду — граф, кашталян сандэцкі Юзаф Анквіч, інфлянцкі біскуп Язэп Казімер Касакоўскі, гетман Юзаф Забэла. Вільня не адставала, там вяроўка знайшлася для біскупа Ігнація Якуба Масальскага.

У тыя дні Валіцкі паставіў подпіс пад Актам паўстаньня й ахвяраваў золата Касьцюшку.

ВАРШАВА. ВУЛІЦА ДОЎГАЯ, 542

Параза паўстаньня азначала канец незалежнасьці. Валіцкі, які жыў тады ў Варшаве, трапіў у прускую зону акупацыі. У доме №542 на вуліцы Доўгай ён сканцэнтраваў усе свае багацьці. Чаго тут толькі не было! Карцінная галерэя старых майстроў, бібліятэка рэдкіх кніг, збор залатых эмаляваных табакерак, незьлічоная колькасьць дарагіх шаляў, адзіны з самых вядомых у Эўропе збораў карункаў, кабінэт старажытнасьцяў, зборы камянёў і гемаў, вялікі збор нумізматыкі, каштоўных камянёў, і, нарэшце, збор дыямэнтаў, які зьдзіўляў пецярбурскі beau monde. Што ўжо казаць пра правінцыйных прусакоў! Фрыдрых Вільгельм III гадзінамі аглядаў скарбніцу пана Міхала, а потым папрасіў пазычыць шыкоўны парцэлянавы сэрвіз на 80 асобаў, каб яго магла скапіяваць бэрлінская фабрыка.

Варшава паступова ператварылася ў такі ж засьценак, як і Бэрлін...

НЯДОЎГІ ПОБЫТ У РАСЕІ

У 1804 г. Міхал Валіцкі вырашыў пашукаць асалоды ад вялікасьвецкага жыцьця ў сталіцы адной з найбуйнейшых імпэрыяў сьвету. Як і ў Парыжы, тут ён знайшоў поўнае паразуменьне зь мясцовай арыстакратыяй, зьдзіўляў усіх сваімі зборамі і манэрамі. Але ж празь некалькі месяцаў упершыню ў жыцьці недзе перабраў меру. З-за няўдалых, цёмных і рызыкоўных махінацыяў, зьвязаных з продажам каштоўнасьцяў, вымушаны быў у 1805 г. уцякаць з Расеі.

АЗЁРЫ

Перабраўся ў былое Вялікае Княства. Пасьля III падзелу неаднаразова наведваў Станіслава-Аўгуста ў Горадні, дзе яшчэ ў 1793 г. набыў так званы палац віцэ-адміністратара, ператварыўшы яго ў сапраўдны музэй. Там жа, у навакольлі, пасьля сьмерці Станіслава-Аўгуста ў 1798 г., набыў былую «сталовую» каралеўскую маёмасьць — маёнтак Азёры. Завёў у Азёрах узорную гаспадарку, заснаваў у 1809 г. папяровую фабрыку.

ВАЛІЦКІ — СЯБРА НАВУК

Пан Міхал настолькі сур'ёзна займаўся самаадукацыяй, што аўтарытэт ягоны як знаўцы старажытнасьцяў, бібліяфіла й нумізмата не выклікаў сумневу нават у варшаўскага Таварыства Сябраў Навук, і ў лістападзе 1800 г. Валіцкі быў прыняты ў ягоныя члены.

МЭЦЭНАТ, ФІЛЯНТРОП, ПАТРЫЁТ. КАНЕЦ ЖЫЦЬЦЯ

Знаходзячыся на вяршыні посьпеху, Валіцкі становіцца мэцэнатам. Ён пачынае рабіць шчодрыя ахвяраваньні на айчынную навуку. Безумоўна, пад час акупацыі справа ратаваньня нацыянальнае навукі й культуры павінна выходзіць на галоўнае месца, бо гэтыя галіны чалавечае дзейнасьці зьяўляюцца тымі апошнімі бастыёнамі, існаванье якіх сьведчыць пра тое, што нацыя яшчэ не загінула. Ёсьць ня менш дзейсны сродак выратаваньня Бацькаўшчыны, чым зброя, вулічны пратэст ці друкаванае слова — гэта грошы.

Напрыканцы жыцьця Валіцкі пасяліўся ў Вільні. Меў тут з даўніх часоў дом на Бакшце. А яшчэ ў 1804 г. упершыню зацікавіўся справамі Віленскага ўнівэрсытэту, стаўшы яго самым буйным фундатарам. Вось храналёгія ахвяраваньняў:

1804 г. — 1755 штук мінэралаў.

1805 г. — Збор ракавін, руды — 5 тыс. штук. Таксама на перавоз з Варшавы збору гісторыі натуральнай — 225 руб.

1806 г. — Волава чырвонае (храмат волава) зь Сібіры, хрызапраз вагою 60 фунтаў.

1809 г. — На адукацыю ўбогіх дзяцей — 12.000 злотых.

1818 г. — Вялікая шафа чырвонага дрэва, багата аздобленая бронзамі і мэдалямі (належала Станіславу-Аўгусту, які трымаў у ёй нумізматыку).

1823 г. — На ўтрыманьне васьмі ўбогіх вучняў — 1800 руб. на год і г.д.

Акрамя гэтага ён падараваў унівэрсытэту значную частку свайго збору каштоўных камянёў. Пад назвай «Калекцыя графа Валіцкага» яна была апісаная С.Юдзілам (пазьней нібыта захоўвалася ў Эрмітажы). Адкрывае фундацыю для здольных, але бедных хлопцаў з прозьвішчамі Валіцкія і Міцкевічы. Агульная сума ахвяраваньняў склала два мільёны злотых. Акрамя ўнівэрсытэту дапамагаў і другім установам, напрыклад, ліцэю Крамянецкага. А колькі вучоных, мастакоў, пісьменьнікаў карысталіся ягонай падтрымкай!

Мэцэнацтва перарасло ў філянтропію, — дом на Бокшце заўсёды быў адкрыты наогул для ўсіх, хто меў патрэбу ў дапамозе. Гаспадар адрозьніваўся рэдкай гасьціннасьцю, і кожны дзень даваў абед на некалькі дзясяткаў асобаў.

У апошнія гады хваробы і ўзрост пачалі браць сваё, — Валіцкі пакінуў сьвецкае таварыства, але й тады ўбогія студэнты маглі знайсьці ў яго прытулак. Пад канец ён трымаў дом за кошт продажу каштоўнасьцяў. Казалі, што каб так ішло й далей (а граф памёр пазьней на некалькі гадоў), то скончыў бы ў галечы.

Памёр ён у 1828 г. Пахаваны на Бэрнардынскіх могілках.

Як паведамлялася ў артыкуле пра Валіцкага ў «Энцыкляпэдыі паўшэхнай», выдадзенай у Варшаве ў 1867 г.: «Памяць дабрачыннасьці яго і дабрадзейнасьці да гэтага дня жывая ў Вільні».

Нашчадкі графа Валіцкага дапамаглі Бацькаўшчыне зброяй. За ўдзел у вызвольным паўстаньні 1863-64 г. расейцы канфіскавалі маёнтак Азёры. Прадпрыемствы прыйшлі ў заняпад...

Андрэй Шпунт

[1] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Фонд 319, вопіс 1, справа 23.

У мінулым нумары «НН» артыкул «600 рублёў золатам і 700 срэбрам. Сімяон Полацкі — выдатны дзяяч беларускай культуры?» памылкова быў падпісаны «Андрэй Шунт» замест правільнага «Андрэй Шпунт». Выбачаемся!

Сяржук Сокалаў

***

Ёсьць край такі
Дзе паўгоду дзень, а паўгоду ноч.
Удзень там ясь і вятры, а ўноч
сьнягі...
Ёсьць іншы край
Дзе паўгоду ясь, а паўгоду дождж,
Паўгоду ўсьмешак там, паўгоду тугі.
У краі вятроў-сьнягоў
Матуля завей.
Чалмой на чале вяршынь
Пануе зіма.
А край усьмешак-тугі... —
Там лес-дабрадзей,
Там плоймы лісьцёвых лавін,
там сьцюжы няма.
Краіна мая!
Між гэтых двух палюсоў
І дождж у цябе, і сьнег,
І пах верасоў,
І сьмех у цябе, і грэх,
І ясь валасоў,
І боль, і сабачы брэх
Чужых галасоў...
Вось кажуць, што ісьціна ёсьць
Заўжды ўпасярод...
Я маю народ,
горад,
І быдла,
і зброд,
Я маю усё, што ёсьць
у тым пасярод,
І, нават, —
наадварот:
І гора, і дрот.
Я маю паўсодняў дзень
Ды паўсодняў ноч,
Бывае, часамі, ясь
У змрочныя дні тугі...
Чаму ж ты, вандроўнік-госьць,
Праходзіць наўзбоч?
Чаму цябе, краю мой,
мінаюць Багі?
Жывы абярэмак сноў —
Паўдзённы разлог.
Прымройная здань-прывід —
Паўночны прастор.
У арктыцы белы мядзьведзь
Будуе мярлог,
У тропіках хіжы арол
Памкнуўся да зор.
А зорны сьнег у мяне
Зьмятаюць з двара:
Ні зоркі, ні сьнег не ў цане
Валё! ды Гура!
Ды шэлега здрадны звон
Гучней ад сьлязы,
Ў агмені душы здавён
Жывуць маразы.
Рассыпле восень пажар
Распаліць камін.
Зламаны жыцьця стажар
І шчасьце ў вабмін,
І як ні бяжы, ні кроч
Прасьвету няма...
Ёсьць край, дзе паўгоду ноч,
Паўгоду зіма.
І ёсьць, дзе паўгоду дождж,
Паўгоду туга...
А ў нас не туга — нудзьга
Над прорваю плошч,
А ў нас не нудзьга — бяда
Над бездань пушч,
А ў нас не бяда — брыда —
Падкоркавы тлушч...
Шукаю ўначы сьвятло
Знаходжу стыло.

Адам Глёбус

БАРСА

Кароткая аповесьць пра сяброўства

Паехалі са мной, я еду ў Барсу. Пакажу табе вялікі горад, які ведаю і люблю. Мы пачнем не з аэрапорту і вакзалу, пачнем з маленькага гарадка Січаза пад Барсаю, дзе адпачываў бацька геніяльнага дэтэктыва Патэра Браўна — Чэстэртон, дзе зьбіраліся маладыя сюррэалісты, дзе правёў мядовы месяц Сальвадор Далі з Галаю, дзе пілі апэрытывы Гарсія Лорка і Люіс Бунюэль. Карацей, нашы людзі ў нашым горадзе.

У Січазе ёсьць бар «Бункер», дзе два разы на тыдзень паказваюць стрыптыз для мужчын. Там распранаецца й танцуе на сцэне зусім не дзяўчына. Танчыць пад гучную музыку малады чалавек балетнай зьнешнасьці. Танчыць лёгка, без напругі і без ілжыва-эпатажнага выломваньня канечнасьцяў. Клясычнае кабарэ для мужчынаў, якія любяць юнакоў. На танцоры чорны кацялок і накладная барада з вусамі, белая кашуля і вузканосыя чаравікі. Ён лунае ў смарагдавым сьвятле й пазбаўляецца рэчаў. Ён танчыць, нарэшце, цалкам аголены з кійком у дагледжаных руках. Публікі ў «Бункеры» шмат. Большасьць — мужчыны гей, але ёсьць і дзяўчаты, і звычайныя парачкі натуралаў. Так што, калі ёсьць жаданьне пазнаёміцца з каталёнкаю, магу паспрыяць. Гадзіна каханьня за грошы каштуе толькі ўдвая даражэй, чым у нашым Менску, звычайны эўрапейскі кошт.

Няма настрою на эротыку? Завітаем на выставу лялек. Непадалёку ёсьць такі Музэй Рамантыкі. Там сабраная вялікая калекцыя лялек. Ты пабачыш сотні старых цацак. Відовішча на аматара. Лялькі ўсе мёртвыя, самым натуральным чынам. Яны на шмат гадоў перажылі сваіх маленькіх гаспадароў, але лялечныя душы ня вытрымалі растаньня й пакінулі анучныя й драўляныя цельцы. Яны адляцелі ў іншы сьвет за душамі сваіх уладальнікаў. Будзем спадзявацца, ім там добра разам. А ў Музэі Рамантыкі мёртвыя лялькі будуць пазіраць на цябе нежывымі вачыма праз вітрыннае шкло. Усе лялькі стаяць у шкляных, падобных да кубічных акварыюмаў скрынках. Лялькі-тапельцы. У Музэі Рамантыкі лепей доўга не затрымлівацца, а то ўначы бяздушныя цацкі прыйдуць у сон і будуць мучыць і мардаваць. Яны такія, гэтыя рэчы мёртвых людзей. Насупраць музэю якраз антыкварная крама. Антыкварныя шапікі я называю так: Крама, дзе прадаюцца рэчы мёртвага чалавека. Ня хочаш? Ня пойдзем. Паедзем у Барсу на электрычцы. Паедзем набываць мне партфэль.

У адпачынку я заўсёды зьбіраюся на працу. Яшчэ ў школе прывучыўся бегаць па кнігарнях і зьбіраць камплект падручнікаў. Я з тых, у каго ў кожнай клясе былі ўсе да адзінай патрэбныя кніжкі, і заўважу — новыя, нікім ніколі не чытаныя. Акрамя іх меліся й алоўкі, асадкі, сшыткі, купленыя загадзя й складзеныя ў пісьмовы стол. Баявы камплект вучня меўся напагатове далёка да першага верасьня. Падручнікі па гісторыі, геаграфіі й біялёгіі прачытваліся яшчэ ўлетку. Звычка прысьвячаць пэўны час у адпачынку падрыхтоўцы да працы жыве й зараз. І ў вольны час я выбіраю сабе дыплямат або партфэль, купляю касьцюм, пас, чаравікі, грабеньчык, штодзённік, кашулю, гальштук і ўсё, што трэба, каб выйсьці ў першы працоўны дзень новым, чыстым, сьвежым і год ня думаць пра амуніцыю. Напэўна зь мяне атрымаўся б някепскі вайсковец і добры шпіён, але я не шкадую, што не атрымаліся асобы ў пагонах. Я просты літаратурны пэдант з мастакоўска-паліцыянскім ухілам. Праўда, яшчэ з вучнёўства ўласна партфэля мне хапае на тры сэзоны.

Але цяпер якраз той год, калі трэба набываць новы. Мы паходзім па крамах, павыбіраем, папрыцэньваемся. У адным месцы можна зьнізіць кошт, у другім узяць чэк такс фры, што дасьць магчымасьць у аэрапорце вярнуць дзесяць працэнтаў ад кошту. Калі хочаш, можаш і ты выбраць сабе дыплямат. Чаго-чаго, а скуры ў Каталёніі хапае. Быкі, карыда, традыцыі... Карацей, мы выберам партфэль. Я яго нагледзеў яшчэ ў мінулыя гады, але час не прыйшоў, час набываць партфэль. Доўга-чаканы, скураны, з драўлянай ручкаю, са срэбнай зашпількаю, стыльны твор мастацтва з дызайнэрскай студыі Антоніа Міро — партфэль. Мы набудзем яго, і я радасна пакрочу па Барсе. А табе, каб не сумаваў, я прастаўлю каву ў бары «К'ю-К'ю». Мы зойдзем у мэтро і будзем разглядаць мужчын з партфэлямі. Мы пабачым іх дзясяткі, але мой будзе найлепшы, пакуль ня зьявіцца сівабароды мужчына ў акулярах хамэлеон. У яго такі самы, толькі ня новы партфэль ад Міро. Сівы спыніцца й паставіць свой-мой партфэльчык на сьметніцу. Каб запаліць цыгарэтку, ён паставіць цудоўную рэч на запляваную жалязяку, поўную адкідаў. Настрой лясьнецца. І ня трэба мяне суцяшаць. Сказаў, ня трэба. Ну і што, што яму хочацца курыць. Мог бы, дарэчы, патрфэль заціснуць між ног, калі не хацеў ставіць на зямлю. Я так заўсёды раблю. Электрычка. На Віланову. Наша. Вяртаемся ў Січаз.

У нас яшчэ паўдня. Пойдзем на пляж, да нудыстаў. Выдатнае месца. Пакінем партфэль у гатэлі, і на пляж.

Ідучы каля мора, я шукаю вачыма самотную жанчыну з аголеным торсам, зграбную, крыху старэйшую за нас. І знаходжу адзінокую прыгажуню, ці проста мілую й нябрыдкую, падыходжу і кладу на зямлю, побач зь яе ручніком свае шорты, пантофлі й акуляры. Яна запытальна пазірае на мяне, а я моўчкі сыходжу ў мора, каб доўга-доўга плаваць у вадкім сонечным шкле, заплыўшы як найдалей ад берага, ад шуму й мітусьні. Заінтрыгаваная, і ў пэўнай ступені абнадзееная жанчына, хай сабе й трыклятая зладзейка, будзе сачыць за рэчамі й чакаць працягу распачатага флірту. А другой сэрыі ня будзе. Выйду, пахіставаючыся ад стомы, забяру сваё й пашыбую далей. Люблю загараць, ідучы ўздоўж мора. Нават «дзякуй» не пакіну паўаголенай вартаўніцы. Такі я адпачыньнік. Галоўнае правіла ў пляжнай гульні: не пакідаць рэчы каля адной жанчыны два разы. Не ўкрадзе й ня сыдзе. Будзе сядзець як навязаная. Дзесяць разоў правяраў. Кажу, ня сыдзе. Хочаш са мной пасварыцца? Сварыся... Гэта ад сонца. Ператамленьне. Трэба тэрмінова схавацца ў кавярню.

Столікі ў каталёнскіх кавярнях зусім маленькія, каб людзі былі бліжэй адзін да аднаго... Мы — сябры, і ня будзем сварыцца з-за гарачыні. Сыпёка — жахлівая рэч. Сонца можа так напячы ў голаў, што ня толькі пасварыцца, а й пазабіваць адзін аднаго можна ні за што, ні пра што. Таму — у кавярню, за столік. Такі ён мініятурны, што пакладзі пачак цыгарэт і запальнічку, пастаў бутэльку мінэральнай вады з дзьюма шклянкамі, і месца застанецца толькі на нязмушаную размову зь сябрам. А што можа быць лепей для яснага розуму за спакойную сяброўскую гутарку? Нічога. Ну хіба што сон пасьля доўгага дня. А раніцай зноў у Барсу.

Горад Барса не расчароўвае ні на другі, ні на адзінаццаты раз. Яна заўсёды сустракае цёпла. Нехта скажа: «Цёпла, горача, да задухі...» Хай кроў, пот і сьлёзы застануцца таму нейкаму плявузгару. Мне ў сталіцы Каталёніі заўсёды камфортна: і ў сьпякоту, і ў навальніцу, і ў шары дзень. Сягоньня сонца. Мы пойдзем у вузкія лябірынты гатычнага кварталу. Там шмат што зьмянілася за апошнія гады. Вось тут стаялі мэталёвыя аскетычныя крэслы, каб сузіраць вунь той манумэнтальны малюнак Хуана Міро. І паўсюль, акрамя надпісу BASURAS (сьмецьце), чарнелі літары E.T.A., зробленыя баскімі тэрарыстамі. Яны ў гэтым нашым 1997 годзе паабяцалі забіць закладніка й зарэзалі, не пашкадавалі, бо ўлады Гішпаніі ня вызвалілі байцоў-патрыётаў з E.T.A. Надпісы зафарбавалі дэманстранты, іх выйшлі мільёны, каб пратэставаць супраць тэрору. Выйшлі й сышлі. Шмат што мяняецца ў Барсе, але цеплыня маіх узаемаадносінаў з райскім горадам застаецца. І калі я выяжджаю з Барсы, дык саджуся сьпінаю да накірунку цягніка, каб на пару хвілінаў болей паглядзець на каханы горад...

Так, адкінем сэнтымэнты і ў музэй. Той палац на гары — музэй каталёнскага мастацтва. Пачнем з готыкі. Не з раманскага стылю, як усе экскурсанты, а з готыкі. Гатычных твораў тут шмат, усе й не агледзіш уважліва. Таму ~~такія праланова~~: глядзець толькі крыважэрныя сюжэты. Готыка ў сутнасьці сваёй — стыль экстазны, канвульсіўны, істэрычны, жаночы... Забудзем колеры, матэрыялы, жанры... Пакінем сюжэты... Адсяканьне галавы доўгім мячом. Адрыванье жаночых цыцак вялікімі абцугамі. Засяканьне сонных каханкаў алебардаю. Забіваньне мужчыны з кнігаю нажом у сьпіну. Варэньне чалавека ў саганэ на нізкім агні. Расстрэльваньне з лукаў мужчыны, прывязанага да дрэва. Запорваньне дзідаю даўгахвостай жывёлы, падобнай да варана. Выкіданье зялёнатварага нябожчыка на зьядзеньне сабакам, ваўкам і арлам з груганамі. Здзіраньне з мужчыны скуры й мяса жалезнымі кручкамі. Спальваньне юнака. Спальваньне мужчыны разам з жанчынаю. Выколваньне правага вока дзяўчыне, і складаньне выпаратага вока ў місачку. Прабіваньне дзіцячага цельца дзідаю і ўздыманьне малога трупа над галавою. Паленьне кніжак. Забіваньне двурылай жывёліны дзідамі. Вырываньне вантробаў... А я што, не стаміўся? Готыка — гэта чырвоны трылер. Мы абавязаныя паглядзець яго да канца... вантробаў з жывата ў спакойнага чалавека. Укладаньне юнака на ложак зь цьвікамі. Адсяканьне мужчынскай галавы й ускладаньне яе на залатую талерку. Прымацоўваньне мужчыны да крыжа. Біцьцё жанчыны палкай па галаве. Біцьцё мужчыны палкаю па рэбрах. Закопваньне хлопца жыўцом у зямлю разам зь нябожчыкамі. Закідваньне дзяўчыны камянямі. Паласаваньне жаночага цела скуранымі бізунамі. Таптаньне нагамі мужчынскага цела, распасьцёртага на



Здымкі Алены Адамчых

падлозе ў шашачкі. Запоранье нажом у горла рэдказубай жывёліны. Забіванье цывікоў у мужчынскія далоні... Зараз пойдзем піць каву з канапкамі... Пераразанье тонкай дзявочай шыі брудным нажом. Падаванье на сьвяточны стол спода з барадатай галавою. Выліванье на жаночае цемя кіпячай смалы. Сячэнье аголенай кабеты пукам дубцоў. Утоптванье востракрылай істоты ў вогнішча. Біцьцё зьвязанага юнака палкамі ў патыліцу. Лупленье нажамі скуры з паўжывога барадача. Шпурляньне кніжак на зямлю. Спальваньне аголенага дзеда пасярод вясёлага натоўпу. Выдзіраньне жанчынаю ўласнага языка вострым кручком. Укрыжаваньне трох мужчын. Забіванье зялёнай зьмяі мячамі. Пераразанье нажом худога хлапечага горла. Таптанье па дзіцячых галовах... З готыкаю разьлічыліся. Цяпер у залі з раманскім стылем. Ну добра: кава, канапкі, вада і прыбіральня, цыгарэта. Ты заўважыў? Мы гуляем па Барсе, а сустрэчныя ўсё просяць і просяць пачаставаць іх цыгарэткаю. Юнакі. Анучныя жанчыны. Жабракі-інваліды. Карлікі. Мы шмат кумаць паўзу паміж стравамі. Пачнем. Замовім маленькую бутэльку чырвонага віна і мінэральнай вады. Зробім па чырвоным глытку для апэтыту й сходзім па курыны булён з альфабэтнай вэрмішэляю. Траціна кубка гарачага булёну проста неабходная для страўніка. Булён з чорным-нэгра хлебам-панам. Яшчэ па рубінавым глытку. Саляты. Іх шмат. Раю: авакада зь вяндлінаю, пару-тройку пяшчотна-маркоўных крыветак і кальмары пад белай поліўкаю. А цяпер перапынак. Размова. Пра што жадаеш пагаварыць?

Ты заўважыў: каталёнскі сьцяг пашыты з палосаў апэльсынавага й таматнага соку? Апэтытны сьцяг у каталёнцаў. За яго можна выпіць і пайсьці па рыбу. Пакладзем сабе па чырвоным кавалку смажанай. А замест гарніру возьмем паэлію — рыс з кавалачкамі сьвіных скабак, вялікая крыветка, пара ракавак-мідыяў. На рыбу варта выціснуць скрылік цытрыны. З чырвоным віном рыба ня вельмі, яе лепей зь белым-бланка, але замаўляць ня будзем. Абыдземся акваю. Яшчэ мяса... Забудзем бойні. Забудзем талеркі з мужчынскімі галовамі й



рым. Добра што ў музэях не дазваляецца курыць. А то скурыліся б ушчэнт. У часы раманскага стылю эўрапейцы не палілі тытунь. Яны пасьвілі статкі, будавалі саборы й расьпісвалі столі. Хопіць пра крыважэрнасьць. Будзем сузіраць станоўчыя сюжэты. Супакоімся. Засяродзімся...

Мужчыны з кнігамі ідуць у бібліятэку. Юнакі танчаць каля мора. Мужчына з жанчынаю ў летнім садзе каштуюць яблык. Малады алень бяжыць праз вяновы лес. Удумлівы стары запісвае развагі ў вялікі нататнік. Хлопец зь дзяўчынаю ўзважваюць каштоўныя рэчы на шалях... Чорт. Што чорт? Чорт кіпцем націскае на адну з шалевых талерак. А я й не заўважыў. Готыка пачынаецца. Аголеныя людзі купаюцца ў марскіх хвалях. Юнакі катаюцца ў чаўне па моры. Ты бачыш? Хрыстос на крыжы. І? Хрыстос, апрануты ў чырвонасіні халат, вісіць на крыжы. А ў кішэні халата сотавы тэлефон, каб не перарывалася сувязь з Богам-бацькам. А мне да густу Хрыстос у сьцёганым халаце. Пачалося. Готыка пачалася. Расьпілоўваньне чалавека напалам двуручнай пілою, пачынаючы з галавы. У германа-раманскага фашызму грунтоўныя традыцыі. Забіваньне цывікоў чорнымі малаткамі ў галаву маладога чалавека. Пайшлі адсюль. Не, мы прапусьцілі першыя залі з раманскімі творамі. Нельга пакідаць музэй з кепскімі эмоцыямі. Спакойная маці трымае на каленях ціхамірнае дзіця. Разважлівы мужчына чытае фаліянт. Рука Бога зьяўляецца ў сонечным колцы й выратоўвае пакрыўджанага й прыніжанага з разьбітай галавою. Крылатыя істоты сьпяваюць над вогненным колам. Сівабароды мудрэц з кнігаю адпачывае на мяккай падушцы. Юнак дорыць старому качку. Жанчына вучыць хлопчыка чытаць. Два мужчыны скачуць на конях праз горад. Гэта пра нас. Так што па конях і ў Січаз, у рэстарацыю «Мірадор». Мы заслужылі добрую вячэру зь віном.

Пад час вячэры галоўнае — не сьпяшацца. А каб не сьпяшацца трэба добра апрануцца. Добрыя рэчы стрымліваюць ад кепскіх учынкаў. Парфума «Эгаіст» пасьля галеньня. Апранаемся па-сьвяточнаму: яркая кашуля, сьветлыя нагавіцы. Чыстыя чаравікі. Зачыняем сэйф з грашыма. Спускаемся на ліфце ў «Мірадор». Шведзкі стол добры тым, што бачыш кожную страву да таго як выбераш, а кепскі тым, што можна пераесьці. Не стрымацца й пакласьці тры кавалкі замест аднаго, ці ня вытрыжаночымі вачыма. Пакаштуем смажаную бараніну. Будзем спадзявацца, яна не з таго барана, якога Абэль дарыў Богу. Бараніну ўпрыгожым колцамі цыбулі, скрылікамі гуркоў і пацерамі масьлінаў. Дапіваем чырвонае. Што можа быць смачнейшае за гарачую бараніну з келіхам чырвонага. Бог меў рацыю, калі ўзяў Абэлева барана і ня ўзяў Каінава хлеба. Памолімся, усхвалім творцу, перапраўляючы пацеры масьлінаў у рот. Цяпер дэсэрт. Лёгкі. Скрыль кавуна і марынаваную ігрушку шакаляднага адценьня. Усё. Кажам «ад'ю» і сыходзім.

Будзем піць каву ў бары «Манро» і разглядаць трансвэстытаў. Яны, высокія мужчыны, пераапранутыя ў вульгарных дзявуль, прыстаюць да мінакоў і запрашаюць у рэстарацыі. Яны задзіраюць спадніцы, каб выклікаць сьмех. А нам толькі тое й трэба: кава й відовішча. Што нас сягоньня цікавіць? Эротыка й мастацтва. Мастацкая эротыка й эратычнае мастацтва. За іх можна выпіць віскі. У мяне ёсьць бутэлька «Джэка Дэніэлса». Сядзем у пляцёных крэслах на гаўбцы й выпʼем віскі за сэкерэналюцыю. Рэвалюцыя працягваецца. Хай спыніцца навуковы прагрэс, хай перарвецца тысячагадовы тэалягічны дыспут, хай скончыцца пошук новага стылю ў мастацтве, галоўнае — працяг эратычных гульняў. Жыцьцё — бясконцы пройгрышная сэксуальная лятарэя. Пʼем. Наліваем і выпіваем. Віскі — вадкае золата. Яшчэ і яшчэ. Ты сам вінаваты. Каб сябраваць, трэба мець талент. Ні ў цябе, ні ў мяне яго нямашака. Бог ня даў, як ня даў яго Каіну й Абэлю. Уяві... Рай. Зямля. На ўсёй зямлі чатыры асобы: Адам зь Евай і Каін з Абэлем. І ніводны ня ведае пра сяброўства. Ну, хто зь іх можа сябраваць? Маці з сынамі? Брат з братам? Муж з жонкай? Ці чалавек з Богам? Яны ня ведаюць пакутаў і радасьцяў сяброўства. У іх драма нумар два — брат брата забіў, а драма нумар адзін — выгнаньне з Райскай радзімы. А ў наш з табой час найгоршая драма — эміграцыя, яшчэ жахлівейшая, чым калі сябра забівае сябра. І ня трэба скептычна пускаць сьліну па барадзе. Ты — маленькі чалавечак, нікчэмнасьць, два нулі, пустое месца. Ты ўвесь час мне зайздросьціш. І падманваю. І правільна раблю, што падманваю... Гандаль — мастацтва падману. А ты таксама падманваеш і хітруеш, абяцаеш і не выконваеш. Ты што, наняў мяне? Нічога я табе не павінен. Ніхто нікому нічога не павінен. Бог нам нічога не павінен, дык ці павінны мы Богу? А ты памаўчы. Яшчэ адно слова... Адпусьці, ідыёт... Бачыш, кроў? Нос мне зламаў. Трэба ручнік намачыць, халоднае прыкласьці. Зараз спыніцца. Чакай, здаецца косткі цэлыя. Ды не заплыве тваё вока. Ну, будзе невялікі сіняк. Мужчына зь сіняком толькі прыгажэйшы. Дапіваем і кладземся спаць. Заўтра рана ўстаем.

Падымайся. Пад'ём. Нельга прапусьціць раніцу. Мой першы настаўнік маляваньня казаў: не прапусьціце вясну, найлепшае сонца — вясновае. А я кажу: не прапусьці ўсход сонца над морам. Заходзім у шклянную гушчыню вады, заплываем як далей і сустракаем сонца. Мора, неба і сонца. Маладое, пяшчотнае, сьвежае сонца. Пабачыш яго, і як народзісься наноў. І можна зноў у Барсу. Сягоньня дзень эротыкі ў Барсе.

Гуляеш, ходзіш па Барсе, і нечага не стае, не хапае, не напоўніцу жывецца. Трэба мяняць маршрут, а ён не мяняецца, і ты зноў на бульвары Рамбла. Паўторы, паўторы... Барса, Січаз, Рамбла, пляц Каталёніі, пляц Гішпаніі, Пікаса, Гаудзі, Міро... Усё як у жыцьці. Гэта ў клясычным кіно сцэны не павінны паўтарацца два разы за адзін фільм. Адзін раз забойства. Адзін раз каханьне. Адзін раз віскібар. Толькі ўсе гэтыя сцэны паўтараюцца ў наступным фільме, як у жыцьці, як у нас. Была Барса, ёсьць Барса й будзе Барса, ёсьць пляж і быў пляж, быў сэкс і сэкс будзе. Калі б не было паўтораў, адкуль бы ўзяўся такі ўстойлівы мэтафізычны погляд на рэчаіснасьць? А ўсё цячэ, мяняецца і застаецца нязьменнае ў бясконцым пераўтварэньні. Два разы ня выйдзеш на той самы бульвар Рамбла. Захацеў зьмяніць маршрут, а выйшаў на сто разоў бачаны бульвар, і да цябе падыходзяць дзьве дзяўчыны ў чырвоных камбінэзонах. Яны сёстры, абедзьве кірпатыя і ў рабаціньні. Твары абсыпаныя залатой лускою. Дзяўчыны запрашаюць у музэй эротыкі. Ён зусім побач, два крокі. І, галоўнае, пусты. Ціха, спакойна. Немцаў зь японцамі няма. Экспанаты, экспанаты...

Пасьля эратычнай лірыкі апусьцімся ў вяковае порна. На дэманстрацыйным маніторы дзьве звычайныя голыя кабеты ў чырвоных ботах забаўляюцца зь цёмным ворганам чорнага каня. Дзяўчыны мілуюцца з канём. Пастараль у стылі ракако, каб ня мухі. Хмары мух віюцца над конскім хвастом, над дзявочымі клубамі й тварамі. Мухі пераводзяць ракако ў клясыцызм — жорсткі, натуралістычны, праўдзівы. Мы ня будзем купляць праўду з мухамі на відэакасэце. Мы пойдзем у квартал з натуральнымі жанчынамі, што зарабляюць грошы палавым ворганам. Папярэджваю, кварталы змрочныя, з агрэсіўнымі тубыльцамі. Вось бачыш, гэты шкілет, абцягнуты белай-пэргамэнтнай скураю, што сядзіць за сьметніцай, належыць наркаманцы. Яна ўжо не надаецца ў прастытуткі. Яна сама сябе закалола тоненькімі іголкамі аднаразовых шпрыцоў. Там каля бара, з пачкам цыгарэт у руцэ сумуе гандляр марыхуанаю. А вось і аб'екты маёй увагі. Тоўстая мурынка з чырвонымі вуснамі мне падабаецца. Такая тоўстая-тоўстая мурынка з ружовымі, як мяса кальмара, далонямі. Яна не запросіць шмат, яна ўжо рыхтуецца сыйсьці са сцэны. Яна не падпірае плячом сьцяну, а сядзіць на крэсьле, шырока разьвёўшы кумпякі. Яна падобная да кабыліцы. Я пакідаю цябе, мой дарагі сябра, на самай змрочнай і разбэшчанай вуліцы Барсы. У мяне іншыя пляны. Запал экскурсавода скончыўся. Гадзіну я накатаюся на чорнай жанчыне. Заглыблюся, наколькі можна, у кальмарава-ружовыя нетры. Пральюся дажджом. Супакоюся і вярнуся ў Менск.

Ведай, у мяне ёсьць мара... Зьдзейсьніць сэкс-рэвалюцыю на Радзіме. А потым адкрыць музэй. Маленькі музэй эротыкі й садызму. А як жа, — і парнаграфіі. Не адкрыю? Я не рэвалюцыянэр? А ты? Ты расчароўваеш мяне. Чорт зь ёй, з мурынкаю. Давай зойдзем у гэты ціхі двор-калодзеж, станем пад ветразямі памытых прасьцінаў і пагаворым. Мы — сябры, мы можам пастаяць тут, паміж сьметніцаю і паламанай старой мэбляю. Вось выдатная шафа. Я рады, што табе падабаецца. Ты разумны. Ты ведаеш: рэвалюцыя патрабус ахвяраў. Рэвалюцыянэр-практык больш за ўсё на сьвеце ненавідзіць цынікаў, прагматыкаў і тэарэтыкаў. Доказы? Ты, мой дарагі сябра. Нават ня ты, а твой труп. Нож лёгка зайшоў у грудзі й спыніў сэрца. Ты чуеш мяне? Чуеш? Выдатны доказ. Старая шафа будзе табе труною. Табе будзе ўтульна й вусьцішна ў гатычным кварталe. Пашанцавала, ты назаўсёды застанесься ў Барсе. Сьпі спакойна, дарагі сябра.

Барсэлёна. Жнівень 1997 года

Леанід Галубовіч

БЕЛАРУСКАЕ ПАХМЕЛЬЛЕ

ахвярую сябру па рыфме

Чарачку адну,
Каб забыці родную
Сваю старану,
Не глядзеці, як брат родны
Душу прадае,
Пазабыўшы шлях свабодны
І песьні свае.

Казімір Сваяк

Вось і выпіта да дна
Ўся мана.
Шлях-дарожанька п'яна
Ад віна...
І Айчына ад відна —
Не відна,
Бо пакуль яшчэ яна —
Старана...
Каму — крэсы, каму — кут,
Каму — край...
І пакуль яшчэ мы тут —
Налівай!..
Працьвярэзіься, і — глядзь! —
Ні кала...
І разьдзеты сам, як б...,
Дагала...
І ў суседа — ні віна,
Ні віны...
І ня ўцяміш з бадуна
Стараны...
Пахісьнесься ад сьцяны
Да сьцяны...
За сьпіною — шатуны
Сатаны...
Ты бы й чарачку адну
За памін,
За радную старану —
Родны ж сын...
Толькі б сілы яшчэ мець,
Каб падняць
Тую чарачку за сьмерць
Тваю, Маць...

Віктар Шніп

***

У жоўта-шэрай кругаверці,
Калі лісьцё шукае сьмерці,
Люблю каля кастра сядзець.
І думаць пра цябе і верыць,
Што будзеш зноў у вечар шэры
На неба дымнае глядзець,
Чакаць мяне — калі прыеду
З далёкага, як лета, сьвету,
Дзе я жыву, як воўк, чужым.
Але я ў вечнай кругаверці
Каля кастра, як храма сьмерці,
Зьнікаю ў цемры, нібы дым.
Восеньскі настрой
... а на асфальце не расьце трава,
Як лысіна, блішчыць цэнтральны пляц.
У чорнай міні маладая б...
На божы сьвет глядзіць, нібы сава.
У краму сонна дыбае габрэй,
Яму абрыдлі куры на абед.
Ён мае золата і пісталет,
Ён марыць зь Менску зьехаць чым далей.
На гэта ўсё гляджу, нібы салдат,
Якому на ўсё гэта наплявать.
Я падчаплю кайфовенькую б...,
Зь ёй буду піць і есьці шакаляд!

***

Тых дзіўных дзён, як не было,
Калі мы верылі ў сьвятло,
І раніцу, нібы віно,
Пілі, анёлячы ізноў
Сваю бяскрылую любоў
Да гэтых дзён, да гэтых ніў,
Дзе кожны — больш сябе любіў...
Тых сьветлых дзён, як не было.
Яны, як з вогнішча цяпло,
Вятрамі зьнесены ў зіму,
Дзе сьмерць нам дзьме ў сваю сурму...
І сёньня, гледзячы ў бязьмеж,
Ты па-над горадам плывеш
Туды, дзе нашых дзён сьвятло,
Дзе нас ніколі не было.

***

Яны прыйшлі і ноч прыйшла-ліхая
І павылазілі з кустоў сычы.
І дагарэла сьвечка залатая,
І сьмецьце засьвяцілася ў начы.
Заціхлі птушкі, нібы анямелі,
А з дрэваў лісьце ўпала на зямлю,
Каб восень мы з табой не сустракалі...
Я восень, як шампанскае люблю.
Яны прыйшлі і неба паніжэла,
і рэкі завірылі глыбіню.
Я ў ноч ішоў і ўсьлед за мной ляцела
Мая душа, як мошка да агню.

Антон Бакіноўскі

Варшаўскі дзёньнік

Адных суседзяў ведаеш добра, ледзь не штодня гаворыш зь імі, можаш у любы час пазычыць хлеб, соль, цыбуліну. З другімі адно вітаесься, на добразычлівае запрашэньне зайсьці на кубачак кавы даеш хуткую згоду і ніяк не знаходзіш часу спраўдзіць абяцанае. Падобнае атрымліваецца з краінамі й гарадамі. Дзе толькі ні быў, куды ні езьдзіў, а суседнюю Варшаву наведаць ніяк не выпадала. І запрашэньні меліся, і літаратурныя справы прапаноўваліся, а вось не складалася і ўсё. Нарэшце, выбраўся...

Пабыў, пабачыў брудныя, закурэлыя, зашмальцаваныя рукі варшаўскіх цыганоў з недаедзенымі кавалкамі сальных канапак. Паглядзеў я на прадстаўнікоў прыдарожнай вакзальнай нацыі польскага ўзору якраз у тыя дні, калі каталіцкая царква далучыла да сваіх сьвятых гішпанскага цыгана, які пад час анархісцкага бунту абараняў ксяндза і загінуў. Мае віншаваньні цыганскаму спадарству. Толькі па-шчырасьці, апыніся я ў рэвалюцыйнай Гішпаніі напрыканцы 30-х, быў бы ў шэрагах анархістаў, а не на баку яго дыктатарства Франка. Дакладна. А чаму прадстаўніку самае анархічнае нацыі захацелася ўступіцца за сьвятара-іншародца? Не зусім ясна. Цёмная гэта справа —гісторыя рэвалюцыі, цёмная, як цыганская скура.

Каб я меў такую скуру, думаў бы інакш. А так я — чалавек белы. І вельмі люблю мыцца. Асабліва мне падабаецца стаяць пад гатэльным душам пасьля дарогі. Стаіш сабе пад струмянямі, думаеш пра розныя паэтычныя дробязі. Пра хуткаплыннае. Пра сьвечку, якую толькі толькі загасілі. Ад кнота ўздымаецца ўгару й віецца тонкі струменьчык дыму. Лёгкі, бязважкі ён бязгучна расплываецца ў паветры, пакідаючы па сабе цёплы водар воску. Выгляд дымнага струменьчыка міжволі нагадвае пра хуткі й немінучы скон існага, пра зьнікненьне ўсіх формаў, пра марнасьць памкненьняў і намаганьняў. Ці іншы матыў... На беразе плыткай празрыстай рэчкі, стоячы на стромкім адхоне, бачыш, як ціха сыплецца пясок з-пад дзёрна. Бераг асыпаецца й асыпаецца незваротна. Хочаш-няхочаш, а засумуеш, засумняваесься ў патрэбнасьці ўсялякага імпэту...

Але знойдуцца сілы зьмяніць гарачую ваду на цёплую, халодную, ледзяную... Бадзёрасьць, цьвярозасьць, радасьць вернуцца. Варшава з дваццаць чацьвертага паверху цудоўна выглядае.

У бадзёрым настроі добра прайсьціся па чужым горадзе ў пошуках рэстарацыі, каб грунтоўна сесьці й замовіць абед з малавядомых мясных страваў. Гаспадар рэстарацыі мусіць быць тоўстым, інакш гэта не сапраўдны рэстаратар, які трымае ўстанову для ўласнага задавальненьня.

Чарнявага, як італьянец, тоўстага, з трайным сінім падбародзьдзем рэстаратара мы знайшлі каля Старога Места. Ён сыта пазяхаў, стоячы ў дзьвярах чырвона-белага інтэр'еру. Убачыўшы нас, рэстарант заўсьміхаўся: «Прывет рускай мафіі! Мяса-шашлык! Водка-сьмірноф!» Зноў, як і паўсюль, тлумачэньні. Ня рускія мы, ня рускія. Бе-ла-ру-сы. І шашлыка нам ня трэба. Лепш рульку з гароднінаю. А замест «водкі-сьмірноф» — віскі й содавую ваду.

Мой заўсёдны спадарожнік, брат Міраслаў, піў віскі, а я — апэльсынавы сок. Гаспадар рэстарацыі прастаяў над намі ўсю вячэру. Ён распавядаў пра жахлівых бандытаў, што вядуцца ў Старым горадзе. Бандыты прапаноўваюць выпіць на дармаўшчыну. Атручваюць наіўных гасьцей Варшавы моцнымі транквілізатарамі й абіраюць да ніткі. Наогул, піць зь незнаёмымі людзьмі ў чужым горадзе нельга. Варшава параўноўвалася з Масквою, а Старое Места з Арбатам. Мы засьмяяліся. Гаспадар рэстарацыі сумеўся. І сапраўды перагнуў. Раней так і было. Як толькі адкрылася мяжа з СССР, Варшаўскія вуліцы запоўніліся расейскімі бандзюганамі. Толькі ў Польшчы яны не затрымаліся надоўга, зьехалі далей: у Нямеччыну й Злучаныя Штаты. З гэтым нельга не пагадзіцца. На разьвітаньне рэстаратар пахваліў нас за польскую мову, заўважыўшы, што мы гаворым, як дзеці — няправільна. Але шчыра. Добрыя «чаявыя» ўсьцешылі сытую душу гаспадара чырвона-белай рэстарацыі. Але на сподзе хітрых вочак была шкадоба, што мы не расейцы й не было шашлыка з гарэлкаю, песень і скокаў у прысядку.

Пасьля грунтоўнага абеду трэба гуляць і гуляць доўга. А каб не было цяжка, варта думаць пра легкаважкае... Ці можа быць нешта больш легкаважкае за шум, што хутка сплывае ад невялікага вадаспаду? Хіба — адбітак высокай аблачынкі ў невялікім паркавым ставу. Легкаважкасьць жукоў-вадамераў заўсёды прымушала спыніцца й паназіраць за шаўковым сноўданьнем танклявагіх жамярынаў па паверхні рачное бухты. Легкаважкасьць людзей, і сябе ў тым ліку, я адчуў у самалёце... А дзе ж яшчэ? У космасе пакуль што не давялося пабываць. Сонца заходзіла, ілюмінатары залівала трывожна-чырвонае змрачнаватае сьвятло. У салёне гарэлі мярцьвяна-блакітныя лямпы. Я прайшоў у хвост, выпаліць цыгарэту. Нехта спаў, нехта рахункаваў думкі на кампутары, нехта піў віскі... Самалёт праваліўся ў неглыбокую яміну. Пэўна, я адзін і заўважыў кароткае падзеньне. Смутак агарнуў душу. Безнадзейны сум. Такая недарэчнасьць і выпадковасьць маёй прысутнасьці ў гэтым сьвеце адкрылася, такая легкаважкасьць, што я нават паліць ня стаў і вярнуў цыгарэту ў пачак.

У Варшаве курыцца добра. Ходзіш сабе па вуліцах і паліш. Шпацыруеш па Маршалкоўскай, па Хмельнай, па Ерусалімскай, па Яснай і робіцца крыўдна за Радзіму, за беларусаў, за Менск, за самога сябе. Побач Эўропа, акуратнасьць, чысьціня, пабытовыя пэрспэктывы. А дома — цемрашальства, татальная недабудаванасьць, экзальтаванае палітыканства, нясьмеласьць у думках і няпэўнасьць у дзеяньнях. Дзіўнаватай, але зразумелай падаецца скарга шафёра-таксоўшчыка на немцаў. Лысаваты, са сьветлымі вачыма агента таемнай паліцыі аўстра-вугорскай імпэрыі, у крыху пакамечанай адзежы пан таксоўшчык немцаў ня любіць, але ім зайздросьціць. Ён ня любіць немцаў, якія купляюць паўночна-заходнія землі й паціху акупоўваюць Польшчу. Праз гадоў пяць-дзесяць большасьць палякаў стане нямецкімі рабамі, як было ў гісторыі неаднойчы. Таму трэба як мага хутчэй зьмяніць прэзыдэнта і ўрад, і папрымаць законы, што забароняць чужынцам уладарыць на польскіх землях. У немцаў такія законы ёсьць. Сястра дваццаць пяць гадоў адпрацавала ў Нямеччыне і толькі апошнія два гады жыве добра, адчыніла ўласную стаматалягічную клініку ў Бэрліне. Хай і немец дваццаць гадоў папрацуе на паляка. Таксоўшчык ганарыцца сваякамі ў Амэрыцы, што жывуць лепш, як тыя немцы. І не ўпускае моманту, каб не нагадаць пра пакуты палякаў, высланых у Сібір зь Беларусі за сталінскім панаваньнем.

Маўчым. Слухаем. Старэйшых перарываць няёмка. Дый нашто? Каб распавесьці пра гвалт і рэпрэсіі, пра зьдзек з усяго беларускага, які дзеецца на Радзіме. Каму гэта цікава ў Польшчы, ці дзе далей? З такім настроем нельга напівацца, можна патрапіць у суіцыдную пастку. Трэба зноў стаць пад душ. Нацерціся, намыліцца, намазацца шампунем, гелем, мылам і змыць разам з потам і брудам самагубны настрой. У першыя дні за мяжой я проста не вылажу з лазенкі. Пахаджу, пагуляю і ў ванную, і пад душ. І за моду ўзяў: галіцца два разы на дзень, з раніцы і зь вечара перад вячэрай. Паголіься, напарфумісься і гуляй сабе ад касьцёла да касьцёла. Готыка. Барока. Клясыцызм. Мадэрн. Палякі любяць касьцёлы. Большай банальнасьці ня скажаш, але яны сапраўды вераць у Збавіцеля, у Касьцёл, у Польшчу, у тую старую рамантычную вялікую Польшчу XVII стагодзьдзя.

Беларусы ў Беларусь ня вераць, яны і ў Царкву ня вераць і Ісуса Хрыста не шануюць. Беларусы — індывідуалісты: мой кут, мая хата, мой надзел, мая сям'я, мае дзяды. Беларусы адзіная нацыя ў Эўропе, якая паганскія сьвяты адзначае на дзяржаўным узроўні. Дзяды, Радуніца й Купальле. Апошняе, праўда, яшчэ не пазначана чырвонай лічбаю ў календары, але ўсё йдзе ў паганскім накірунку. І хай сабе йдзе. Я, між іншым, ня супраць, як сапраўдны беларус — ня «за», ня «супраць», а ня супраць. А таму, замест таго, каб рабіць патрэбнае, добрае, вечнае, буду разважаць пра непатрэбнае. Рабі непатрэбнае... Заклікаў мяне настаўнік філязофіі. Вывучай ідыш, мову беларускіх габрэяў, і не спадзявайся, што габрэі, якія гавораць на іўрыце й паангельску, вывучаць беларускія словы й дапамогуць беларускай культуры. Малюй, калі сябры павыкідалі пэндзлі, бо сягоньня не заробіш жывапісам. Пішы нататкі для сябе й ня думай пра іншых — зразумеюць, не зразумеюць. Вандруй... Я слухаў настаўніка. Помню парады. Але так і ня вывучыў ідыш. Малюю рэдка. Адно, люблю непатрэбныя нататкі ў сшытак пісаць. Рацыянальнасьць, пасьлядоўнасьць, зададзенасьць раздражняюць. І вандраваць яшчэ маю магчымасьць. Вось я ў Варшаве, над якой устаў маладзенькі месяц. Са сваім месяцам у

Стэн Стэнсэн Бліхэр

Вечарына ў

Усім вядома, што са старажытных часоў у Дагб'ерг Дос жыла, — і здаецца, жыве яшчэ, — адна вельмі паважаная сям'я горцаў, пра якіх не вядома нічога кепскага па-за тым, што час ад часу яны бяруць у абмен у суседзяў няхрышчанае дзіця. Зь якой мэтай можа ладзіцца такі абмен, я не магу сказаць ясна, магчыма, каб палепшыць пароду паводле мэтаду, які ангельцы называюць «breeding out»[1]. «Абмен — гэта падман», — кажа прымаўка; і нічыйны падкідыш, якога ў абмен аддае селянін, відавочна пакажа, на чыім баку выйгрыш. Дык вось: аднойчы летнім вечарам мой шлях пралёг праз той самы Дос. Стомлены і змораны, я прысеў непадалёк ад вершаліны гары і невядома як заснуў. Як доўга я спаў, я ня ведаю; але ведаю, што быў абуджаны падзеяй, якая не сустракаецца нам штодня.

Вершаліна гары паволька прыўзьнялася ў паветры і ператварылася ў верасовы шацёр, які трымалі шэсьць вогненна чырвоных слупоў. Унізе ўзьнік стол, як падалося мне, з парыскага мармуру, і малыя жвавыя хлапцы накрылі яго наколькі хутка, настолькі й густоўна ды раскошна: сасуды і талеркі былі з чыстага золата; нажы і відэльцы са срэбра, ручкі інкруставаныя дыямэнтамі; крышталёвыя пляшкі і чаркі стаялі каля кожнай сурвэткі, кветкавы кош быў поўны рубінавых ружаў, сапфірных фіялак і гэтак далей, — усё гэта рабіла ўбраньне шыкоўным, наколькі можна было ўявіць. Потым выйшлі, — пад увэртуру Расіні ў выкананьні катоў, соваў, конікаў, цвыркуноў, сарок і саковак, — нехта ў цыліндры з дамай; як я пазьней даведаўся, гэта былі гаспадар і гаспадыня. Іхны выгляд і строі так уразілі мяне, што я магу прапанаваць вельмі грунтоўнае і дакладнае іх апісаньне: ён быў малы, прывабны мужчына з высокімі грудзьмі, моцна зашнураванымі амаль да таўшчыні аглабня. Ягоныя порткі былі незвычайна прасторныя, а капялюш такі шырокі, што пакрываў сабой яго самога і ягоную малую жонку. Тая была таксама апранутая паводле апошняй моды ў сукенку з глыбокім выразам, так што лёгка можна было зазірнуць ёй між аголеных лапатак — але: honny soit qui mal y pense![2] Да такога мы ўжо даўно прызвычаіліся. — Яе валасы, пальцы і рукі былі, — гэта было добра бачна, — пакрытыя самымі бліскучымі ўпрыгожаньнямі, пярсьцёнкамі і бранзалетамі, а на шырокіх клубах гойдаліся цяжкія залатыя гадзіньнікі. Тонкасьць сйнага стану мабыць пераўзыходзіла стан ейнага мужа; таму што сапраўды ня скажаш інакш, бо яна складалася зь дзьвюх розных палавінак, але, на дзіва, не распадалася: акрэм таго абое мелі чаравікі на высокіх абцасах, якія рабілі раўнавагу яшчэ больш ненадзейнай. З гэтага кароткага апісаньня бачна, што людзі пад зямлёй ды й на зямлі дасканала насьледуюць узоры высокай парыскай моды цяпер, як і ў часы Гольбэрга. Пасьля першай пары ішлі наступныя ў такіх жа строях, і ўсе занялі месцы ля стала ў тонка апрацаваных крэслах са сланавіны.

Зразумела, што за гэтай вячэрай усіх чакала адмысловае мэню: і я маю гонар яго выкласьці для маіх прыгожых чытачак, хаця сам і ня мог паўдзельнічаць у асалодзе. Дзякуючы шчырым клопатам гаспадыні аб гасьцях і яе бесьперапыннаму дагляду за імі я хутка пазнаёміўся з імёнамі і тытуламі прысутных. «Калі ласка, — гучала час ад часу, — пане фон Рамэб'ерг! Яшчэ адну маленькую яшчарку! Пані фон Эльмандсб'ерг! Вы зусім не пакаштавалі гэтага рагу з вухавёрткі! Пане горны дарадчык фон Ельшёй! Вам не смакуе ежа? Яшчэ парачку павучкоў пад соўсам з расы! Панеика фон Хёгхёй! Што Вы саромецеся; ці магу я Вам падкласьці трошкі мышынага фрыкасэ? Пане тайны дарадчык фон Баўнхёй! Стравы перад Вамі — вазьміце кавалачак гадзюкі! Пане фон Блёксб'ерг! Вы прыехалі здалёк — яшчэ аднаго кажана, а то Вы ўстанеце ад стала галодным!» — клапацілася гаспадыня, каб талеркі апусьцелі. Тады гаспадар прыступіў да пляшак з такой жа пахвальнай увагай: ягоны ўласны кілішак быў у сталым руху, то на адным баку, то на другім, са словамі: «Шаноўны панс, ці магу я выпіць з Вамі?»

Стэн Стэнсэр Бліхэр (1782-1848), дацкі пісьменьнік і паэт. Аўтар паэтычнага зборніка «Пералётныя птушкі», многіх навэлаў, выдаваў газэту «Nordlyset» («Паўночнае зьзяньне»).

чужым горадзе спакайней.

У жыцьці зь месяцам спакайней, а ў бульварных фільмах выява поўні мяне раздражняе, як і кадры з самалётам, які адрываецца ад узьлётнае паласы. Але сьвет такі, што даводзіцца больш лётаць, чым езьдзіць. У самалёце «Варшава — Менск» побач з намі селі два дыпляматы. Ангелец, сухі як ліст, што праляжаў у кнізе гадоў са дзьвесьце, у сінім афіцыйным строі, у залатых акулярчыках на ружаватым носе, які сьведчыў пра абавязковыя штодзённыя фуршэты. Амэрыканец, сінявокі, як сіямскі кот, і разам з гэтым бясспрэчны габрэй, які толькі што выйшаў зь менскай цырульні «Чарадзей» і не абмінуў у ёй касмэтычны кабінэт. Усю паветраную дарогу ангелец скардзіўся амэрыканцу, які ляцеў у Менск першы раз. Ангелец гаварыў, што за ім сочыць КГБ, што ў Менску няма ніводнай прыстойнай ангельскай школы, таму дзеці ходзяць у францускую, што ў яго ўвесь час узьнікаюць праблемы з паліцыянтамі... Зьдзівіў. У каго ў Менску не ўзьнікаюць праблемы зь міліцыянтамі. Нават, будучы першы прэзыдэнт Беларусі біўся й зрываў пагоны з ахоўнікаў беларускага парадку. Танкагубы рот ангельца не закрыўся ні на хвіліну... У Менску кепска ўсё. Вада. Людзі. Палітыка. Эканоміка. Прэзыдэнт. Апазыцыя. Прадукты. Усё. Усё чыста. А што ў іх ёсьць добрае? — пацікавіўся амэрыканец. Лясы й паркі, толькі туды не хаджу, баюся бандытаў. Вось так амэрыканец з ангельцам усю дарогу прагавораць пра Беларусь. Амэрыканец будзе шчыра зьдзіўляцца, што беларусы ня любяць Амэрыку. Чаго дзівіцца? Я таксама Амэрыку не люблю? А што, амэрыканцы з ЗША любяць Беларусь? Так, як і беларусы Амэрыку. Беларусы, я ўжо казаў, ніякіх краінаў ня любяць, нават сваю рэспубліку недалюбваюць і не шануюць.

Можа з-за гэтай беларускай нелюбові я, прыяжджаючы ў іншую краіну, заўсёды думаю пра эміграцыю. Натуральна. Хаджу й разважаю: застацца, не застацца. Так у кожным беларускім мястэчку выглядаю-прыглядаю месца, дзе можна было б паставіць мой дом. Так на менскіх вуліцах я вышукваю найзручнейшыя для жытла кватэры. Натура такая, шукаць лепшае. І ў Варшаве думалася пра эміграцыю. У Варшаве я змог бы жыць. Няма ў ёй непераадольнага моўнага бар'еру, як у Бангкоку, ці дыстанцыяваных адносінаў, як у Барсэлёне. Калі мне й выпадзе жыць у эміграцыі, дык Варшава найлепшае з бачанага месца, як Вільня і Беласток. Што рабіў бы ў Варшаве? Вывучыў бы ідыш, маляваў і прадаваў бы карціны ў шматлікіх салёнах і галерэях, рэстаўраваў бы абразы ў цэрквах на Беласточчыне. Не сумаваў бы, дакладна. Адно сумна, краіну эміграцыі, як і Радзіму, не выбіраюць. Выбраць можна краіну для вандраваньняў, і ў Варшаву я яшчэ зьежджу не адзін раз.

Варшава. Травень, 1997

Дагб'ерг Дос

— Што тычылася размовы, то яна была вельмі жвавай; але з тае прычыны, што ўсе гаманілі разам, мне было цяжка ўхапіць што-небудзь зьвязанае. Я толькі пачуў, што два старыя горныя дарадчыкі горача спрачаліся пра туркаў і грэкаў; што малады кавалер размаўляў са сваёй дамай пра новы вадэвіль наколькі энтузіястычна, настолькі ж і зь веданьнем мастацтва; што пара жанчын сярэдняга веку перамывала косткі адсутным, і што адзін малады чалавек шаптаў нешта пяшчотнае паненцы ў доме — у гары, хацеў я сказаць. Тая паненка, — beileufig gesagt[3], — была, аднак, зусім файная дзяўчына, і я б вельмі памыліўся, калі б яна не была абмененая або адаптаваная дачка наземнага сьвету. Тое, што яна атрымала тут, на доле, добрае выхаваньне, я пачуў ад ейнай маці, якая напрыканцы вячэры, калі талеркі апусьцелі, вельмі хваліла яе за ейнага кавалера, маладога пана фон Блёксб'ерга. Паводле ейных выказваньняў я мог з пэўнасьцю зрабіць выснову, што паненка дасягнула дасканаласьці ва ўсіх магчымых жаночых штучках, як: прасьці золата, выплёўваць жамчужыны, плакаць дыямэнтамі. Яна была яшчэ больш дасканалай ва ўсіх цяперашніх танцах пры месяцовым сьвятле, а таксама ў сьпевах і музыцы. Але, што было найлепшым, яе розум быў таксама ж разьвіты, як яе асоба: яна размаўляла і пісала з вытанчанасьцю ня толькі на роднай мове (горскай мове); але акрэм таго яна размаўляла вельмі свабодна на мове эльфаў і мове нісаў; я ж быў абазнаны ў мове троляў, якая з тае пары, як Тор выкараніў гэтую нацыю, зьяўляецца мёртвай мовай і вядомая цяпер толькі сярод падземных навукоўцаў.

Налівай ды сьпявай! Гэта дзейнічала таксама й тут: паненка падарыла таварыству, — пасьля звычайных угавораў і папіханьняў, — песьню нявесты паляўнічага «Мы зьвяжам цябе...» Я пазнаў мэлёдыю; а словы зразумець было немагчыма, настолькі адмыслова яна сьпявала! Я ўспрыняў толькі прыпеў, калі ўсе падхапілі яго, а тоўсты горац, — што сядзеў найбліжэй да мяне, — зароў на ўсё горла, як бык, перакрыкваючы іншых. Песьня была, аднак, трохі варыяваная, — можа хутчэй паводле мясцовасьці гэтых горцаў; таму што я ясна чуў, як ён сьпяваў: «Прыгожыя, зялёныя дзявочыя грудзі! Вусны, як блакітныя фіялкі!» (Ці выйграла песьня ад гэтай зьмены, я не бяруся меркаваць, а пакіну гэта на меркаваньне пана рэцэнзэнта, які ex professo[4] разумеецца на падобным і, урэшце, ведае пра ўсё). Потым мы выслухалі «Караля эрляў» Гётэ ў выглядзе дуэту паненкі фон Дагб'ерг і памянёнага моцнага басыста, пасьля чаго апошні прамовіў слова ў гонар паэта, якое ўсе завяршылі трохразовым «Ура». Калі пад добры настрой упершыню даходзіць чарга да «Ура!», гэта значыць, што пачынае дамінаваць над усім сіла Вакха, на шкоду Комусу, Момусу, а часам і Вэнэры. — Пахвальба Эвану цяпер тэма ўсіх вершаў: таксама й тут. Малады пан Рамб'ерг без запрашэньня засьпяваў: «Дзе айцец Эван царус». — Тайны горскі дарадчык адразу падхапіў: «Там кожны моцны і вольны», што адначасна яны сьпявалі на дзьве розныя мэлёдыі. Весялосьць дасягнула такога ўзроўню, што адначасна сьпяваліся розныя радкі ды яшчэ так, што кожны сьпявак вытрымліваў свой тэмп. Побач выпрастаўся адзін з гасьцей, матляючы сваім кілішкам, мімаволі пацалаваў дамскі настольнік і зацягнуў чароўную канцоўку: «А цяпер за здароўе гаспадыні, ура!» Ахоплены і апанаваны пачуцьцем сымпатыі і зусім забыўшы пра час і месца, я з задавальненьнем падхапіў: «і сорам таму, хто ня...» — Але ж як толькі я на вялікую нечаканасьць для таварыства падаў свой зямны голас, шацёр і стол, і госьці з жудасным грукатам праваліліся ў гару; а пасьля кароткага глухога булькаценьня ў яе нетрах навокал сталася так ціха і пустэльна, як у царкве апоўначы. Я ня буду пярэчыць, што мне зрабілася трошкі unheimlich[5], — як кажуць немцы. Таму я пасьпяшаўся спусьціцца з гары, не без раздражненьня з таго, што сваім несвоечасовым умяшаньнем парушыў радасьць таварыства, а сабе самому скараціў такую ўдалую магчымасьць пашырыць свае падземныя веды.

Пераклаў з дацкай Валеры Буйвал

[1]вывядзеньне (анг.)
[2]ганьба таму, хто кепска пра гэта падумае (франц.).
[3]дарэчы кажучы (ням.).
[4]прафэсійна (лат.)
[5]няёмка (ням.).

Адам Загаеўскі

Вершы розных гадоў

ЯК ВЫГЛЯДАЕ ЧАЛАВЕК ЯКІ МАЕ РАЦЫЮ

Як выглядае чалавек які мае рацыю
які гальштук гэты чалавек носіць
ці гаворыць адразу сказамі
ці носіць старую вопратку
ці выйшаў з мора крыві ці выйшаў
ён з забыцьця ці на строі ягоным
засталіся сьляды пякучае солі
зь якой эпохі гэты чалавек
ці твар ягоны зямлістага колеру
ці плача ў сьне і што яму сьніцца
ці заўжды ўсё той самы пакой
з выбітым сэрцам сьцяны ці гаворыць
сам з сабою ці арэндуе цела
старога чалавека і якім неспакоем
плаціць за гэтую клетку ці выгнаньнік
ён зь нейкага места ці гэта цікаўнасьць
так гоніць яго ці аплачана гэта
хто адкажа за гэта адкуль тая пляма
на ягоным плашчы хто за сьпінай ягонай
ці б давёў ён таму што ўсё гэта залежыць
ад таго як на гэта глядзець
невядома як ёсьць насамрэч
падумай ці зможаш пазнаць ты яго
калі ён пераходзіць вуліцу
згорблены пад цяжарам мозгу

ФІЛЁЗАФУ

Перастаньце нас ашукваць філёзафы
праца ня радасьць чалавек не галоўная мэта
праца крывавы пот Божа калі я ўжо дома
я хацела б паспаць але функцыя сну трансьмісійная
перадаць мяне наступнаму дню і сонца манэта фальшывая
разьдзірае мне ранкам павекі зрослыя як перад
нараджэньнем мае рукі гэта два гастарбайтары й нат
сьлёзы ўжо не мае жывуць грамадзкім жыцьцём
як прамоўцы з засохлымі вуснамі й сэрцам якое
зраслося з мозгам
Праца ня радасьць хутчэй невылечны боль
хвароба адкрытага сумленьня як новае селішча
празь якое ў высокіх скураных ботах
праходзіць жыхар вецер
Невялічкая песенька пра цэнзуру
Ты, цэнзура, увогуле не такая й страшная
Не казэматы, ня кроплі салёнай вады,
Што зьбягаюць па цёмных каменных сьценах,
Ты ня сьвіст бізуна, не крывавы праклён,
Толькі сонца ў фіранках ды зь ясеню столік,
Весела сьвішча імбрык, водар дамовае кавы
Гуляе ў пакоі і чутны высокі
Потны голас сытай служанкі
Якая трымае звычайныя скальпэлі

ВЕРШЫ ПРА ПОЛЬШЧУ

Я чытаю вершы пра Польшчу, напісаныя
замежнымі аўтарамі. Немцы й расейцы
маюць ня толькі стрэльбы, але й
атрамант, пёры, крыху сэрца й багата
ўяўленьняў, Польшча ў іхных вершах
нагадвае нахабнага адзінарога,
які корміцца воўнаю габэленаў, яна
пекная, слабая й неразважная. Я ня ведаю,
у чым аптычны падман,
але й я, цьвярозы чытач,
захапляюся казачным, безабаронным краем,
якім жывяцца чорныя арлы й галодныя
імпэратары, Трэці Райх і Трэці Рым.

ГЭТА

Тое, што так абцяжвае
і штурхае ў бездань,
тое, што баліць, як боль,
і гарыць, як шчака,
гэта можа быць камень
ці якар.
Шукаючы меры
Шукаючы меры ў мяккай, як хлеб,
імпэрыі, у цёмным жываце рыбы,
дзе ты плаваеш няўмела, як
касманаўт, шукаючы меры там, дзе
кружыць самотны сумны ястраб, судзьдзя
з малой галавой і моцнай дзюбаю
зь сьвінцу, шукаючы меры ў халодным
цені часоў надыходзячых, на
прыступках, выбітых у граніце
і зарослых травою, шукаючы
меры, можна яе ствараць.

ЁН ПІША

Ён піша халодныя вершы. Ён
піша сьнегам, а не крывёю.
Ня ведае ён дасканаласьці
і ня знае, што нават вечнасьць
складаюць душа й цела,
абсалютна таксама, як нас,
прычым душа яго — гэта
цела вечнасьці, ну а верш
захоўваецца, як дух. Няхай
плача, пакуль не замерзнуць сьлёзы.

ЗДРАДА

Найбольшая радасьць, як прадчуваю,
тоіцца ва ўрачыстым акце здрады,
і толькі вернасьць можа зь ёй зраўнацца.
Здрадзіць жанчыне, сябру, ідэі,
убачыць новае сьвятло ў вачох
старых ценяў. Але ж так мала
магчымасьцяў: іншыя жанчыны, іншыя
ідэі, незычліўцы маіх
верных сяброў. Каб
патрапіць на цалкам іншую іншасьць,
спыніцца ў краіне, якая ня мае
назову, узяць жанчыну, якая
шчэ не нарадзілася, страціць памяць, сустрэць
Бога другога, ня нашага.

ШЫПЫ

Калі б яшчэ дыктатары пажадалі
чытаць нашы гнеўныя вершы, злыя й
старанна апрацаваныя вершы, паэзія б,
відаць, зьмяніла сьвет. Але
ружы таксама ня ведаюць твораў, прысьвечаных
ім. Шыпы ня п'юць крыві.

ВІШНІ, ЧАРЭШНІ

(Ва ўспамінах пра апошнія дні жыцьця Франца Кафкі і Вітальда Гамбровіча паўтараецца адна дэталь — садавіна, якую прасілі)

Чарэшні ня ведаюць, хто іх прысылае.
Цёмныя вішні, мяккія, тояць у сабе
костачку, якая нагадвае, што граніца рэчаў
можа час ад часу быць у іхным сэрцы.
Яны — суцяшэньне для паміраючых паэтаў.
Багі сьмерці ведаюць літасьць,
хоць ім нельга вымаўляць словы зарана.
Шлюць яны толькі круглыя, пурпуровыя ягады,
як лісты, скручаныя й поўныя соку,
замест пісьма.

Пераклад з польскай Вольгі Караткевіч

Адам Загаеўскі нарадзіўся ў 1945 годзе ў Львове, дзяцінства правёў у польскіх Глівіцах, вывучаў філязофію ў Кракаве, дзе й жыў да студзеня 1982 году. Цяпер жыве пад Парыжам, штогод праводзіць некалькі месяцаў у ЗША і выкладае ў межах праграмы стваральнага пісьменства ў Х'юстанскім унівэрсытэце (Тэхас).



Адам Загаеўскі — ляўрэат шматлікіх прэстыжных міжнародных прэміяў, адзін з найчасьцей перакладаных сучасных польскіх аўтараў. Ягоныя вершы і эсэ публікаваліся, між іншага, у Злучаных Штатах, Францыі, Нямеччыне, Швэцыі. Загаеўскі — чалец рэдакцыі «Zeszytów Literackich». Прадстаўленыя ніжэй паводле храналёгіі вершы — з кнігаў розных гадоў.

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДЗЬДЗЯ



Менск, 3 ліпеня 1944 году. (? – 1953) Палатно, алей, 275х527, НММ Беларусі.

ВОЛКАЎ. МЕНСК, 3 ЛІПЕНЯ 1944 г.

... Мастацтва часоў сталіншчыны ў СССР, пры шматлікіх пунктах вонкавага супадзеньня з мастацтвам нацысцкае Нямеччыны, мае іншую прыроду. Ягоныя крыніцы: канон, запазычаныя з праваслаўнага мастацтва, расейскі акадэмічны рэалізм, які меў мала агульнага з буржуазным салёнам, ксенафобія, усярэднены савецкі нацыяналізм ста народаў. Тое, што сапраўды лучыць мастацтва Нямеччыны і СССР — гэта адчуваньне фізычнае пагрозы, безь якое немагчымае разуменьне культуры 30-50-х гадоў. Сакавіты натуралізм прыхоўваў эфэмэрнасьць рэальнасьці, у якой чалавечае жыцьцё мела мізэрны кошт. Маскоўскі мэтрапалітэн — квінтэсэнцыя расейскага таталітарызму: палацы пад зямлёю, ідэальнае жыцьцё па-за жыцьцём на зямлі...

... Генэзыс мастацтва таталітарызму 30-50-х гадоў у Беларусі найярчэй увасобіўся ў біяграфіі аднаго мастака, які сваім існаваньнем злучыў вялікія эпохі, які прыехаў у Беларусь на досьвітку яе новае дзяржаўнасьці, а памёр старэйшым беларускім мастаком...

У 1919 годзе мастак Валянцін Волкаў, які ўжо даўно практыкаваў, прыязджае ў Вяліж, мястэчка, у беларускасьці якога тады ніхто не сумняваўся.

... Вяліж (колішняе Віцебскае губэрні) займае ў гісторыі беларускага мастацтва асаблівае месца. Да 1919 году сюды зьехалася цэлая кагорта мастакоў — выхаванцаў Пецярбускае Акадэміі і колькі выпускнікоў Кіеўскае мастацкае вучэльні. Сярод іх: Керзін, Эндэ, Лебедзева, Міхалап, Жукоўскі, Хрусталёў, Пырскі ды іншыя. Зь іхнае ініцыятывы ў Вяліжы была арганізаваная народная мастацкая школа. Злучаныя на падставе ідэяў расейскіх перасоўнікаў, яны паставілі сабе на мэце несьці мастацтва «ў масы». Гэтыя мастакі стварылі асобную мэтадычную праграму свае школы — «Пралетарскае мастацтва». У Вяліжы дзеялі таксама мастацкія студыі, ганчарна-мастацкая школа, плянавалася адкрыцьцё павятовага мастацкага музэю пры школе. Гэткім чынам Вяліж, у супрацьвагу Віцебску і іншым мастацкім цэнтрам Беларусі, стаў апірышчам кансэрватызму ў навучаньні, перасоўніцкага рэалізму. Гэтая акалічнасьць, якая тлумачыцца клясычнаю выпэйшаю адукацыяй мастакоў і прыхільнага да іх правінцыйнага асяродзьдзя, стала вырашальным фактарам для ўсёй далейшай гісторыі савецкага мастацтва ў Беларусі. Вяліж стаў радзімай беларускага сацыялістычнага рэалізму...

Волкаў Валянцін (1881, г. Ялец, Расея – 1964, Менск) жывапісец, графік, пэдагог. У 1907 скончыў мастацкую вучэльню ў Пензе, у 1915 – Пецярбурскую Акадэмію. Удзельнічаў у выставах з 1903 году. Выкладаў у мастацкай школе ў Вяліжы (1919-1923), у Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1923-1929).

... Напрыканцы 1919 году ў Вяліжы адбылася значная выстава, на якой былі працы Лебедзевай, Эндэ, Міхалапа, Керзіна і Волкава. Гэтых мастакоў у 1923 годзе запрасілі ў Віцебск, каб яны ўзначалілі навучальны працэс у мастацкім тэхнікуме. У Віцебску ўжо не было ні Страмінскага, ні Малевіча, ні Шагала... У сакавіку 1924 году Віцебск вярнуўся да Беларусі...

... Віцебскі мастацкі тэхнікум апынуўся ў самым віры беларусізацыі. Інбелкульт стварыў асобную мастацкую сэкцыю, у задачу якое, паміж астатнім, уваходзіла й інтэнсіўнае зьбеларушваньне мастацкай школы. Віцебскаму мастацкаму тэхнікуму было замоўленае аздабленьне кніг беларускіх пісьменьнікаў, помнік і мэмарыяльныя знакі ў гонар Францішка Скарыны. У 1924 годзе ў конкурсе на герб і сьцяг БССР перамог ён, Валянцін Волкаў. З 130 эскізаў спыніліся на волкаўскім. Паводле яго, герб БССР уяўляў сабою паўжытнёвы-паўдубовы вянок, спавіты йстужкаю з надпісамі на чатырох мовах (беларускай, польскай, жыдоўскай, расейскай), серп з молатам, сонца, глёбус. У 1938-м таму ж Волкаву даручылі «адрэдагаваць» герб, прыбраўшы «чужыя» мовы і, немаведама чаму, дубовае лісьце. На самым першым эскізе герба мастак прапанаваў спавіць вянок бел-чырвона-белымі стужкамі...

Волкаў «беларусізаваўся» адразу па прыезьдзе ў Віцебск. У 1923 годзе ён піша палатно «Кастусь Каліноўскі», крыху пазьней стварае шэраг партрэтаў беларускіх літаратараў: Максіма Багдановіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа. Яму ж належыць афармленьне кніжак народных беларускіх казак: «Як пеўнік ратаваў курачку», «Зайчыкі», «Каваль Вярнідуб» ды шмат іншых.

Але Волкаў таму і быў Волкавым, што ягоны сьвет быў падзелены напалам. Яшчэ ў 1918 годзе ён прыладзіўся ствараць манумэнтальныя пано для сьвяточнага аздабленьня плошчаў Петраграда: «Хто ня з намі, той супраць нас», «Лепш сьмерць, чым рабства», «Трыюмф рабочага» і гэтак далей. Паралельна з «Кастусём Каліноўскім» ён піша і «Барыкады». У адзін час з партрэтам Багдановіча стварае «Партызанаў». Пасьля Купалы малюе Леніна. Усе працы роўныя паводле эмацыйнага строю. Дакладны ўпэўнены малюнак, шырокі набор клясычных жывапісных прыёмаў.

Напрыканцы 30-х Волкаў становіцца самым дзяржаўным мастаком. Дзясяткі палотнаў на ўсе савецкія тэмы, хрэстаматыйнае адлюстраваньне беларускай гісторыі, дзяржаўная сымболіка, дзясяткі кніг, тэатральных дэкарацыяў... Тое, у што ператваралася беларускае мастацтва — гэта манумэнтальны дэкаратыўны фрыз Волкава «Кастрычнік у Беларусі» для павільёну БССР на ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выставе ў Маскве. Апатэозам мастацтва Беларусі часоў сталіншчыны стала яшчэ адна праца мастака: «Выступленьне Я.М.Сьвярдлова на гістарычным пасяджаньні ЦК партыі бальшавікоў 10 кастрычніка 1917 году», напісаная ў 1940 годзе. Сталін, Ленін, Урыцкі, Дзяржынскі ўважліва (празьмерна) слухаюць таварыша Сьвярдлова. Сухі аморфны жывапіс, да драбніцаў прадуманая кампазыцыя, адпаведнасьць партыйнаму канону, утрыраваныя характарыстыкі «мудрэйшых з наймудрэйшых» правадыроў... Недзе ў гэты час Волкаў зьнямогся і ў кніжнай графіцы, якая да часу была яму прыстанішчам. Ілюстрацыі да «Дрыгвы» Коласа (можа, у тон твору літаратуры?) намаляваныя нібы балотнай тканьню, тужліва й нецікава, яны, як пісалі савецкія мастацтвазнаўцы, «даволі добра ўкампанаваныя ў тэкст». Сам Волкаў быў добра ўкампанаваны ў тэкст, дакладней, кантэкст свае эпохі. Толькі ён быў не шараговец, а калёс па-над галовамі менш удачлівых калегаў...

З пачаткам другое сусьветнае вайны лёс беларускіх мастакоў склаўся па-рознаму: хто эвакуяваўся на Ўсход, хто пайшоў на фронт, альбо ў партызаны, але многія пікуды ня краталіся. У часе нямецкае акупацыі ў Беларусі па-ранейшаму працавалі Ціхановіч, Даўгяла, Дучыц, Шыбнёў, Зьвінагродзкі ды іншыя. Застаўся ў Менску і Волкаў. І пры гэтай уладзе ён заставаўся ў фаворы. У гэты час ён піша партрэты адміністрацыі, напрыклад, камісара Менску Янэцке і ягонай жонкі. Немцам таксама лесьціў акадэмічны жывапіс старое школы.

... Цяжка сказаць дакладна, калі Волкаў пачаў пісаць сваё эпічнае палатно пра ўваход танкаў у Менск, але пэўна што да 1944 году. Дзясяткі людзей, якія паслужылі Волкаву мадэлямі, пацьвярджалі гэта. Напрыклад, дзяўчынка з кветкамі, у левым куце, пазьней стала мастачкаю і выкладала ў мастацкай вучэльні. Яна, спадарыня Глазава, распавядала і сваім вучням, што першапачаткова жаўнеры былі ў іншай форме, у нямецкай, горад ня быў такі зруйнаваны, а ў яе была сукеначка не карычневая школьная, а лілёвая аксамітная. Ну і тое, што піянэрскага галыштуку не было — то пэўна...

Мастак, якога не зачапілі бальшавікі ў рэвалюцыю, які не «прапаў» у 30-я гады, перажыў і акупацыю. Засталося таямніцаю, як палато «Менск, 3 ліпеня...», нягледзячы на тое, што любы франтавік адзначаў, што «матацыкл-то нямецкі», — ня толькі ня выклікала пытаньняў «органаў», а наадварот, было сустрэтае з прыхільнасьцю і вывешанае ў Доме ўраду.

«Менск...» Волкава маштабамі і часам, за які было створанае палатно, можна параўнаць хіба што са «Зьняўленьнем Хрыста народу» Іванава, які пісаў яго 25 гадоў. Карціна Волкава — больш за пяць мэтраў у даўжыню, фігуры людзей на першым пляне — амаль у натуральную велічыню. Дзеля стварэньня гэтае працы мастак зрабіў сотні малюнкаў, накідаў, эскізаў, якія складаюць сёньня велізарную калекцыю. Натуральна, тыя, што зробленыя пасьля 1944-га...

Задума Волкава вяртае нас у эпоху барока, у даўно забыты сьвет, дзе мастацтва «агортвала» гледача, стварала ілюзію саўдзелу зь дзеяньнем у палатне. Дзеля дасягненьня такое задачы мастак ужыў ня толькі цыкляпічны, «натуральны» маштаб, але й барочную кампазыцыйную схему: клясычны трохкутнік. «Кулісныя» трохкутнікі па краях, якія нібыта ўцягваюць гледача ў дзеяньне, і цэнтар — танк з галоўным героем танкістам, які, нібы сьвяты, лунае па-над людзкім вірам. Толькі замест крыжа ў руцэ аўтамат...

Аднак, рэлігійнае мастацтва прадугледжвае ўмоўнасьць, бязважкасьць мэтафізычнае прасторы, у якой можна кампанаваць бясконцую колькасьць пэрсанажаў, не зважаючы на патрэбу выяўляць пыл. Запыленыя пэрсанажы Волкава мусілі быць сапраўднымі. Прынцыповую немагчымасьць такой задачы мастакі зразумелі яшчэ ў мінулым стагодзьдзі. Але Волкаў і быў чалавекам зь мінулага, які, прагнучы абесьсмяроціць таталітарны рэалізм, забіў яго... Пасьля ягонае калясальнае працы ў рэчышчы гэтага стылю не было ўжо чаго сказаць. Шматкроць перапісаныя героі карціны, нібы манэкены, застылі ў няпэўным руху. А цікаўныя школьнікі, разглядаючы гэтую карцінку, не маглі даць веры што ў Менску па вайне застаўся прыгожы касьцёл са званіцаю.

Сяргей Харэўскі

"Наша Ніва"
незалежная газэта

НАША НІВА

заснаваная ў 1906,
адноўленая ў 1991

заснавальнік ..... Павал Жук
рэдактар ..... Сяргей Дубавец
выдавец ..... БГФ "Наша Ніва"
адказны сакратар ..... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ..... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ..... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
дызайн і вёрстка ..... Лявон Раманчык
набор ..... Таццяна Чуйвід
стыль і карэктура ..... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ..... Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі ..... Зьміцер Бартосік

АДРАС ДЛЯ ДАПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 213-43-52
E-mail: edit@niva.minsk.by

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 2455. 12 палос фармат А2 нумар папісаны ў друк 19[00], 28/9/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 5724s. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты "Известия", д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12